Установа адукацыі
“Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А. С. Пушкіна”

Філалагічны факультэт

Кафедра беларускага літаратуразнаўства

**А. С. КАВАЛЮК**

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX СТ.

Вучэбна-метадычны дапаможнік
для студэнтаў IV курса філалагічнага факультэта
гуманітарных і педагагагічных спецыяльнасцей
стацыянара і АЗН, факультэта замежных моў

У трох частках
Частка I

**Брэст**
**БрГУ імя А.С. Пушкіна**
**2008**

УДК82(476)(091)(075.8)
ББК 83 (4Беи)
К 12

*Рэкамендавана рэдакцыйна-выдавецкім саветам
установы адукацыі “Брэсцкі дзяржаўны універсітэт
імя А. С. Пушкіна”*

*Рэцэнзенты:*

кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай літаратуры
УА “Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я. Купалы” **Лебядзевіч Д. М.**

кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай літаратуры
УА “Мінскі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М. Танка” **Тарасава Т. М.**

**Кавалюк, А. С.**

К Гісторыя беларускай літаратуры другой паловы ХХ ст. : вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў IV курса філалагічнага факультэта гуманітарных і педагагічных спецыяльнасцей стацыянара і АЗН, факультэта замежных моў : у 3 ч. / А. С. Кавалюк; Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна, філ. ф-т, каф. беларус. літаратуразнаўства. – Брэст : Выд-ва БрДУ, 2008. – Ч. 1. – 67 с.

Вучэбна-метадычны дапаможнік уключае план-праспект аглядавых і манаграфічных лекцыйных тэм па курсу, падрабязную распрацоўку практычных заняткаў з выхадам на школьную праграму, пытанні да экзамена. Студэнтам прапанавана асноўная і дадатковая літаратура па тэмах.

Дапаможнік адрасаваны студэнтам IV курса філалагічнага факультэта гуманітарных і педагагічных спецыяльнасцей стацыянара і АЗН, факультэта замежных моў.

**УДК**
**ББК**
© Кавалюк А.С., 2008
© Выдавецтва УА “БрДУ
імя А. С. Пушкіна”, 2008

# ЗМЕСТ


Метадычныя парады …………………………………………………… 4
Літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945) ……... 5
Літаратура першага пасляваеннага дзесяцігоддзя (1945–1955) …... 8
Літаратура перыяду дэмакратычнага абнаўлення грамадства (1956–1965) …………………………………………………………… 11
Літаратура 70-х– першай паловы 80-х гадоў ……………………….. 15
Пятрусь Броўка …………………………………………………….. 19
Аркадзь Куляшоў ………………………………………………….. 23
Максім Танк ………………………………………………………... 27
Пімен Панчанка ……………………………………………………. 33
Ларыса Геніюш …………………………………………………….. 38
Янка Брыль ……………………………………………………… 40
Іван Мележ …………………………………………………………. 47
Іван Шамякін ……………………………………………………… 52
Андрэй Макаёнак ………………………………………………….. 60
Самастойная праца студэнтаў ……………………………………….. 65
Пытанні да экзамена ……………………………………………… 65

# МЕТАДЫЧНЫЯ ПАРАДЫ

Дадзены вучэбна-метадычны дапаможнік будзе садзейнічаць якаснай навукова-тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўцы студэнтаў-філолагаў у адпаведнасці з патрабаваннямі дзяржаўнага адукацыйнага стандарта.

План-праспект аглядавых і манаграфічных тэм дапаможа ўзнавіць лекцыйны матэрыял, што з'яўляецца абавязковай умовай пры падрыхтоўцы да практычных заняткаў, залікаў і экзаменаў. Асабліва карысным план-праспект будзе для самападрыхтоўкі студэнтаў АЗН.

Пры распрацоўцы пытанняў практычных заняткаў акцэнт зроблены на пераемнасць "ВНУ – школа". Усе творы па беларускай літаратуры (указаны клас, у якім вывучаюцца, дзе п.у. – павышаны ўзровень) з "Вучэбных праграм для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання з 12-гадовым тэрмінам навучання" (Мінск, 2007) павінны быць прачытаны і прааналізаваны да заняткаў з асаблівай засяроджанасцю.

Пад умоўнай назвай "Штрыхі да партрэта пісьменніка" прапануецца падабраць фрагменты з успамінаў, аўтабіяграфіі, іншых крыніц, у выніку чаго ў будучых настаўнікаў збяруцца матэрыялы для цікавага і запамінальнага знаёмства вучняў з пісьменнікам. У "вершаваным калейдаскопе" чытаюцца вершы паэта, што найбольш уразілі.

Абавязковай умовай паспяховага авалодання зместам курса з'яўляецца чытанне мастацкіх твораў. У спісах рэкамендуемай літаратуры яны пазначаны як КРЫНІЦЫ. Пры выбары твораў неабходна таксама звяртаць увагу на тое, якія з іх вынесены ў "Пытанні да экзамена".

Асноўная і дадатковая літаратура, што падаецца да кожнай тэмы, можа быць выкарыстана не толькі пры падрыхтоўцы да практычных заняткаў і экзаменаў, але і пры напісанні рэфератаў, курсавых і дыпломных прац.

З мэтай адпрацоўкі ў студэнтаў навыку напісання рэцэнзіі на твор ці збор твораў пісьменніка гэты від дзейнасці выносіцца для самастойнай працы, а ў вучэбна-метадычным дапаможніку змешчаны рэкамендацыі па яе напісанні.

Выкананне гэтых парад дазволіць студэнтам не толькі паспяхова падрыхтавацца да практычных заняткаў, залікаў і экзаменаў, але і зрабіць упэўнены крок да авалодання зместам усяго курса.

# ПЛАН-ПРАСПЕКТ КУРСА
# **“ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX СТ.”**

## ЛІТАРАТУРА ПЕРЫЯДУ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ – 2 г. лекц.

Геапалітычная праграма Гітлера, накіраваная на вынішчэнне славянскіх народаў. Ілюзіі наконт новай улады часткі беларускай творчай інтэлігенцыі. Вынікі вайны для беларускага народа. Цесная сувязь літаратуры з агульнай барацьбой народа супраць фашысцкіх акупантаў.

Пісьменнікі-франтавікі: А. Куляшоў, П. Панчанка, М. Танк, Я. Брыль, М. Лынькоў, К. Кірэенка, А. Вялюгін, М. Аўрамчык, А. Бачыла, М. Лужанін, М. Лобан, інш. Удзел беларускіх пісьменнікаў у падпольным і партызанскім руху: У. Карпаў, Р. Мурашка, В. Таўлай, А. Іверс, А. Бялевіч, А. Астрэйка і інш. Пісьменнікі, што загінулі падчас вайны (46 літаратараў Беларусі паводле кнігі “Скрыжалі памяці”, 2005): З. Астапенка, М. Сурначоў, М. Сямашка, А. Пруднікаў, А. Ушакоў, Х. Шынклер і інш.

Франтавы і партызанскі друк. Праца беларускіх пісьменнікаў у выданнях ваеннага часу: газетах “Савецкая Беларусь”, “За Савецкую Беларусь”, “За свабодную Беларусь”, “Звязда”, газетах-плакатах “Раздавім фашысцкую гадзіну”, “Партызанская дубінка”, часопісе “Беларусь” і інш. Пісьменніцкія выступленні на радыёстанцыі “Савецкая Беларусь”.

**Публіцыстыка**, яе патрыятычны, антываенны і антыфашысцкі пафас (Я. Купала, Я. Колас, К. Чорны, М. Лынькоў і інш.).

**Паэзія.** Вобраз беларускай зямлі ў патрыятычнай лірыцы. Услаўленне гераізму і змагарніцкага духу народа. Матывы балючага растання з Радзімай, свабоды і волі, гневу і помсты, расплаты і пакарання, духоўнай нязломнасці, веры ў перамогу (Я. Купала, М. Танк, П. Панчанка, П. Броўка і інш.). Сумяшчэнне розных часавых плыняў у творах, зварот у іх да гісторыі, хрысціянскіх каштоўнасцей.

Гераічнае і трагічнае ў баладах ваеннага часу А. Куляшова, П.Панчанкі, М. Танка, М. Сурначова, А. Вялюгіна, інш. Зварот да рамантычна-легендарнага і гераічнага матэрыялу, вобразаў Кастуся Каліноўскага, Усяслава Чарадзея, Рагнеды і інш. Сувязь паэзіі з традыцыямі старажытнай літаратуры (“Слова аб палку Ігаравым”, інш.), народнай песняй, плачамі і галашэннямі. Пераасэнсаванне традыцыйных фальклорных вобразаў касьбы, жніва, нівы, сяўбы і інш.

Спалучэнне публіцыстычнага і інтымна-псіхалагічнага пачаткаў у паэзіі. Выяўленне ўнутранага стану чалавека ў лірычных вершах Я. Коласа, А. Куляшова, П. Глебкі, М. Аўрамчыка, А. Моркаўкі і інш.

Канкрэтна-асабовы характар пачуццяў і перажыванняў. Элегічна-драматычны і спавядальны пафас вершаў лірычнага складу. Матывы кахання, любові і вернасці ў творах ваеннага часу.

Асноўныя матывы, пафас, сістэма сродкаў паэтычнага выяўлення і ўздзеяння на ўнутраны свет чалавека ў паэтычнай кнізе А. Астрэйкі "Слуцкі пояс" (1943). Ідэйна-тэматычная навізна цыкла вершаў П. Панчанкі "Іранскі дзённік" (1944).

Вострая сатыра, скіраваная супраць Гітлера і фашысцкіх захопнікаў (К. Крапіва, П. Глебка, П. Панчанка, інш.). Сатырычны верш, фельетон, памфлет і іншыя жанры. Зборнік фельетонаў К. Чорнага "Кат у белай манішцы" (1942). Фальклор ваеннага часу: прымаўкі, крылатыя словы, прыпеўкі, песні ("Беларускі фальклор Вялікай Айчыннай вайны", 1961; "Лясныя песні", 1970; інш.).

Беларускі **паэтычны эпас** ваеннага часу. Паказ суровай рэчаіснасці, складаных калізій, народнай бяды і гора. Раскрыццё маральна-псіхалагічнага свету чалавека. Роздум пра лёс народа і яго будучыню. Абагульнена-філасофскі характар думкі ў паэтычным эпасе. Жанравая сінтэтычнасць беларускай паэмы ваеннага часу. Спалучэнне эпасу, лірыкі і драмы. Узбагачэнне паэмнага мыслення, навізна стылёва-выяўленчых сродкаў пісьма ў паэмах А. Куляшова "Сцяг брыгады" (1942), "Прыгоды цымбал" (1944), "Дом № 24" (1944), П. Броўкі "Паэма пра Смалячкова" (1942), "Беларусь" (1943), "Ясны кут" (1944), М. Танка "Янук Сяліба" (1943), Я. Коласа "Суд у лесе" (1942), "Адплата" (1944), З. Астапенкі "Эдэм" (1944), П. Панчанкі "Маладосць у паходзе" (1945) і інш.

Тыпалогія паэтыкі ў творах часу вайны паэтаў Беларусі і славянскага свету, еўрапейскіх краін. Агульнасць поглядаў, сугучнасць матываў, трагічнае выяўленне часу і чалавека ў ваенных абставінах. Жыццесцвярджальны і гуманістычны пафас антываеннай паэзіі.

**Проза** часу Вялікай Айчыннай вайны, яе ідэйна-мастацкае абнаўленне. Запачаткаванне ваеннай тэмы ў "малых" жанравых формах (апавяданне, нарыс, навела). Зборнікі апавяданняў М. Лынькова "Астап" (1944), К. Чорнага "Вялікае сэрца" (1945), іх стылёва-выяўленчая адметнасць. Адбітак уласна ўбачанага і перажытага ў творах "Дзіцячы башмачок" М. Лынькова і "Маленькая жанчына" К. Чорнага. Драматычна-трагічны паказ вобразаў дзяцей. Майстэрства тыпізацыі, псіхалагізм лепшых апавяданняў гэтых празаікаў. Раманы "Пошукі будучыні" (1943) і "Млечны шлях" (1944) К. Чорнага як вяршыннае дасягненне беларускай мастацкай прозы часу вайны. Філасофскае асэнсаванне пісьменнікам глабальных пытанняў быцця, псіхалагічны аналітызм у даследаванні чалавека, нацыянальнага характару. Актыўная праца К. Чорнага, глыбінны гуманізм яго мыслення, наватарскі змест творчасці. Проза часу вайны

Р. Мурашкі (“Таварышы”, “Смерць маткі”, інш.), Х. Шынклера (“Пульс жыцця”, інш.). Пачатак творчасці І. Мележа, І. Шамякіна, Я. Брыля і інш. Мемуарная проза (“Першая кніга” І. Мележа, дзённік К. Чорнага і інш.).

Эстэтычная нераўнацэннасць твораў пра вайну. Спрошчанасць, аблегчанасць, схематызм у паказе падзей і канфліктаў у некаторых з іх.

**Драматургія** часу вайны, праблемы яе развіцця. Нешматлікасць драматургічных твораў. Маральна-этычныя ўзаемаадносіны герояў у п’есе “Проба агнём” (1943) К. Крапівы. Творы пра партызанскую барацьбу Я. Рамановіча “Палешукі” і “Таварыш Андрэй” (абедзве – 1944), А. Кучара “Заложнікі” (1944). П’есы беларускіх драматургаў як яскравыя мастацкія дакументы свайго часу. Дзейнасць беларускіх тэатраў у эвакуацыі.

**Літаратурны мемарыял**: зборнікі творчай спадчыны пісьменнікаў Беларусі, якія загінулі ў гады вайны, – “Мы іх не забудзем” (1949), “Крывёю сэрца” (1967), “Скрыжалі памяці” (2005).

**ЛІТАРАТУРА:** Гніламёдаў, У. Хроніка літаратурнага жыцця 1941–1945 / У. Гніламёдаў [і інш.] // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2-е выд. Мінск : Беларус. навука, 2001–2002. – Т. 3 – С. 714–744.

Лапашка, І. Матэрыялы перыяду Вялікай Айчыннай вайны ў фондах Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры / І. Лапашка // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2005. – № 4. – С. 114–118.

Пісьменнікі Беларусі-удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны ў зборы Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры : тэмат. каталог / аўт. ідэі і ўклад. В. Ціханавецкая ; уклад.: Н. Цыбульская [і інш.] – Мінск : Радыёла-плюс, 2005. – 103 с.

Тварановіч, Г. Літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны / Г. Тварановіч // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2-е выд. Мінск : Беларус. навука, 2001–2002. – Т. 3. – С. 8–41.

**ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА:** Бечык, В. Голас душы народнай. У грозны час. Усё Радзіме аддалі / В. Бечык // Выбранае : Літ.-крытыч. артыкулы / В. Бечык. – Мінск, 1989. – С. 14–91.

Да штыка прыраўняўшы пяро [Пісьмы беларускіх пісьменнікаў ваеннага часу]. – Беларусь. – 1985. – № 5. – С. 12–23.

Мищенчук, Н. О поэзии военного времени / Н. Мищенчук // Нёман. – 2004. – № 7. – С. 171–179.

Чорны, К. Беларуская проза і драматургія часу Айчыннай вайны / К. Чорны // Зб. тв. : у 6 т. – Мінск, 1990. – Т. 5 : Апавяданні, аповесці, публіцыстыка 1941–1944. – С. 271–280.

# ЛІТАРАТУРА ПАСЛЯВАЕННАГА ДЗЕСЯЦІГОДДЗЯ (1941–1955) – 2 г. лекц.

Перамога ў Вялікай Айчыннай вайне і паэтычныя водгукі на гэтую падзею М. Танка, П. Панчанкі, А. Вялюгіна, К. Кірэенкі, М. Лужаніна, інш. Веліч, драматызм і цяжкасці часу. Уключэнне пісьменнікаў у працэс мірнага жыцця. Творчая дзейнасць М. Лынькова, А. Куляшова, М. Танка, П. Панчанкі, П. Броўкі і іншых пісьменнікаў, вядомых яшчэ з даваеннага часу. Станаўленне ў пасляваенны час творчых індывідуальнасцей І. Мележа, І. Шамякіна, Я. Брыля, А. Кулакоўскага, А. Чарнышэвіча, А. Макаёнка, М. Лупсякова, А. Вялюгіна, А. Русецкага, М. Аўрамчыка і інш. Прыход у літаратуру маладых паэтаў А. Пысіна, С. Гаўрусёва, П. Макаля, Н. Гілевіча.

Літаратура і ідэалогія. Пастановы ЦК ВКП(б) “Аб часопісах “Звязда” і “Ленинград” (1946), “Аб рэпертуары драматычных тэатраў і мерах па яго паляпшэнні” (1946) і інш. Пастанова ЦК КП(б)Б (1947) аб рабоце Саюза пісьменнікаў, літаратурна-мастацкіх часопісаў і газеты “Літаратура і мастацтва”. Узмацненне савецкай палітычнай цэнзуры, новыя праявы культу асобы. Сацыялістычны рэалізм і яго ўздзеянне на развіццё тагачаснай літаратуры. Адбітак тэорыі бесканфліктнасці на творчай практыцы пісьменнікаў.

Вядучае месца ваеннай тэмы ў літаратуры гэтага перыяду. Палітычная кан’юктура ў ацэнцы гістарычных падзей Вялікай Айчыннай вайны. Заслуга пісьменнікаў у стварэнні больш аб’ектыўнай карціны ваеннага мінулага.

**Паэзія.** Уплыў грамадскай атмасферы на паэзію гэтага часу. Высокая ўзнёсласць і ўрачыстасць прамаўлення як выяўленне агульнага грамадскага настрою. Матывы радасці перамогі і ўслаўлення стваральнай працы. Паэтызацыя гераічнага подзвігу народаў у гады вайны. Ідэйна-эстэтычны змест зборнікаў М. Танка “Каб ведалі” (1948), “На камні, жалезе і золаце” (1951), “У дарозе” (1954), А. Куляшова “Камуністы” (1949), П. Панчанкі “Прысяга” (1949), “За шчасце, за мір!” (1950), “Шырокі свет” (1955), П. Броўкі “У роднай хаце” (1946), “Сонечнымі днямі” (1950), “Цвёрдымі крокамі” (1954), А. Вялюгіна “Салют у Мінску” (1947), “Негарэльская арка” (1949), ”На подступах” (1952), К. Кірэенкі “Пасля навальніцы” (1947), “Мая рэспубліка” (1949), “Маякі” (1952), інш. Чалавек, час, эпоха ў гэтых кнігах. Паэтычныя прамова, верш-зварот, верш-заклік. Ідэалізацыя рэчаіснасці, адбітак ідэалагічнага мыслення ў вершах на патрэбу дня. Выдаткі паэтычнай публіцыстыкі: агульшчына, рыторыка, дэкларатыўнасць, стэрэатыпнасць вобразаў. Каштоўнасць лірызму ў паглыбленні асабовага пачатку і эстэтыкі ўсёй паэзіі. Праявы

неарамантызму і імажынізму (М. Танк, А. Вялюгін і інш.). Выяўленне ўласнага жыццёвага вопыту. Лірычнае самараскрыццё, адухаўленне свету прыроды і яркая метафарычнасць у пейзажнай лірыцы. Паэтызацыя зямных каштоўнасцей (хлеб, колас, зерне, інш.), сялянскай працы. Паэтыка песеннай лірыкі А. Русака (“Лясная песня”, “Ціхі вечар”, “Толькі з табою”, інш.). Узбагачэнне вобразнага складу мыслення, мастацка-выяўленчай сістэмы ў лепшых вершах пасляваеннага часу.

**Паэмны эпас**, яго мастацкія вартасці і складанасці развіцця. Вайна і пасляваенная рэчаіснасць у тагачаснай эпіцы. Адлюстраванне народнага лёсу, жыццяпіс свайго часу, зварот да мінулага. Праўда жыцця і свет ідэальнага, віртуальнага. Сюжэтны лад і стылёвыя асаблівасці паэм М. Танка “Люцыян Таполя” (1946), П. Броўкі “Хлеб” (1946), А. Бялевіча “Сям’я” (1946), Я. Коласа “Рыбакова хата” (1947), А. Куляшова “Новае рэчышча” (1948), “Толькі ўперад” (1950), “Грозная пушча” (1952–1956), А. Зарыцкага “Аповесць пра залатое дно” (1953), інш. Жанравая разнастайнасць паэм таго часу: лірычныя, ліра-эпічныя, эпічныя. Эвалюцыя эпічнага тыпу мыслення, яго абнаўленне (кінематаграфічны прынцып мантажу, лірызм, заглыбленне сюжэтна-мастацкага драматызму, філасафізм).

**Проза.** Вайна як галоўная ідэйна-тэматычная дамінанта беларускай прозы 1945–1955 гадоў. Спроба стварэння эпапеі пра Вялікую Айчынную вайну. Панарамны, маштабны паказ ваенных падзей у раманах М. Лынькова “Векапомныя дні” (кн. 1, 1948–1951), І. Мележа “Мінскі напрамак” (1952). Батальны план, трагічныя абставіны і канфлікты ў творах пра франтавыя падзеі. Аўтабіяграфічны пачатак і яго роля ў мастацкім асэнсаванні ваеннай рэчаіснасці. Наватарскі характар аповесці І. Шамякіна “Помста” (1945). Канцэпцыя партызанскага руху як усенароднай барацьбы з фашызмам у рамане “Глыбокая плынь” (1949). Значэнне гэтага твора для далейшай распрацоўкі партызанскай тэмы ў ваеннай літаратуры. Асэнсаванне духоўнага подзвігу і трагедыі беларускага народа ў раманах М. Ткачова “Згуртаванасць” (1951), А. Кулакоўскага “Растаёмся ненадоўга” (1952–1954), І. Гурскага “У агні” (1952) і інш. Раскрыццё псіхалогіі чалавека на вайне, яго духоўна-маральнай сутнасці. Псіхалагізм ваенных апавяданняў І. Шамякіна, І. Мележа, Я. Брыля, інш.

Развіццё мастацкай дакументалістыкі і мемуарыстыкі. Кнігі В. Лівенцава “Партызанскі край” (1950), Г. Шчарбатава “Партызанскія агні” (1950), В. Казлова “Людзі асобага складу” (1952), інш. Падключэнне беларускіх пісьменнікаў да працы над мемуарамі ўдзельнікаў вайны. Пасляваенны нарыс, яго ідэйна-стылёвыя асаблівасці (“Нёманскія казакі”, “Дзеля сапраўднай радасці” Я. Брыля, інш.). Кніга “Ніколі не забудзем”

(1948). Дакументальная аснова аповесцей У. Шахаўца “Дняпроўскія хвалі” (1946), У. Карпава “Без нейтральнай паласы” (1950), інш.

Беларуская вёска ў тагачаснай прозе. Калгасная рэчаіснасць, пасляваеннае жыццё вачыма А. Кулакоўскага (апавяданне “Сад”, 1950), М. Паслядовіча (раман “Святло над Ліпскам”, 1950), І. Шамякіна (раман “У добры час”, 1952), Я. Брыля (аповесці “У Забалоцці днее”, 1950; “На Быстранцы”, 1955) і інш. Паказ сялянскай працы, паэтызацыя роднай прыроды. Выяўленне чалавечых эмоцый і настрояў. Станоўчы герой як эталон жыцця і паводзін. Згладжванне канфліктаў, лакіроўка, ілюстрацыйнасць як вынік развіцця літаратуры ў складаных грамадскіх абставінах. Раманы А. Стаховіча “Пад мірным небам” (1948), “Шырокія гарызонты” (1954), аповесці У. Краўчанкі “Станаўленне” (1947), М. Паслядовіча “Цёплае дыханне” (1948), Т. Хадкевіча “Вяснянка” (1949) у кантэксце свайго часу і з пазіцыі сучаснасці.

Паступовае пашырэнне тэматычных аспектаў і стылёва-выяўленчых магчымасцей беларускай прозы. Мастацкае ўзнаўленне жыцця і падзей у Заходняй Беларусі. Паказ народнага змагання ў рамане-хроніцы П. Пестрака “Сустрэнемся на барыкадах” (1952). Андрэй Касцевіч як псіхалагічна распрацаваны і пераканальны вобраз-тып. Заходнебеларуская рэчаіснасць ва ўспрыманні і асэнсаванні Я. Брыля. Маральна-духоўныя пошукі яго герояў (“Сірочы хлеб”, “Галя”, “У сям’і”, інш.). Экспрэсія тропаў у творах Я. Брыля. Сінтэз лірызму і філасафізму, інтэлектуальная напоўненасць трэцяй часткі “На ростанях” (1949–1954) Я. Коласа. Горад у творах І. Мележа, А. Кулакоўскага, інш. Навукова-фантастычная аповесць Я. Маўра “Фантамабіль прафесара Цылякоўскага” (1954).

**Драматургія** пасляваеннага часу, яе жанравая разнапланавасць: гераічная драма, трагедыя, псіхалагічная і гістарычная драма, лірычная і сатырычная камедыя. Найбольш значныя п’есы пра вайну А. Маўзона (“Канстанцін Заслонаў”, 1947), К. Крапівы (“З народам”, 1948), К. Губарэвіча (“Брэсцкая крэпасць”, першапачатковая назва – “Цытадэль славы”, 1952), суадносіны ў іх гераічнага і трагічнага. П’еса А. Кучара “Гэта было ў Мінску” (1950): аўтарская трактоўка падзей, недастатковая распрацаванасць канфлікту і асобных вобразаў, сюжэтна-кампазіцыйная незавершанасць.

Сатырычны пафас і праблемная скіраванасць п’есы К. Крапівы “Мілы чалавек” (1945). Ацэнка гэтага твора ў тагачаснай крытыцы. Лёс п’есы. Лірычная камедыя К. Крапівы “Пяюць жаваранкі” (1950), яе сцэнічны поспех. Гумар, фальклорная стыхія ў гэтым творы. Усведамленне аўтарам мастацкіх пралікаў у п’есе “Зацікаўленая асоба” (1953). Яго выступленні па надзённых задачах развіцця драматургіі на Пленуме Саюза пісьменнікаў (1946) і ў друку.

Прычыны мастацкіх няўдач аўтараў вытворчых п’ес, драматычных твораў пра калгасную рэчаіснасць, пасляваеннае жыццё. Бесканфліктнасць, ілюстрацыйнасць, зададзенасць у тагачасных п’есах В. Палескага, К. Губарэвіча, В. Віткі, інш.

Узнаўленне падзей і вобразаў гістарычнага мінулага ў драматычнай трылогіі М. Клімковіча “Георгій Скарына” (1946–1955), п’есе В. Вольскага “Машэка” (1946).

Прыход ў драматургічнае мастацтва А. Макаёнка, яго творчы плён у другой палове 40-х – першай палове 50-х гадоў (“Добра, калі добра канчаецца”, “Перад сустрэчай”, інш.), роля ў развіцці беларускай сатыры і нацыянальнага тэатра.

Развіццё **крытычнай і літаратуразнаўчай думкі** ў пасляваеннае дзесяцігоддзе, супярэчлівасць яе ўплыву на літаратурны працэс.

**ЛІТАРАТУРА:** Гніламёдаў, У. Хроніка літаратурнага жыцця 1945–1955 / У. Гніламёдаў [і інш.] // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2-е выд. Мінск : Беларус. навука, 2001–2002. – Т. 3. – С. 736–827.

Ляшук, В. Літаратура першага пасляваеннага дзесяцігоддзя / В. Ляшук // У дапамогу педагогу : Беларус. мова і літаратура. – 2001. – № 1. – С. 22–39.

Мушынскі, М. Літаратура першага пасляваеннага дзесяцігоддзя 1945–1955 / М. Мушынскі, А. Яскевіч. // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2-е выд. Мінск : Беларус. навука, 2001–2002. – Т. 3. – С. 42–121.

**ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА:** Данільчык, А. Асаблівасці развіцця беларускай і італьянскай ваеннай прозы 40–50-х гадоў / А. Данільчык // Весці АН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 1997. – № 3. – С. 91–99.

Локун, В. Вобразна-жанравыя асаблівасці беларускага рамана 40–пачатку 50-х гадоў у кантэксце славянскіх літаратур / В. Локун // Беларуская літаратура ў кантэксце славянскіх літаратур XIX–XX ст.ст. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; навук. рэд. У. Мархель. – Мінск, 2006. – С. 257–335.

## ЛІТАРАТУРА ПЕРЫЯДУ ДЭМАКРАТЫЧНАГА АБНАЎЛЕННЯ ГРАМАДСТВА (1956–60-я гг.) – 2 г. лекц.

Важныя перамены ў грамадска-палітычным жыцці сярэдзіны 50-х гадоў і іх значэнне для развіцця беларускай культуры. Уплыў грамадскай “адлігі” на абнаўленне мастацтва слова. Адыход літаратуры ад

ілюстрацыйнасці, ідэалагічнага схематызму, аднаўленне ў ёй аўтарытэту агульначалавечых каштоўнасцей.

Спрэчкі вакол сацыялістычнага рэалізму як адкрытай сістэмы, дзе магчымы розныя формы пісьма. Ідэйна-эстэтычныя пошукі беларускіх пісьменнікаў, іх выхад за межы патрабаванняў крытыкаў-дагматыкаў. Экзістэнцыяльнае разуменне чалавека і свету. Арыентацыя на гуманізм як асноватворны прынцып грамадскага ўладкавання. Узвышэнне ў літаратуры народных ідэалаў праўды, сумленнасці і справядлівасці. Матывы адказнасці перад гісторыяй і будучыняй, пафас сцвярджэння высокіх маральна-духоўных каштоўнасцей.

Разгортванне літаратурнага працэсу ў 60-я гады. Прыход у літаратуру новага пісьменніцкага пакалення – “філалагічнага” (І. Навуменка, В. Каваленка, А. Адамовіч, У. Калеснік, Р. Барадулін, Г. Бураўкін, В. Быкаў, У. Караткевіч, У. Дамашэвіч, І. Пташнікаў, М. Стральцоў, Я. Сіпакоў, А. Вярцінскі, П. Макаль, Н. Гілевіч, В. Зуёнак, інш.). “Шасцідзесятніцтва” як літаратурна-грамадскі рух і яго роля ў развіцці беларускай літаратуры.

Складанасці ў развіцці беларускай літаратуры канца 50-х–60-х гадоў. Праявы лакіроўкі і схематызму. Абмежаванне творчай свабоды, прадузятая ацэнка афіцыйнай крытыкай некаторых твораў А. Кулакоўскага, У. Караткевіча, В. Быкава, А. Макаёнка, інш.

**Паэзія,** эстэтычнае яе абнаўленне. Наватарская адметнасць “Новай кнігі” (1964) А. Куляшова і вершаванага зборніка “Акно” (1967) П. Макаля, іх шырокі рэзананс. Пашырэнне кола матываў, напаўненне новым зместам многіх тэм. Крытычны і сатырычны пафас, публіцыстычная завостранасць слова ў грамадзянскай паэзіі. Маральныя імператывы часу, спалучэнне асабістага і грамадскага, сацыяльнага і гуманістычнага, надзённага і вечнага.

Паглыбленне канцэпцыі чалавека, лірызм і шчырасць аўтарскіх інтанацый у паэзіі М. Танка (“След бліскавіцы”, 1957; “Мой хлеб надзённы”, 1962; “Глыток вады”, 1964), П. Броўкі (“Пахне чабор”, 1959; “А дні ідуць”, 1962), П. Панчанкі ( “Кніга вандраванняў і любові”, 1959; “Тысяча небасхілаў”, 1962; “Чатыры кантыненты”, 1964).

Арыгінальнасць светаўспрымання, псіхалагізм аўтарскага пачуцця, раскаванасць рытмікі ў тагачаснай лірычнай паэзіі. Жанрава-стылёвая дынаміка паэзіі, яе ідэйна-філасофскія пошукі і эстэтычныя адкрыцці ў кантэксце творчых дасягненняў іншых нацыянальных літаратур (М. Заблоцкі, А. Вазнясенскі, Я. Еўтушэнка, Э. Межэлайціс, Р. Гамзатаў, інш.). Актыўнае мастацкае развіццё інтымнай і пейзажнай лірыкі (П. Броўка, А. Вялюгін, Р. Барадулін).

Глыбока драматычнае гучанне ў паэзіі ваенных матываў (П. Панчанка, Н. Гілевіч, А. Пысін, А. Вярцінскі, Р. Барадулін, інш.).

Чалавек, гісторыя, культура ў паэтычных кнігах У. Караткевіча "Матчына душа" (1958), "Вячэрнія ветразі" (1960), "Мая Іліяда" (1969). Пафас узнёслай паэтызацыі мінулага, услаўлення патрыятызму, чалавечнасці і дабрыні. Рамантызацыя беларускай даўніны. Адносіны тагачаснай крытыкі да вершаў маладога паэта.

**Проза,** яе жанрава-тэматычнае і стылёвае развіццё. Аднаўленне чалавеказнаўчай сутнасці слоўнага мастацтва. Узмацненне аналітыка-даследчыцкіх магчымасцей беларускай прозы. Паглыбленне мастацка-псіхалагічнага аналізу ў творах Я. Брыля, І. Мележа, І. Шамякіна, В. Быкава, А. Кулакоўскага, В. Адамчыка, М. Стральцова і інш. Зварот празаікаў да рэальных праблем часу, жыццёвых канфліктаў.

Росквіт беларускага рамана як сведчанне маштабнасці мастацкай думкі, яе здольнасці спасцігаць глыбінныя пласты жыцця, маральна-духоўны і гістарычны вопыт народа. Хранікальна-эпічныя карціны рэчаіснасці. Шматграннасць адлюстравання жыцця ў творах І. Шамякіна "Крыніцы" (1956), "Трывожнае шчасце" (1957–1965), "Сэрца на далоні" (1963), "Снежныя зімы" (1968). Майстэрства Мележа-раманіста ў "Людзях на балоце" (1961) і "Подыху навальніцы" (1964–1965). Аналітычная глыбіня ў выяўленні псіхалогіі герояў. Гісторыя і сучаснасць у раманах У. Караткевіча "Нельга забыць" (1960–1962), "Каласы пад сярпом тваім" (1962–1964), "Хрыстос прызямліўся ў Гародні" (1965–1966). Раман Я. Брыля "Птушкі і гнёзды" (1963) як альтэрнатыва канонам сацрэалізму.

Мастацкія набыткі ў жанры аповесці (І. Шамякін, Я. Брыль, У. Караткевіч, А. Кулакоўскі, І. Пташнікаў, Б. Сачанка, інш.). Багацце мастацкай навелістыкі. Эстэтычная арыгінальнасць апавяданняў. Лірызацыя прозы, суб'ектызаваны стыль пісьма. Пашырэнне моўна-выяўленчых магчымасцей беларускай прозы. Жанр мініяцюры ў творчасці Я. Брыля (зборнікі "Жменя сонечных промняў", 1965; "Свае старонкі", 1951–1979).

Вайна і вёска як дзве вядучыя ідэйна-тэматычныя лініі ў беларускай прозе. Этапы развіцця ваеннай тэмы ў літаратуры: ад панарамнага эпасу першага пасляваеннага дзесяцігоддзя да "лейтэнанцкай" прозы 60-х гадоў, да твораў пакалення "сямідзесятнікаў", апаленага вайной. Дыскусія пра "акопную" праўду, пра рэалізм і натуралізм у савецкай і беларускай ваеннай прозе і творчасць В. Быкава ("Жураўліны крык", 1959; "Здрада", 1960; "Трэцяя ракета", 1961; "Пастка", 1962; "Альпійская балада", 1963; "Мёртвым не баліць", 1965; "Праклятая вышыня", 1968). Ацэнка быкаўскіх твораў у тагачаснай крытыцы. Лёс аповесці "Мёртвым не баліць".

Выпакутаваная праўда пра чалавека на вайне. Гераічнае і трагічнае, філасофія гуманізму. Сюжэтныя сітуацыі, характары, маральная завостранасць канфліктаў у прозе пра вайну. Узмацненне рэалістычна-псіхалагічных асноў ваеннай прозы. Адлюстраванне партызанскага і падпольнага руху, выяўленне патрыятычна-вызваленчага духу беларускага народа.

Арыгінальнае стылёвае аблічча беларускай прозы ў рэчышчы савецкай літаратуры. Дылогія А. Адамовіча “Партызаны”, раман Я. Брыля “Птушкі і гнёзды”, аповесці А. Карпюка “Данута”, “Пушчанская адысея”, кнігі апавяданняў І. Навуменкі “Семнаццатай вясной”, “Хлопцы-равеснікі”, “Верасы на выжарынах”, раман “Сасна пры дарозе”. Дакументальна-мастацкая проза І. Новікава “Руіны страляюць ва ўпор”, “Дарогі скрыжаваліся ў Мінску”.

Народнае жыццё, чалавек і зямля ў вясковай прозе І. Мележа, І. Пташнікава, В. Адамчыка, інш. Паэтызацыя душэўнага хараства вяскоўцаў, сялянскай працы, беларускай прыроды. Выяўленне глыбінь нацыянальнага менталітэту. Сацыяльныя аспекты вясковай рэчаіснасці. Катэгорыі народнай маралі як кодэкс чалавечага быцця. Народная моўная стыхія ў творах.

Роля У. Караткевіча ў развіцці гістарычнага жанру (аповесці “Дзікае паляванне караля Стаха”, 1958; “Цыганскі кароль”, 1958; “Сівая легенда”, 1960; раманы “Нельга забыць”, “Каласы пад сярпом тваім”, “Хрыстос прызямліўся ў Гародні”). Рамантычнае і рэалістычнае, сацыяльнае і агульначалавечае ў мастацкай сістэме твораў пісьменніка.

**Драматургія** і яе выхад на новы эстэтычны ўзровень. Пераадоленне негатыўнага ўплыву тэорыі бесканфліктнасці. Актуалізацыя надзённых праблем развіцця драматургіі (артыкулы К. Крапівы “Аб сатырычнай камедыі”, “Канфлікт – аснова п’есы”). Станаўленне творчай індывідуальнасці А. Макаёнка (“Каб людзі не журыліся”, 1957; “Лявоніха на арбіце”, 1961). Вострапраблемны характар п’есы “Выбачайце, калі ласка!” (1954). Узмацненне дзейнасці сатыры. Паглыбленне канфліктнага дзеяння.

Праблемна-тэматычныя і жанравыя абсягі драматургіі другой паловы 50-х–60-х гадоў. Драматызм падзей, праўда пра лёс чалавека на вайне ў п’есах К. Крапівы, К. Губарэвіча, А. Маўзона, інш. Гісторыка-рэвалюцыйная і грамадска-палітычная тэматыка ў драматургічнай творчасці: феномен часу, тыпалогія, асаблівасці (К. Губарэвіч, А. Маўзон, П. Васілеўскі, Я. Рамановіч, інш.). Сямейна-бытавая драма і бытавая камедыя. Маральна-этычная праблемы ў п’есах І. Мележа “Пакуль вы маладыя” (1957), А. Дзялендзіка “Выклік багам” (1965), “Грэшная любоў”

(1967), А. Макаёнка “Зацюканы апостал” (1969) і інш. Развіццё беларускай камедыяграфіі (А. Макаёнак, І. Шамякін, І. Козел, А. Дзялендзік, інш.).

**Творы для дзяцей** гэтага часу Я. Бяганскай, Г. Васілеўскай, В. Віткі, У. Дубоўкі, А. Пальчэўскага, інш.

Поспехі **беларускай крытыкі і літаратуразнаўства**. Працяг традыцыі пісьменніцкай крытыкі аўтарамі-“шасцідзесятнікамі”.

Значнасць перыяду другой паловы 50-х–60-х гадоў у гісторыі беларускай літаратуры.

**ЛІТАРАТУРА:** Арочка, М. Літаратура перыяду дэмакратычнага абнаўлення грамадства 1956–1965 / М. Арочка [і інш.] // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2-е выд. Мінск : Беларус. навука, 2001–2002. – Т. 3. – С. 122–201.

Гніламёдаў, У. Хроніка літаратурнага жыцця 1956–1965 / У. Гніламёдаў [і інш.] // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2-е выд. Мінск : Беларус. навука, 2001–2002. – Т. 3. – С. 828–939.

Серыя артыкулаў пра “філалагічнае пакаленне” / С. Андраюк [і інш.] // Крыніца. – 2001. – № 11–12.

**ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА:** Андраюк, С. Вялікая Айчынная вайна і мастацкі вопыт “філалагічнага пакалення” / С. Андраюк // Полымя. – 2005. – № 10. – С. 180–202.

## БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА 70-Х– ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ 80-Х ГАДОЎ – 2 г. лекц.

Застойныя тэндэнцыі ў грамадска-сацыяльным жыцці, іх уплыў на літаратурны працэс. Пільная ўвага да літаратуры, пісьменніцкай арганізацыі з боку партыйнага кіраўніцтва і дзяржавы. Неадназначнасць узаемаадносін кансерватыўнай улады і творцаў: пабудова Дома літаратараў; стварэнне выдавецтваў “Мастацкая літаратура” (1972), “Юнацтва” (1981), выхад штогадовікаў “Дзень паэзіі” з 1964 г., “Далягляды” (перакладная замежная літаратура) з 1975 г., “Сучаснік” (нарыс і публіцыстыка) з 1977 г., “Братэрства” (перакладная літаратура народаў СССР) з 1982 г.; прысуджэнне высокіх прэмій і наданне званняў буйнейшым майстрам слова. Імкненне падпарадкаваць літаратурны працэс партыйным рашэнням.

Абвастрэнне праблем пераемнасці ў нацыянальнай культуры, захавання духоўнай, моўнай спадчыны. Дыскусіі пра бытавізм і

духоўнасць, пра перспектыўныя шляхі развіцця літаратуры. Праблемы культуры творчасці, інтэлектуальны пошук у паэзіі, прозе, драматургіі.

З'яўленне ў беларускай літаратуры героя з тонкай, чулай душой, глыбока маральнага, але не зусім здольнага супрацьстаяць злу. Увага пісьменнікаў да працэсаў фарміравання ўнутранага свету асобы. Пошукі выйсця з застойных і крызісных з'яў.

70-я– пачатак 80-х – гады актыўнай творчай працы пісьменнікаў розных пакаленняў. Праблема росту талентаў. Творчыя індывідуальнасці 70-х–80-х гадоў: В. Аколава, Л. Галубовіч, С. Шах, І. Багдановіч, Л. Тарасюк, Л. Пранчак, А. Пісьмянкоў, У. Ягоўдзік, З. Дудзюк, М. Пракаповіч, А. Каско, А. Наварыч і інш.

Рэалізацыя літаратурай 70-х– пачатку 80-х гадоў духоўна-эстэтычнага патэнцыялу, атрыманага ў папярэднія паслякультаўскія часы. Выхад беларускай літаратуры за нацыянальныя і ўсесаюзныя межы.

**Паэзія**. Вядучыя ідэйна-мастацкія тэндэнцыі ў тагачаснай беларускай паэзіі. Багацце творчых індывідуальнасцей у паэзіі 70-х– пачатку 80-х гадоў.

Кнігі паэзіі М. Танка "Хай будзе святло" (1972), "Дарога, закалыханая жытам" (1976), "Прайсці праз вернасць" (1979), "За маім сталом" (1984) і інш. Філасофскія матывы ў яго творчасці. Верлібры М. Танка ў кантэксце сусветнай паэтычнай традыцыі.

Класічнасць паэзіі А. Куляшова. Кнігі "Сасна і бяроза" (1970), "Хуткасць" (1976), паэмы "Далёка да акіяна" (1972), "Варшаўскі шлях" (1973), "Хамуціус" (1975).

Пафаснасць грамадзянскага голасу і публіцыстычнасць паэзі П. Панчанкі. Кнігі паэзіі "Снежань" (1972), "Крык сойкі" (1976), "Вячэрні цягнік" (1977),"Маўклівая малітва" (1981) і інш.

Выразная сацыяльная скіраванасць у змаганні за дабро, праўду, справядлівасць у паэзіі А. Грачанікава. Духоўныя памкненні лірычнага героя ў зборніках "Круглая плошча" (1971), "Грыбная пара" (1973), "Начная змена" (1975), "Дрэва на выспе" (1977), "Палессе" (1983), "Верасень" (1984) і інш.

Нацыянальны каларыт, стыхія народнага жыцця ў паэзіі В. Зуёнка ("Сяліба" (1973), "Нача" (1975), "Маўчанне травы" (1980) і інш.). Фальклорная плынь у паэзіі Н. Гілевіча, А. Лойкі, узбагачэнне іх вершаванай палітры. "Абуджаная" памяць нацыі, пераемнасць народных традыцый у паэзіі М. Арочкі. Гістарычная і фальклорная аснова драматычных паэм "Курганне" (1980), "Крэва" (1981).

Паэзія А. Пысіна, А. Вялюгіна, А. Вярцінскага, П. Макаля, Р. Барадуліна, С. Законнікава, М. Мятліцкага. Лірыка Е. Лось, В. Вярбы, Я. Янішчыц, Р. Баравіковай, Т. Бондар, інш. Арыгінальнасць,

непаўторнасць паэтычных галасоў М. Маляўкі, Л. Галубовіча, В. Шніпа, Л. Дранько-Майсюка, Ю. Голуба, Л. Тарасюк**.**

**Проза.** Узмацненне аналітычных тэндэнцый у прозе. “Лірызацыя” прозы, “празаізацыя” паэзіі. Узмацненне суб’ектыўнага пачатку ў літаратуры. Эсэістыка. Развіццё нарысістыкі.

Чалавек і вайна – магістральная тэма беларускай літаратуры. Адыход прозы ад папярэдніх стэрэатыпаў у паказе вайны з фашызмам.

Маральны максімалізм прозы аб вайне В. Быкава. Цыкл яго партызанскіх аповесцей. Грамадскі рэзананс аповесці “Сотнікаў” (1970). Выяўленне беларускай ментальнасці ў аповесці “Знак бяды” (1982). Інтэлектуалізм прозы пісьменніка. Аповесці-сітуацыі, аповесці-лёсы, аповесці-канцэпцыі (па вызначэнні У. Навумовіча). Прыпавесційнасць твораў В. Быкава.

Жанрава-стылёвыя пошукі А. Адамовіча ў прозе (“Хатынская аповесць”, 1972; “Карнікі”, 1980). З’яўленне ўнікальных дакументальна-мастацкіх кніг “Я з вогненнай вёскі...” (1973, 2-е выд. – 1983) у сааўтарстве з Я. Брылём і У. Калеснікам, “Блакадная кніга” (1979, 2-е выд. – 1985) у сааўтарстве з Д. Граніным. Дакументальныя сведчанні герояў кніг С. Алексіевіч “У вайны не жаночае аблічча” (1985), “Апошнія сведкі” (1985). Мастацкія творы аб вайне І. Пташнікава “Найдорф” (1976), І. Навуменкі “Смутак белых начэй” (1979), Б. Сачанкі “Вялікі Лес” (1982) і інш. Зварот В. Казько да дзіцячай памяці пры паказе падзей мінулай вайны (аповесць “Суд у Слабадзе”, 1978).

“Усе мы з хат” – формула, лейтматыў беларускай прозы аб горадзе і вёсцы. Матывы бацькаўшчыны, “зямлі продкаў”, “сена на асфальце”, раскрыццё духоўнага свету селяніна, вяскоўца і яго ўрастанне, уваход у новую рэчаіснаць. Мастацкае асэнсаванне жыцця ў кнігах прозы А. Кудраўца “Раданіца” (1971), “Дзень перад святам” (1975), “Зімы і вёсны” (1976), “На балоце скрыпелі драчы” (1979). Праўдзівасць і кранальнасць твораў, уплыў на чытача. Зварот да асноў народнага жыцця, апеляцыя да народнай мудрасці ў рамане “Сачыненне на вольную тэму” (1985).

Рэалістычная традыцыя ў беларускай літаратуры і проза А. Жука. Кнігі прозы “Асеннія халады” (1972), “ Не забывай мяне” (1978), “Па саннай дарозе” (1979). Матывы пераемнасці пакаленняў, пытанні станаўлення традыцыйнай маралі, самаўдасканалення асобы на вёсцы, яе духоўнага ўзвышэння ў творах А. Жука. Аповесць “Паляванне на Апошняга Жураўля” (1982).

Праблема ўзаемазалежнасці і ўзаемаўплыву чалавека і прыроды, Асобы і Свету, немажлівасці разбурэння цэласнасці душы ў рамане В. Казько аб меліярацыі Палесся “Неруш” (1983).

Выхад з крызісных, “застойных” з’яў у грамадстве, абвостраная ўвага да чалавека. Паглыбленне філасофска-канцэптуальнага зместу многіх твораў, інтэлектуалізацыя прозы (І. Шамякін, Я. Сіпакоў, В. Гігевіч, інш.). Паказ адносін чалавека і прыроды, сям’і, маралі, паглыбленне псіхалагізму. Лірызм і інтэлектуальнасць прозы Я. Брыля. Аповесці “Золак, убачаны здалёк” (1978), “Ніжнія Байдуны” (1975), кнігі мініяцюр “Вітраж” (1972), “Свае старонкі” (1951–1979).

Праўда жыцця ў шырокім гістарычна-часавым ахопе і шчырасць аўтарскіх адносін да яе – вызначальная якасць буйных празаічных твораў такіх як “Чужая бацькаўшчына” (1977), “Год нулявы” (1982), “І скажа той, хто народзіцца” (1985) В. Адамчыка, апошні раман трылогіі “На парозе будучыні” М. Лобана “Шэметы” (1980), апошні раман “Палескай хронікі” І. Мележа “Завеі, снежань” (1976), раманы І. Навуменкі “Сорак трэці” (1973), І. Пташнікава “Алімпіяда” (1984), Б. Сачанкі “Вялікі Лес” (1982), І. Чыгрынава “Плач перапёлкі” (1970), І. Шамякіна “Атланты і карыятыды” (1974), “Вазьму твой боль” (1978), “Петраград-Брэст” (1983).

Роля У. Караткевіча ў станаўленні гістарычнай школы ў мастацкай прозе. Гісторыка-дэтэктыўны раман “Чорны замак Альшанскі” (1979).

Праблемна-тэматычная і эстэтычная адметнасць твораў Г. Далідовіча, А. Карпюка, У. Дамашэвіча, Г. Марчука, Л. Дайнекі, А. Масарэнкі, Л. Левановіча, Э. Ялугіна, Ф. Янкоўскага, Л. Арабей, С. Грахоўскага, А. Марціновіча, У. Рубанава, У. Саламахі, інш.

**Драматургія** 70-х– пачатку 80-х гадоў, атмасфера творчага пошуку ў ёй. Драматычныя творы К. Крапівы гэтага часу. Поспех “Брамы неўміручасці” (1972). “На вастрыі” (1982) – апошняя п’еса драматурга. Жанрава-стылёвыя асаблівасці, сцэнічнае ўвасабленне драматургічных твораў “Званы Віцебска” (1974), “Калыска чатырох чараўніц” (1982), “Маці ўрагану” (1982) У. Караткевіча.

Заслугі А. Макаёнка ў развіцці беларускай драматургіі. Яго эксперыментальныя пошукі: трагікамедыя “Трыбунал” (1970), камедыя-рэпартаж “Таблетку пад язык” (1972), сатырычная камедыя трагікамічнага кшталту “Кашмар” (1974), трагікамедыя “Дыхайце эканомна” (1982), інш.

Вострыя грамадскія і маральныя праблемы ў п’есах “Амністыя” (1970), “Апошняя інстанцыя” (1974) М. Матукоўскага, “Экзамен на восень” (1975), “І змоўклі птушкі” (1978) І. Шамякіна, у п’есах А. Дзялендзіка. Разнастайнасць і актуальнасць праблематыкі п’ес А. Петрашкевіча “Трывога” (1974), “Соль” (1980). Увасабленне гістарычнай тэмы ў п’есах “Напісанае застаецца” (1978), “Русь Кіеўская” (“Гора і слава”) (1983).

Прыход у драматургію А. Дударава. Праблематыка яго п’ес “Выбар” (1976), “Парог” (1981), “Вечар” (1983). Грамадскі рэзананс драмы “Радавыя” (1984).

Беларускі **нарыс і публіцыстыка** 70-х– пачатку 80-х гадоў.

Здабыткі **крытыкі і літаратуразнаўства** (А. Адамовіч, В. Каваленка, Д. Бугаёў, У. Калеснік, М. Мушынскі).

**Перакладчыцкая дзейнасць** В. Сёмухі, Н. Гілевіча, Р. Барадуліна, Я. Семяжона, А. Куляшова, К. Шэрмана, інш.

Станоўчыя і адмоўныя тэндэнцыі ў беларускім літаратурным працэсе гэтага часу. Аб’ектыўныя прычыны звужэння сфераў функцыянавання беларускай мовы.

**ЛІТАРАТУРА:** Андраюк, С. Літаратура перыяду 1966–1985 гадоў / С. Андраюк [і інш.] // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2-е выд. Мінск : Беларус. навука, 2001–2002. – Т. 4. Кн. 1. – С. 8–110.

Гніламёдаў, У. Хроніка літаратурнага жыцця (1966–1985) / У. Гніламёдаў [і інш.]. // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2-е выд. Мінск : Беларус. навука, 2001–2002. – Т. 4. Кн. 1. – С. 751–919.

## **ПЯТРУСЬ БРОЎКА (1905–1980)** – 4 г. лекц., 2 г. практ.

П. Броўка як прызнаны і вядомы пісьменнік: народны паэт Беларусі (1962), лаўрэат Ленінскай прэміі (1962), Дзяржаўнай прэміі БССР (1969, 1976), акадэмік Акадэміі навук БССР (1966), Герой Сацыялістычнай Працы (1972) і інш. Дзейнасць П. Броўкі на пасадах старшыні праўлення СП БССР, галоўнага рэдактара Беларускай Савецкай Энцыклапедыі (БелСЭ).

Звесткі з біяграфіі. Тыповасць лёсу сялянскага сына, выхадца з вёскі. Вучоба ў БДУ, актыўны ўдзел паэта ў літаратурным аб’яднанні “Маладняк”. Лірычныя творы канца 20-х гадоў. Станаўленне творчай індывідуальнасці паэта ў 30-я гады. Ідэйна-эстэтычныя пошукі ў зборніках “Гады як шторм”, “Прамова фактамі” (абодва – 1930), “Цэхавыя будні” (1931). “Маладнякоўскі” стыль паэтычнага пісьма. Гімны савецкай яве. “Прамова фактамі” ў кнігах 30-х (“Так пачыналася маладосць”, 1934; “Прыход героя”, 1935; “Вясна Радзімы”, 1937). Даваенныя паэмы П. Броўкі “Прамова фактамі” (1930), “Праз горы і стэп” (1932), “1914” (1933), “Кацярына” (1938), эстэтычныя вартасці і недахопы твораў. Мастацкае абнаўленне паэзіі П. Броўкі ў другой палове 30-х гадоў, зварот да

асноватворных традыцый нацыянальнай класікі, паглыбленне эстэтыка-выяўленчага пачатку ў кнізе “Шляхамі баравымі” (1940).

Узмужненне таленту П. Броўкі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Творчыя пошукі і знаходкі. Патрыятычны і грамадзянскі пафас вершаў “Маці”, “Помста”, “Рана”, інш. Фальклорныя матывы і вобразы ў вершах-баладах “Кастусь Каліноўскі”, “Надзя-Надзейка”, інш. Патрыятычны пафас паэм ваеннага часу, іх жанравая разнастайнасць. Дакументальна-біяграфічная аснова “Паэмы пра Смалячкова” (1942). Паэма-кантата “Беларусь” (1943). Лірычныя паэмы “Ясны кут” (1944) і “Паланянка” (1945).

Творчасць пасляваеннага часу. Уплыў на паэзію П. Броўкі канца 40-х–50-х гадоў “тэорыі бесканфліктнасці”, ідэалізацыя даваеннай рэчаіснасці, схематычнасць, публіцыстычнасць у кнігах “У роднай хаце” (1946), “Сонечнымі днямі” (1950), “Цвёрдымі крокамі” (1954). Лепшыя творы гэтага часу: паэма “Хлеб” (1946), вершы “Шпак”, “Дзяўчына з Палесся” (абодва – 1947), “Івач” (1948), “Сонца грэе” (1949).

Сталенне паэтычнага таленту П. Броўкі ў другой палове 50-х–60-х гадоў. Гуманістычны пафас лірыкі, выяўленне асабовага пачатку, натуральнасць і шчырасць паэтычнага слова ў кнігах паэзіі “Пахне чабор” (1959), “Далёка ад дому” (1960), “Высокія хвалі” (1962), “Між чырвоных рабін” (1969). Багацце і разнастайнасць тэм і матываў. Тонкая назіральнасць і імкненне дакладна выявіць свет асобы ў пейзажнай, філасофскай і інтымнай лірыцы (“Зялёны клён лістотай гушкаў”, “Як ліст дубовы...”, “Сляды”, “Пахне чабор...”, “Александрына”, “Калі надыдзе час спачыну...” і інш.).

Паэма-рэквіем “Голас сэрца” (1960) як адзін з лепшых эпічных твораў 60-х гадоў, літаратурны помнік шматлікім ахвярам вайны. Жанрава-стылёвыя асаблівасці паэмы. Антываенны пафас твора.

Маральна-філасофскія матывы ў паэзіі П. Броўкі. Роздум над лёсам чалавека, яго прызвання, праблема адказнасці за выбар жыццёвай пазіцыі ў зборніках “Калі ласка” (1972), “І ў дзень, і ў ноч” (1974). Пашырэнне духоўных даляглядаў асобы лірычнага героя ў вершах “З нас кожны памыляцца можа...”, “Жыццё складанае бясконца...”, інш.

Проза П. Броўкі. Ідэалагічныя ўстаноўкі і іх уплыў на змест аповесці “Каландры” (1931) і рамана “Калі зліваюцца рэкі” (1957). Спрошчанасць у паказе калектывізацыі, павярхоўнае вырашэнне тэмы дружбы народаў. Эпічнае і лірычнае ў раманным мысленні пісьменніка. Зборнік прозы “Разам з камісарам” (1974). Жыццярадасны настрой, гумар, гуманістычны змест апавяданняў і аповесці “Донька-Даніэль” (1972).

# ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ
## **Творчае станаўленне Петруся Броўкі**

1. Штрыхі да партрэта пісьменніка.
2. Вершаваны калейдаскоп.
3. Абмеркаванне наступных пытанняў:

3.1 Вызначце асноўныя перыяды творчасці пісьменніка.

3.2 Ці згодны вы з думкай А. Бельскага, што творы П. Броўкі з’яўляюцца “яскравым дакументам сваёй эпохі”? Адказ абгрунтуйце.

3.3 Як грамадская праца П. Броўкі 20–30-х гадоў суадносілася з паэтычнай дзейнасцю? Якія матывы дамінавалі ў яго першых мастацкіх творах?

3.4 Прасачыце творчае станаўленне паэта ў 30-я гады. Што дало падставы літаратуразнаўцу М. І. Мішчанчуку назваць зборнікі “Прыход героя”, “Вясна радзімы” і “Шляхамі баравымі” прыкметнай з’явай даваеннай беларускай літаратуры? Адказ падмацуйце прыкладамі.

3.5 Акрэсліце тэматыку і рытміка-стылёвыя асаблівасці даваенных паэмаў “Прамова фактамі”, “Праз горы і стэп”, “1914”, “Кацярына”, іх эстэтычныя вартасці і недахопы.

3.6 Што дае падставы гаварыць пра жанравую разнастайнасць паэмаў ваеннага часу “Паэма пра Смалячкова”, “Беларусь”, “Ясны кут”, “Паланянка”?

3.7 Вызначце характэрныя асаблівасці вершаў-балад П. Броўкі.

3.8 Як уплывала “тэорыя бесканфліктнасці” на творчасць паэта канца 40-х– пачатку 50-х гадоў? Адказ абгрунтуйце.

3.9 Паразважайце пра вызначальныя рысы творчасці П. Броўкі другой паловы 50–60-х гадоў? Якое месца ў ёй належыць паэме “Голас сэрца”? Чаму паэт абраў ліра-эпічную форму для гэтага твора?

3.10 Ці можам мы сказаць, што ў паэзіі П. Броўкі шмат вершаў глыбока гуманістычнага і філасофскага гучання? Адказ падмацуйце прыкладамі. Якому з перыядаў творчасці паэта яны найбольш уласцівы?

3.11 Акрэсліце месца інтымнай і пейзажнай лірыкі ў творчасці П. Броўкі. Прааналізуйце вершы дадзенай тэматыкі.

3.12 Якую ацэнку ў крытыцы і літаратуразнаўстве атрымалі празаічныя творы пісьменніка (зб. “Разам з камісарам”, аповесць “Каландры”, раман “Калі зліваюцца рэкі”)? Ці супадаюць з імі вашы меркаванні?

4 Падрыхтуйце паведамленне “Пятрусь Броўка – публіцыст і крытык”.

5 Вызначце месца творчасці П. Броўкі ў беларускай літаратуры.

6 У школьную праграму ўключаны **для вывучэння:** у 5 кл. вершы “Калі ласка”; у 6 кл. “Зямля Беларусі” (урывак з паэмы “Беларусь”); у 10 п.у. кл. вершы “Спатканне”, “Пахне чабор”, “Родныя словы”; у 12 кл.

вершы “Дождж”, “Александрына”, “Вось і лета сышло...”, “А ты ідзі”, “Памылка”; у 12 п.у. дадаюцца вершы “Раны”, “Аб сумленні”, паэма “Голас сэрца”. **Для чытання і абмеркавання:** у 5 кл. “Беларусь” (урывак з паэмы), верш “Кропля”, у 10 п.у. паэма “Голас сэрца”, “Кастусь Каліноўскі”; у 12 кл. “Любая мясціна”, “Мой край азёрны”, “Яшчэ раз аб хлебе”, “Журавы”, “Слёзы”; у 12 п.у. вершы (на выбар) са зборнікаў “Пахне чабор”, “Між чырвоных рабін”.

Вызначце, да якога перыяду творчасці паэта гэтыя творы належаць, і аналізуйце іх пры адказе на вышэй прапанаваныя пытанні.

7 Вывучце на памяць верш “Родныя словы”.

**КРЫНІЦЫ:** Броўка, П. Збор твораў : у 9 т. / П. Броўка ; АН БССР. Ін-т літ. імя Я. Купалы ; рэдкал.: Р. Барадулін [і інш.]. – Мінск : Маст. літ., 1987–1992.

Броўка, П. Крыніца з-пад Вушачы : Вершы і паэмы / П. Броўка ; уклад. Р. Барадулін. – Мінск : Маст. літ., 2003. – 366 с.

Броўка, П. Як я пачаў пісаць вершы. З майго шляху / П. Броўка // Зб. тв. : у 9 т. / П. Броўка. – Мінск, 1991. – Т. 8. – С. 254–256.

**ЛІТАРАТУРА:** Беларускія пісьменнікі : Бібліягр. слоўн. : у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы ; рэдкал.: І. Багдановіч [і інш.]. – Мінск : “Беларус. энцыкл.”, 1992–1995. – Т. 1 : Абуховіч – Ватацы. – 1992. – С. 305–350.

Бельскі, А. Сучасны погляд на паэзію П. Броўкі / А. Бельскі // У дапамогу педагогу : Беларуская мова і літаратура. – 2000. – № 2. – С. 21–32.

Мішчанчук, М. Пятрусь Броўка / М. Мішчанчук // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2-е выд. Мінск : Беларус. навука, 2001–2002. – Т. 2. – 2002. – С. 413–453.

Ярош, М. Пятрусь Броўка : Нарыс жыцця і творчасці / М. Ярош. – Мінск : Нар. асвета, 1981. – 120 с.

**ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА:** Бечык, В. Што сэрца праспявала... / В. Бечык // Прад высокаю красою...: Літ.-крыт. артыкулы / В. Бечык. – Мінск, 1984. – С. 4–22.

Броўка, Ю. Ліст да І. Шамякіна / Ю. Броўка // Полымя. – 1994. – № 5. – С. 254–256 (крытычныя заўвагі сына П. Броўкі з нагоды апублікаваных успамінаў).

Гніламёдаў, У. Паэт купалаўскай школы / У. Гніламёдаў // Краязнаўчая газета. – 2005. – № 24 (чэрв.). – С. 2.

Золава, Э. Пятрусь Броўка – публіцыст і крытык / Э. Золава // Зб. тв. : у 9 т. / П. Броўка. – Мінск, 1991. – Т. 8. – С. 340–347.

Кучар, А. Раман “Калі зліваюцца рэкі” П. Броўкі / А. Кучар // Літар.-крытыч. артыкулы / А. Кучар. – Мінск, 1980. – С. 34–64.

Марціновіч, А. “Да роднай зямлі я навечна прырос...” / А. Марціновіч // Дарога ў запаветнае : Нарысы, артыкулы / А. Марціновіч. – Мінск, 1992. – С. 42–48.

Пятрусь Броўка і яго час : матэрыялы рэсп. навук. канф., Мінск, 24 чэрв. 2005 / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я.Купалы ; рэдкал.: С. Лаўшук [і інш.] – Мінск, 2005. – 159 с.

Пятрусь Броўка = Петрусь Бровка / Аўт. тэкст. У. Гніламёдаў ; склад. В. Кудраўцава. – Мінск : Беларусь, 1985. – 63 с.

Пятрусь Броўка / Прадм. і падрыхт. тэкстаў Казіміра Камейшы // Полымя. – 2005. – № 12. – С. 142–145.

Рагойша, В. Плён шчодрай сяўбы / В. Рагойша // І адгукнецца слова ў слове...: Літ.-крыт. артыкулы, эсэ, дыялогі / В. Рагойша. – Мінск, 1992. – С. 33–42.

Рублевская, Л. Поэт и бронза. Неизвестный Бровка / В. Сколобан // Советская Белоруссия. – 2005. – 25 июня. – С. 14–15.

Успаміны пра Петруся Броўку / Склад. і заўв. Р. Шкраба. – Мінск : Маст. літ., 1986. – 415 с.

**АРКАДЗЬ КУЛЯШОЎ (1914–1978)** – 4 г. лекц., 2 г. практ.

А. Куляшоў і беларуская паэзія ХХ ст. Значэнне яго творчага ўкладу ў нацыянальную літаратуру. Высокая ацэнка таленту і творчай дзейнасці: уганараванне званнем народнага паэта Беларусі (1968), Дзяржаўнымі прэміямі СССР (1946 і 1949) і БССР (1970).

Звесткі з біяграфіі. Умовы фарміравання таленту. Духоўны свет лірычнага героя ранняй творчасці.

Мастацкі пошукі 30-х гадоў. Кнігі вершаў “Росквіт зямлі” (1930), “Па песню, па сонца!”, “Медзі дождж” (1933). Паэмы “Крыўда” (1930), “Аманал” (1931). Пошук сродкаў эпічнасці ў паэмах “Антон Шандабыла” (1933), “Баранаў Васіль” (1937), “Песня аб разведчыках” (1938). Уплыў паэмы А. Твардоўскага “Краіна Муравія” на творы А. Куляшова 30-х гадоў. Ліра-эпічная паэма “У зялёнай дубраве” (1938–1939). Драматычная паэма “Хлопцы апошняй вайны” (1940). Трывога паэта ад прадчування блізкай вайны. Поспех нізкі вершаў “Юнацкі свет” (1938–1940). Арыентацыя А. Куляшова на высокаадухоўленае жыццё. Лепшыя вершы даваеннага часу: “Бюро даведак”, “Мая Бесядзь”, “Плыла, цалавалася хмарка з зямлёй...” як падвядзенне вынікаў і адначасова вызначэнне праграмы на будучае.

Новы ўзровень мастацкіх пошукаў у творчасці перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Фальклорныя матывы ў баладах і вершах “Ліст з

палону”, “Балада аб чатырох заложніках”, “Маці”, “Над брацкай магілай”, інш. Наватарства ў распрацоўцы жанру балады.

Панарамнасць ахопу народнага жыцця ва ўмовах ваеннага ліхалецця ў ліра-эпічнай паэме “Сцяг брыгады” (1942). Маральная праблематыка і яе вырашэнне паводле ідэалагічных канонаў. Наватарства ў сюжэце і кампазіцыі: злучэнне рыс паэмы-дзённіка з апісаннем падарожжа. Прадуктыўнасць фальклорнай паэтыкі. Умоўна-казачны свет паэмы “Прыгоды цымбал” (1944). Рэальнае і ўмоўнае ў паэме “Перамога” (1944). Праўдзівасць малюнкаў жыцця ў паэме “Дом № 24” (1944).

Пасляваенная творчасць. Паэт і час, паэт і ідэалогія (вершы “Камуністы”, “Слова да Аб’яднаных нацый”, паэма “Новае рэчышча”, 1948 і інш.). Паэмы “Толькі ўперад” (1950), “Грозная пушча” (1952–1956).

Верш “Перад падарожжам” (1961) як сведчанне пераадолення творчага крызісу. Канцэптуальная навізна “Новай кнігі” (1964). Маштабнасць і філасафізм думкі. Асэнсаванне вечных праблем – жыццё і смерць, каханне, сувязь мінулага і будучыні, адказнасць чалавека перад часам і сабой, лёс і абавязак паэта (“Ёсць у паэта свой аблог цаліны”, “Я хаце абавязаны прапіскаю”, “Мне кожны год, нібы жыццём другім...” Непаўторнасць куляшоўскага стылю, яго інтэлектуальная насычанасць. Зборнікі “Сасна і бяроза” (1970) і “Хуткасць” (1976) як працяг творча-эстэтычных традыцый “Новай кнігі”.

Жанр паэмы ў творчасці А. Куляшова. Паэма (цыкл вершаў) “Маналог” (1966) – рэквіем аб сябрах юнацтва і творчасці. Асэнсаванне лёсу паэта ў таталітарным грамадстве. Філасофская паэма-прыпавесць “Цунамі” (1968). Абагуленасць вобразаў, глыбіня агульначалавечых праблем. Сцвярджэнне ідэі духоўнага пачатку чалавечага жыцця і спраў у ліра-эпічнай паэме “Далёка да акіяна” (1970) і лірыка-філасофскай паэме “Варшаўскі шлях” (1973). Філасафізм і спавядальнасць інтанацый. Жанр паэмы-маналогу, паэмы-споведзі ў творчасці А. Куляшова. Паэма “Хамуціус” (1976) як арыгінальная творчая распрацоўка сусветных і нацыянальных традыцый жанру драматычнай паэмы.

А. Куляшоў – перакладчык. Выдатныя пераклады М. Лермантава, класічных твораў сусветнай літаратуры (“Энеіда” І. Катлярэўскага, “Спеў аб Гаяваце” Г. Лангфэла).

Творчасць А. Куляшова ў крытыцы і літаратуразнаўстве.

## ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ
## **Паэтычнае майстэрства Аркадзя Куляшова**

1. Штрыхі да партрэта пісьменніка.
2. Вершаваны калейдаскоп.

3. Абмеркаванне пытанняў:

3.1 Вызначце асноўныя этапы творчасці А. Куляшова. Ахарактарызуйце раннюю творчасць. Якія традыцыі ўплывалі на станаўленне маладога паэта?

3.2 Што хвалюе лірычнага героя вершаў “Бывай”, “Бюро даведак”, “Мая Бесядзь”? Вызначце ролю мастацка-выяўленчых сродкаў у раскрыцці ідэйнага зместу твораў.

3.3 Акрэсліце месца паэмнага жанру ў даваеннай творчасці А. Куляшова. Паводле якой з паэм гэтага перыяду аўтара можна назваць прарокам?

3.4 Якому з вершаваных жанраў аддаў перавагу паэт у час Вялікай Айчыннай вайны? Чаму? Паразважайце, чаму вершы “Над брацкай магілай”, “Ліст з палону”, “Балада аб чатырох заложніках”, “Маці” – балады.

3.5 Раскажыце пра асаблівасці эпічнай формы, падзейна-сюжэтны бок, моманты аўтабіяграфізму ў паэме “Сцяг брыгады”. Дайце характарыстыку галоўных герояў: Рыбкі, Заруднага, Ворчыка. Якую ацэнку займела паэма і яе вобразы ў крытыцы? Якія нацыянальныя архетыпы, сімвалічныя вобразы ўжыў мастак? Паразважайце пра наватарства А. Куляшова ў пабудове сюжэта і кампазіцыі, у выкарыстанні мастацкіх сродкаў ( замоў, сродкаў драмы і інш.).

3.6 Вызначце, чым сярод іншых паэм А. Куляшова ваеннага часу вылучаецца паэма “Прыгоды цымбал”.

3.7 Што дае падставы даследчыкам гаварыць пра “канцэптуальную навізну” куляшоўскага зборніка “Новая кніга”?

3.8 Дакажыце, што зборнікі “Сасна і бяроза” і “Хуткасць” з’яўляюцца працягам творча-эстэтычных традыцый “Новай кнігі”.

3.9 А. Куляшоў з’яўляецца аўтарам шэрагу паэм. Якая з іх закранае праблему лёсу паэта ў таталітарным грамадстве? Каму яна прысвечана? Якую адметнасць мае кампазіцыя гэтага твора?

3.10 Чым цікавая для сучаснага чытача філасофская паэма-прыпавесць “Цунамі”? Чаму А. Куляшоў не дае сваім героям канкрэтных імёнаў, а выкарыстоўвае займеннікі Ён і Яна? Растлумачце сэнс назвы твора.

3.11 На чым заснаваны сюжэтны лад паэмы “Далёка да акіяна”? Якія тры “кругі” вылучаюцца ў паэме? У ідэйна-эстэтычным змесце твора акрэсліце месца інтымнай лініі. Якім у паэме паўстае вобраз Алесі? Вызначце ролю адступленняў, сімвалічных вобразаў. Што дае падставы гаварыць пра філасофскую напоўненасць паэмы “Далёка да акіяна”? Адказ абгрунтуйце.

3.12 Каму прысвяціў А. Куляшоў сваю лірыка-філасофскую паэму “Варшаўскі шлях”? Якія праблемы ўздымае аўтар? Які сэнс у творах

паэта ўвасабляе вобраз шляху, Падарожнага? Які ўрывак з паэмы варта прапанаваць школьнікам для завучвання на памяць? Чаму?

3.13 Акрэсліце асаблівасці жанру паэмы-споведзі.

3.14 Вызначце жанравыя адметнасці паэмы “Хамуціус”? Якія сюжэтныя лініі выдзяляюцца ў творы? Якім уяўляецца вам К. Каліноўскі як каханы і кіраўнік паўстання? Ахарактарызуйце вобраз Марыські. У чым сімвалічнасць фінальнай часткі паэмы?

3.15 Паразважайце пра непаўторнасць куляшоўскага стылю.

4 Зрабіце паведамленне “Перакладчыцкая дзейнасць А. Куляшова”.

5 Школьная праграма прапануе **для вывучэння:** у 8 кл. вершы “Бывай”, “Маці”, “Балада аб чатырох заложніках”; у 10 кл. “Мая Бесядзь”, “Над брацкай магілай”, “Спакойнага шчасця не зычу нікому...”, “На паўмільярдным кіламетры”, “Я хаце абавязаны прапіскаю...”, “Мне кожны год, нібы жыццём другім...”, вершаваны цыкл “Маналог”; у 10 п.у. паэму “Варшаўскі шлях”, “Ліст з палону”; у 12 кл. паэму “Цунамі”. **Для пазакласнага чытання:** паэма “Хамуціус”.

Вызначце, да якога перыяду творчасці паэта гэтыя творы належаць, і аналізуйце іх пры адказе на вышэй прапанаваныя пытанні.

6 **Для чытання** у 10 кл. на выбар настаўніка прапануюцца творы: “Маці”, “Элегія”, “Нябёсы – акіян, я знаў даўно...”, “Глыбокі лістапад у Белавежы...”, “Сышлося неба з акіянам блізка”.

Якія з іх вы будзеце рэкамендаваць вучням і чаму?

7 Вывучце на памяць адзін з вершаў (“Бывай”, урывак з паэмы “Варшаўскі шлях”, верш (на выбар), “На паўмільярдным кіламетры”).

**КРЫНІЦЫ:** Куляшоў, А. Збор твораў : у 5 т. / А. Куляшоў ; уступ. арт. В. Бечык. – Мінск : Маст. літ., 1974–1977.

Куляшоў, А. Дарогі : Вершы, паэмы / А. Куляшоў ; уклад. В. Куляшова. – Мінск : Маст. літ., 2003. – 318 с.

Куляшоў, А. Паміж наступным і былым : Вершы, паэмы / А. Куляшоў. – Мінск : Маст. літ., 1995. – 542 с.

**ЛІРАРАТУРА:** Арочка, М. Аркадзь Куляшоў / М. Арочка // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2-е выд. Мінск : Беларус. навука, 2001–2002. – Т. 3. – 2002. – С. 416–456.

Беларускія пісьменнікі : Бібліягр. слоўн. : у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы ; рэдкал.: І. Багдановіч [і інш.]. – Мінск : “Беларус. энцыкл.”, 1992–1995. – Т. 3. : Івашын – Кучар. – 1994. – С. 459–483.

Бечык, В. Шлях да акіяна : Кніга пра паэзію А. Куляшова / В. Бечык. – Мінск : Маст. літ., 1981. – 270 с.

Бярозкін, Р. Аркадзь Куляшоў : Нарыс жыцця і творчасці / Р. Бярозкін. – Мінск : Нар. асвета, 1978. – 192 с.

Kенька, М. Майстэрства Аркадзя Куляшова-перакладчыка / М. Kенька ; Ін-т літ. імя Я. Купалы ; рэд. У. Гніламёдаў. – Мінск, 1983. – 128 с.

Лебедзеў, У. “Ёсць у паэта свой аблог цаліны”. Творчасць Аркадзя Куляшова / У. Лебедзеў // Беларуская літаратура : У святле новых фактаў і назіранняў : Вуч. дап. Вып. 1. – Брэст, 1996. – С. 83–88.

Мішчанчук, М. “Хачу неспакойнаю хмарай грымець...” / М. Мішчанчук // Роднае слова. – 2005. – № 12. – С. 53–56.

Шпакоўскі, І. Сувязь з часам і людзьмі. Роздум над паэзіяй А. Куляшова / І. Шпакоўскі // Беларуская літаратура ХХ стагоддзя : Вучэб. дап. для студ. філалаг. спец. ВНУ / М. Мішчанчук, І. Шпакоўскі. – Мінск, 2001. – С. 269–288.

**ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА:** Аркадзь Куляшоў = Аркадий Кулешов / Аўт. тэксту П. Панчанка ; склад. В. Куляшова. – Мінск : Беларусь, 1985. – 80 с.

Арочка, М. Пад высокай зоркай : Паэзія М. Ю. Лермантава ў творчым лёсе А. Куляшова / М. Арочка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 46 с.

Бородулин, Р. Космос Аркадия Кулешова : Официально признанный и хрестоматийный классик жил, как затворник / Р. Бородулин // Белорус. деловая газета. – 2003. – 6 февр. – С. 13.

Бугаёў, Д. Золата паэзіі і медзякі рыторыкі / Д. Бугаёў // Спавядальнае слова : Літар. крытыка, успаміны / Д. Бугаёў. – Мінск, 2001. – С. 245–261.

Куляшова, В. Лясному рэху праўду раскажу... : Літаратуразнаўчае эсэ / В. Куляшова. – Мінск : Маст. літ., 1989. – 333 с.

Куляшова, В. “Я маці абавязан кожнай рыскаю...” / В. Куляшова // Роднае слова. – 2006. – № 1. – С. 86–89.

Мішчанчук, М. Ёсць у паэта свой аблог цаліны...: Жанрава-стылёвая разнастайнасць сучаснай беларускай лірыкі / М. Мішчанчук. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 189 с.

## **МАКСІМ ТАНК (1912–1995)** – 4 г. лекц., 2 г. практ.

Значнасць асобы М. Танка (Яўгена Іванавіча Скурко) ў грамадска-культурным жыцці Беларусі другой паловы ХХ ст. Шматгранная далучанасць мастака слова да набыткаў сусветнай культуры. Шырокая вядомасць паэта, высокая ацэнка яго творчай дзейнасці: народны паэт Беларусі (1968), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1948) і БССР (1966), Ленінскай прэміі (1978), Герой Сацыялістычнай Працы (1974).

Звесткі з біяграфіі. Удзел у нацыянальна-вызваленчай барацьбе заходнебеларускага народа і ў літаратурным руху 30-х гадоў. Ранняя

ідэйна-палітычная сталасць і хуткае творчае станаўленне. Традыцыі фальклору, беларускай (Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч), рускай (А. Пушкін, У. Маякоўскі, С. Ясенін), польскай (А. Міцкевіч, Ю. Славацкі, Г. Сянкевіч), украінскай (Т. Шаўчэнка), увогуле еўрапейскай культуры (антычная класіка, Ш. Пёцефі, Г. Апалінэр, П. Элюар) у яго паэзіі. Імкненне ўзбагаціць беларускую літаратуру новымі эстэтычнымі каштоўнасцямі і адначасова знайсці свой непаўторны паэтычны голас. Шлях паэта ад вучнёўскага пераймання і вобразнай ускладненасці ў асобных творах ранняга перыяду да творчай сталасці, узлёту таленту ў другой палове 30-х гадоў.

Эвалюцыя М. Танка ў зборніках паэзіі "На этапах" (1936), "Журавінавы цвет" (1937), "Пад мачтай" (1938). Адметнасць мастацкага свету і наватарства паэта. Здольнасць да шматграннага выяўлення лірычных пачуццяў. Паяднанне ў заходнебеларускай лірыцы М. Танка лірычнага, публіцыстычнага і філасофскага пачаткаў. Наяўнасць размоўных апавядальных інтанацый, вобразнасці і танальнасці народных песень, класічных і авангардысцкіх рыс. Элегічнае, драматычнае, нават трагічнае, напоўненае пранікнёным грамадзянскім сумам і адначасова жыццесцвярджальнае гучанне танкаўскай паэзіі. Іронія, сатыра і гумар у творах паэта.

Класічная завершанасць, дасканаласць і стылёвая разнастайнасць філасофскай ("Яны", "Межы"), пейзажнай ("Лісце каштанаў", "Абапал лес..."), інтымнай ("За пацалункі і за вочы...", "У полі вярба") лірыкі, сатырычных вершаў ("Адказ", "Раманс", "Пачатак оды", "Эпітафія"), твораў для дзяцей ("Мухамор", "Дзед і шчупак", "Казка пра мядзведзя").

Пошукі і эстэтычныя адкрыцці ў ліра-эпасе. Жанрава-стылёвыя асаблівасці паэм "Нарач", "Журавінавы цвет", "Сказ пра Вяля" ( усе – 1937), "Кастусь Каліноўскі", "Казка пра Музыку" (абедзве – 1938). "Лісткі календара" (1935–1939) як унікальная кніга дзённікава-дакументальнай прозы М. Танка.

Крытычныя артыкулы ("Крыніцы нашай творчасці", "Літаратурны маладняк і крытыка", 1938), апавяданні і мастацкія пераклады заходнебеларускай пары. М. Танк як "найбольшы паэт Заходняй Беларусі" (В. Таўлай), ацэнка яго творчасці беларускімі (Р. Шырма, Я. Купала, Я. Колас, інш.) і польскімі (Е. Путрамант, А. Мікулка, інш.) крытыкамі і пісьменнікамі.

Складанасці і супярэчнасці творчай эвалюцыі паэта ў савецкі час. Набыткі і страты ў яго перадваеннай лірыцы.

Паэзія М. Танка перыяду вайны. Патрыятычны пафас лірыкі. Вершы-заклікі. Сцвярджэнне неўміручасці роднага краю, народа, культуры і мовы, роздум, элегічнасць, драматызм і трагізм, глыбокая духоўнасць і мастацкая

дасканаласць лепшых вершаў М. Танка гэтай пары (“Родная мова”, “Маці”, “Рэквіем”, “Мы ў свой горад прыйшлі”, інш.). Паэма “Янук Сяліба” (1943) – адзін з першых беларускіх буйнейшых твораў ваеннага часу.

Неадназначнасць творчых здабыткаў М. Танка канца 40-х–50-х гадоў. Кнігі паэзіі “Каб ведалі” (1948), “На камні, жалезе і золаце” (1951), “У дарозе” (1954). Ідылічнасць, элементы спрошчанасці, павярхоўнасці ў адлюстраванні жыцця. Майстэрства паэта ў лепшых вершах (“Шапэн”, “Рукі маці”, “Іван-ды-Мар’я”, “Апала зорка...”, інш.). Прыгажосць, сіла і неўміручасць народнага мастацтва ў паэме “Люцыян Таполя” (1946).

Станоўчы ўплыў на паэзію М. Танка дэмакратычнага абнаўлення грамадства ў сярэдзіне 50-х гадоў. Паглыбленне гуманістычнага пафасу ў лірыцы, узмацненне яе філасафічнасці, пашырэнне тэматыкі і сродкаў мастацкага выяўлення ў кнігах “След бліскавіцы” (1957), “Мой хлеб надзённы” (1962), “Глыток вады” (1964), “Перапіска з зямлёй” (1967). Паэтызацыя каштоўнасцяў, што вызначаюць сэнс чалавечага жыцця (“Шчасце”, “Перапіска з зямлёй”, “Прытча аб хлебе”). Пошук новых мастацкіх форм і жанраў. Танкаўскі верлібр.

Інтэнсіўнасць мастацкіх пошукаў М. Танка 70–80-х гадоў. Кнігі паэзіі “Хай будзе святло” (1972), “Дарога, закалыханая жытам” (1976), “За маім сталом” (1984). Багацце вобразнага свету, арганічная далучанасць да маральнага, эстэтычнага і духоўнага вопыту свайго народа і набыткаў сусветнай культуры. Філасофская значнасць, інтэлектуальная важкасць і мастацкія асаблівасці верлібраў “Аслепшы”, “І радасць – ніякая радасць, а горыч...”, “Гравюры Скарыны”, інш. Наватарскі характар паэзіі.

М. Танк як паэт-філосаф. Унутраная засяроджанасць, медытатыўнасць і інтэлектуальнасць творчасці другой паловы 80–90-х гадоў. Кнігі паэзіі “Збор калосся” (1989), “Мой каўчэг” (1994), “Errata” (1996). Узмацненне матываў спавядальнасці, самапакаяння ў паэзіі 90-х гадоў. Экалагічныя матывы.

Шматграннасць творчай індывідуальнасці М. Танка. Сатырычныя творы (зборнік “Селядцы з вершамі”, 1966). Паэзія для дзяцей. Пераклады М. Танка (А. Пушкін, А. Міцкевіч, Ю. Славацкі, У. Маякоўскі, Ф. Г. Лорка, інш.), іх роля ва ўмацаванні сувязяў беларускай літаратуры з літаратурамі іншых народаў і ва ўзбагачэнні яго арыгінальнай творчасці. Дзённікі, публіцыстыка і літаратурная крытыка паэта як мастацкі дакумент часу.

Пераклады твораў М. Танка на іншыя мовы.

Бібліяграфія арыгінальных выданняў.

Творчасць паэта ў крытыцы і літаратуразнаўстве.

Уплыў паэзіі М. Танка на сучасны літаратурны працэс.

## ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ
## **Жанрава-стылёвыя асаблівасці творчасці Максіма Танка**

1. Штрыхі да партрэта пісьменніка.
2. Вершаваны калейдаскоп.
3. Абмеркаванне пытанняў:

3.1 Вызначце асноўныя этапы творчасці паэта.

3.2 Акрэсліце асаблівасці творчасці М. Танка заходнебеларускага перыяду. Якія паэтычныя вобразы, вобразы-сімвалы і з якой мэтай выкарыстоўвае паэт у вершах “Песня кулікоў”, “Паслухайце, вясна ідзе”, “На пероне”, “Спатканне”?

3.3 Прааналізуйце творы філасофскай, інтымнай і пейзажнай лірыкі гэтай пары, звярнуўшы ўвагу на адметнасць мастацкіх тропаў і іншых сродкаў увасаблення лірычных перажыванняў.

3.4 Вызначце жанрава-стылёвыя асаблівасці паэмаў М. Танка. Паразважайце пра героіка-рамантычны характар паэмы “Нарач”, яе праблематыку і вобразы герояў. Акрэсліце мастацкую функцыю лірычных адступленняў і пейзажных малюнкаў. Падрыхтуйце выразнае чытанне ўрыўка “Ля вогнішч начлежных”.

3.5 Прааналізуйце праблематыку, вобразы герояў, дакладнасць перадачы іх характараў у паэме “Журавінавы цвет”.

3.6 Раскажыце, якім чынам праяўляюцца традыцыі былінна-казачнага эпасу ў паэмах “Сказ пра Вяля” і “Казка пра Музыку”.

3.7 Акрэсліце канкрэтна-гістарычны і фальклорна-легендарны падыходы М. Танка ў асэнсаванні постаці К. Каліноўскага ў аднайменнай паэме.

3.8 Ахарактарызуйце лірыку М. Танка ваеннай пары.

3.9 Паразважайце пра вобразна-тэматычную блізкасць паэмаў М. Танка “Янук Сяліба” і “Нарач”. Дайце характарыстыку вобразаў герояў. Вызначце наяўнасць героіка-рамантычных прыкмет, фальклорных рыс, ролю устаўных элементаў, пейзажных замалёвак у творы.

3.10 Параўнайце паэзію ваеннай пары М. Танка і А. Куляшова.

3.11 Раскажыце, як сам паэт ацэньваў уласную творчасць першага пасляваеннага дзесяцігоддзя.

3.12 Вызначце ідэйна-філасофскі змест, мастацкія асаблівасці паэмы “Люцыян Таполя”. Прасачыце суаднесенасць паэмы з такімі творамі паэта, як “Гляджу на дываны”, “Казка пра Музыку”, аповяд пра музыку Куліка з паэмы “Янук Сяліба” ў ракурсе праблемы прызначэння мастака і мастацтва.

3.13 Які ўплыў на паэзію М. Танка зрабіла дэмакратычнае абнаўленне грамадства з сярэдзіны 50-х гадоў? Адказ абгрунтуйце аналізам кніг паэзіі канца 50–70-х гадоў.

3.14 Да якой плыні ў сучаснай паэзіі аднёс даследчык У. Гніламёдаў паэзію М. Танка 80–90-х гадоў? На якой падставе?

3.15 Прывядзіце прыклады розных жанраў і формаў (вершы сілаба-танічныя, танічныя, дольнік, санет, катрэн, інш.) у паэзіі М. Танка.

3.16 Школьная праграма ў сувязі з вывучэннем вершаў М. Танка па тэорыі літаратуры ўводзіць разгляд паняцця верлібр (свабодны верш). Падрыхтуйце паведамленне па гэтым пытанні.

4 Вызначце эстэтычную спецыфіку танкаўскага верлібра (“Дрэвы паміраюць...”, “Дрэнна, калі згасне зрок...”, “Кій...”, “Усё мае працяг жыцця...”, “Рукі маці”, інш.). Паразважайце над сэнсам і функцыямі асацыятыўнай вобразнасці ў гэтых творах.

5 Падрыхтуйце паведамленне “Перакладчыцкая дзейнасць М. Танка”.

6 Падрыхтуйце паведамленне “Уплыў М. Танка на сучасны літаратурны працэс”.

7 Школьная праграма **для вывучэння** вылучае: у 8 кл. “Шчасце”; у 10 кл. “Спатканне”, “Родная мова”, “Каб ведалі”, “Мой хлеб надзённы”, “Завушніцы”, “Ave Maria”, паэму “Люцыян Таполя” , кнігу паэзіі “Збор калосся”; у 10 п.у. “Паслухайце, вясна ідзе...”, “Рукі маці”, “Перапіска з зямлёй”, “Мой хлеб надзённы”, “Паэзія”; у 12 кл. “Мой хлеб надзённы”, “Гравюры Скарыны”, “Акамянелыя волаты”, “Працягласць дня і ночы”, “Шчаслівы дзень”, “Дрэвы паміраюць”, “Паказваюць дом паэта...”, “Усё пачалося з іголкі”; у 12 п.у. дадаюцца “Канцэрт у сене”, “Дарога з сенажаці”, “Дрэнна, калі згасне зрок”, “Цяпер асцерагайцеся”. **Для самастойнага чытання** ў 10 п.у. прапануюцца паэма “Люцыян Таполя”, “Песня кулікоў”, “Эх, Багрыме...”, “Венера Мілоская”, “Мыццё бабкі Ульяны”, “Гісторыя вёскі Пількаўшчына”, “Парог, вычасаны з успамінаў...”; у 12 п.у. “Шчаслівы дзень”, “Усё мае працяг жыцця...”, “Прызнанне”, “Летні дождж”, “Восень”, “Касмалогія”, кніга “Лісткі календара”.

Вызначце, да якога перыяду творчасці паэта гэтыя творы належаць, і аналізуйце іх пры адказе на вышэй прапанаваныя пытанні.

8 **Для чытання** на выбар настаўніка ў 10 кл. пазначаны вершы “На пероне”, “Маці”, “Быць чалавекам я рад”; у 12 кл. “Пісьмо ваенкому”, “Мыццё бабкі Ульяны”, “Слова”, “Голас”, “Усё мае працяг жыцця...”, “Мне пагаварыць бы...”.

Якія з іх вы будзеце рэкамендаваць вучням і чаму?

9 Вывучце на памяць адзін з вершаў (“Шчасце”, “Родная мова”, “Рукі маці”, верш на выбар).

**КРЫНІЦЫ:** Танк, М. Збор твораў : у 13 т. / М. Танк ; прадм. В. Зуёнка. – Мінск : Бел. навука, 2006–2007 (3 т.).

Танк, М. Збор твораў : у 6 т. / М. Танк ; уст. арт. М. Арочкі. – Мінск : Маст. літ., 1978–1981.

Танк, М. ERRATA : Вершы. Пераклады / М. Танк. – Мінск : Маст. літ., 1996. – 143 с.

Танк, М. Мне пару крыл дало юнацтва...: Выбраная лірыка / М. Танк ; уклад. В. Рагойша. – Мінск : Маст. літ., 2003. – 479 с.

Танк, М. Мой каўчэг : Вершы 1989–1992 / М. Танк. – Мінск : Маст. літ., 1994. – 207 с.

**ЛІТАРАТУРА**: Арочка, М. Максім Танк / М. Арочка // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2-е выд. Мінск : Беларус. навука, 2001–2002. – Т. 3. – 2002. – С. 312–348.

Беларускія пісьменнікі : Бібліягр. слоўн. : у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы ; рэдкал.: І. Багдановіч [і інш.]. – Мінск : “Беларус. энцыкл.”, 1992–1995. – Т. 6. : Талалай – Яфімаў. Дадатак. – 1995. – С. 8–55.

Бугаёў, Д. Паэзія Максіма Танка / Д. Бугаёў. – 2-е выд., выпр. і дапр. – Мінск : Беларус. думка, 2003. – 311 с.

Калеснік, У. Максім Танк : Нарыс жыцця і творчасці / У. Калеснік. – Мінск : Маст. літ., 1981. – 189 с.

Мікуліч, М. Максім Танк : На скразняках стагоддзя / М. Мікуліч. – Мінск : Маст. літ., 1999. – 254 с.

Шпакоўскі, І. Перапіска з зямлёй. Традыцыйнае і наватарскае ў паэзіі Максіма Танка / І. Шпакоўскі // Беларуская літаратура ХХ стагоддзя : Вучэб. дап. для студ. філалаг. спец. ВНУ / М. Мішчанчук, І. Шпакоўскі. – Мінск, 2001. – С. 258–269.

**ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА:** Арочка, М. Максім Танк : Жыццё ў паэзіі / М. Арочка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 272 с.

Бугаёў, Д. Душэўнае высакародства / Д. Бугаёў // Спавядальнае слова : Літар. крытыка, успаміны / Д. Бугаёў. – Мінск, 2001. – С. 262–271.

Верабей, А. Максім Танк і польская літаратура / А. Верабей ; АН БССР ; Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 120 с.

Гніламёдаў, У. Ад даўніны да сучаснасці : Нарыс пра беларускую паэзію / У. Гніламёдаў. – Мінск : Маст. літ., 2001. – 246 с.

Гніламёдаў, У. Над старонкамі паэзіі Максіма Танка / У. Гніламёдаў // Полымя. – 2006. – № 1. – С. 210–222.

Кабаковіч, А. Беларускі свабодны верш / А. Кабаковіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 175 с.

Ляшук, В. Зборнік “На этапах” і яго месца ў станаўленні творчай індывідуальнасці М. Танка / В. Ляшук // Весн. Брэсц. дзярж. ун-та. Сер. філал. навукі. Літаратуразнаўства. – 2005. – № 3. – С. 31–37.

Максім Танк = Максим Танк / Аўт. тэксту В. Рагойша. – Мінск : Беларусь, 1985. – 87 с.

Мікуліч, М. Лірычны герой у паэзіі Максіма Танка давераснёўскага перыяду / М. Мікуліч // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 4. Філалогія. – 2007. – № 1. – С. 18–23.

Мішчанчук, М. Новае пра Максіма Танка / М. Мішчанчук // Беларус. думка. – 2001. – № 3. – С. 156–158.

**ПІМЕН ПАНЧАНКА (1917–1995)** – 4 г. лекц., 2 г. практ.

Асоба П. Панчанкі як паэта-грамадзяніна, абаронцы духоўнасці і маральнасці жыцця. Уганараванне званнямі народнага паэта Беларусі (1973), Ганаровага акадэміка АН Беларусі (1994), Дзяржаўнай прэміяй СССР (1981), Дзяржаўнай прэміяй Беларусі імя Я. Купалы (1968), Літаратурнай прэміяй імя Я. Купалы (1959).

Звесткі з біяграфіі паэта.

Увасабленне ў зборніках “Упэўненасць” (1938) і “Вераснёвыя сцягі” (1940) тыповага настрою і пачуццяў тагачаснага маладога пакалення. Паэтызацыя працы, калгасных будняў, багатых ураджаяў, услаўленне поспехаў савецкага будаўніцтва як праява агульнай тэндэнцыі даваеннай паэзіі. Адметнасць самавыяўлення паэта ў лепшых вершах “Журавы”, “Восень”, “У навальніцу”, інш. Філасофскі алегарызм і падтэкставасць верша “Зубр”. Паэма “Беластоцкія вітрыны” (1940).

Удзел П. Панчанкі ў Вялікай Айчыннай вайне. Праца ў франтавым друку. Зборнікі “Дарога вайны” (1943) і “Далёкія станцыі” (1945) – споведзь пра зведанае, перажытае ў віхуры грознага ліхалецця. Трагедыйнае гучанне паэзіі ваеннага часу. Глыбіня выяўлення пачуццяў у вершах “Кожны з нас прыпасае Радзімы куток...”, “Сінія касачы”, “Будуць вечна сады расцвітаць...”, “Лес асенні глуха гудзе...”, інш. Героіка-драматычны пафас балады “Герой”. Адметнасць вершаванага цыкла “Іранскі дзённік” (1944–1945). Ідэйны змест і мастацкая своеасаблівасць паэмы “Маладосць у паходзе” (1945).

Творчая дзейнасць П. Панчанкі пасля дэмабілізацыі. Праца ў рэдакцыях “Вожыка”, “Літаратуры і мастацтва”, на пасадзе галоўнага рэдактара часопіса “Маладосць”. Выхад паэтычных зборнікаў “Гарачыя вятры” (1947), “Вершы” (1948), “Прысяга” (1949), “За шчасце, за мір!” (1950). Моцныя і слабыя бакі паэзіі П. Панчанкі пасляваеннага дзесяцігоддзя.

Другая палова 50-х–60-я гады – уздым творчасці П. Панчанкі. Творчая актыўнасць і грамадзянская мужнасць мастака. Паэма “Патрыятычная песня” (1957). Крытычная пераацэнка зробленага (“Анкета”). Выхад зборнікаў “Шырокі свет” (1955), “Кніга вандраванняў і любові” (1959), “Нью-Йоркскія малюнкі” (1960), “Тысяча небасхілаў” (1962), “Пры святле маланак” (1966), інш. Паэзія П. Панчанкі як “споведзь веку, прапушчаная праз уласнае сэрца”. ХХ стагоддзе ў адлюстраванні паэта: грамадскія падзеі, сацыяльныя праблемы, пошукі маральнага ідэалу. Асэнсаванне ваеннага мінулага ў вершах “Святочныя салюты”, “Франтавікі”, “Слова да паэтаў”, “У сорак першым”, інш. Спалучанасць у творах асабістага і грамадскага. Выяўленне пачуцця любові да Радзімы і роднай мовы, трывога за яе лёс (“Родная мова”). Спавядальны лірызм, тонкасць эстэтычных уражанняў у пейзажнай і інтымнай паэзіі (“Рабінавы гай”, “На Палессі восень...”, “Асеннімі дажджамі заліло...”, “Белыя яблыні”, “У акенца тваё”, інш.). Крытычнае стаўленне да рэчаіснасці, публіцыстычная завостранасць твораў. Выкрыццё негатыўных з’яў грамадскага жыцця. Сатырычныя вершы (“Прыстасаванцы”, “Трэснула, грукнула...”, інш.). Вера ў савецкія ідэалы – адметнасць таго часу, светапогляду паэта і яго пакалення.

Ідэйна-эстэтычныя набыткі П. Панчанкі ў 70-я– першай палове 80-х гадоў. Тэматычная і жанравая разнастайнасць зборнікаў “Снежань” (1972), “Крык сойкі” (1976), “Вячэрні цягнік” (1977), “Лясныя воблакі” (1985).

Заключны этап творчасці – з сярэдзіны 80-х. Спавядальнасць і шчырасць лірычнага героя ў кнігах “І вера, і вечнасць, і вернасць” (1986), “Горкі жолуд” (1988), “Высокі бераг” (1993). Кампазіцыйныя і мастацкія асаблівасці пасмяротна выдадзенага зборніка “Зямля ў мяне адна” (1996).

Грамадзянскае аблічча паэта: палымяны патрыятызм, праўдзівасць, бескампраміснасць у адстойванні нацыянальных і гуманістычных каштоўнасцей і інш. Зліццё публіцыстычнага і лірычнага пачаткаў, эмацыянальна-тэмпераментны стыль выказвання. Псіхалагічна змястоўнае раскрыццё духоўнага свету асобы. Маральна-этычныя, гуманістычныя абагульненні П. Панчанкі, афарыстычнасць паэтычнай думкі (“Той дзень прапаў...”, “Мала сказаць: ненавіджу...”, “Я аб дзецях, аб дзецях...”, інш.). Філасафізм паэзіі, развагі пра змест і сэнс чалавечага быцця (“Калі мы губляем час...”, інш.). Узвышана-рамантычнае захапленне прыгажосцю, паэтызацыя рэчаіснасці.

Матывы віны, дакору і пакаяння ў паэзіі другой паловы 80-х–90-я гады (“Паэма сораму і гневу”, “У стылі рок”, “Я цяжка захварэў: і грып, і запаленне...”, “Не сярдуйце, не крыўдуйце...”, інш.). Адкрытая публіцыстычная размова з сучаснікамі пра набалелае ў душы, пра надзённае і вечнае. Прароцтвы і папярэджанні пра небяспеку маральнай

дэградацыі грамадства (“Чорныя дзіркі”, “Не раз мы пад крывавымі сцягамі...”, інш.). Развагі пра адраджэнне чалавечага ў чалавеку, пра жыццё, вартае памяці тых, хто загінуў на вайне. Думкі пра родную мову, бацькоўскую зямлю, працу, захаванне традыцый народнай этыкі і маралі (“Беларуская мова”, “Не адцураюся, не адракуся”, Зямля ў мяне адна”, “Развітанне”, інш.).

П. Панчанка як паэт-філосаф. Экзістэнцыяльныя матывы ў яго паэзіі. Непрыманне абсурду рэчаіснасці, бездухоўнасці, разуменне трагічнасці чалавечага быцця. Эвалюцыя поглядаў на прыроду: ад эстэтызацыі пейзажу да натурфіласофскага светапазнання (“Азону просім мы... Азону”, “Не люблю я слова “пакарыцель”...”, “Лясы і рэкі”, “Лясныя воблакі”, “Сармацкае кадзіла”, “Ветрана і золка...”, “Мы пільней пазіраем на рэкі...”, “Змоўкнуў жураўліны скрып калысак...”, інш.). Узмацненне трагедыйнасці гучання вершаў на экалагічную тэматыку пасля чарнобыльскай катастрофы.

Уплыў П. Панчанкі на творчасць сучасных паэтаў (Г. Бураўкіна, С. Законнікава, С. Панізніка, інш.).

Творчасць паэта ў крытыцы і літаратуразнаўстве.

## ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ
### **Творчыя набыткі Пімена Панчанкі**

1. Штрыхі да партрэта пісьменніка.
2. Вершаваны калейдаскоп.
3. Абмеркаванне пытанняў:

3.1 Вызначце асноўныя этапы творчасці паэта. Чым яны абумоўлены? Каго з паэтаў-папярэднікаў П. Панчанка лічыў сваімі літаратурнымі настаўнікамі?

3.2 Якім настроем і якімі пачуццямі прасякнуты першыя зборнікі “Упэўненасць” і “Вераснёвыя сцягі”? Прасачыце адметнасць самавыяўлення паэта ў лепшых вершах гэтага перыяду.

3.3 Што дало падставы У. Гніламёдаву назваць разнастайнай “літаратурную прадукцыю” П. Панчанкі ваеннага часу?

3.4 Якімі сродкамі мастацкай выразнасці паэт дасягае глыбіні выяўлення чалавечых пачуццяў у вершах “Кожны з нас прыпасае Радзімы куток...”, “Сінія касачы”, “Будуць вечна сады расцвітаць...”, “Толькі лісцем рабін шалахні...”, “Герой”, інш.?

3.5 На якой падставе вершаваны цыкл “Іранскі дзённік” даследчыкамі аднесены да выдатных з’яў беларускай літаратуры? Адказ абгрунтуйце.

3.6 Якую ацэнку ў крытыцы і літаратуразнаўстве атрымала творчасць П. Панчанкі пасляваеннага дзесяцігоддзя?

3.7 Дайце характарыстыку творчым дасягненням паэта перыяду “адлігі”. Што дае падставы гаварыць пра творчы ўздым П. Панчанкі ў другой палове 50-х–60-я гадоў? Адказ падмацуйце аналізам кніг паэзіі.
3.8 Якое месца ў творчасці паэта займаюць вершы сатырычнай накіраванасці? Прааналізуйце іх.
3.9 Чым цікавы П. Панчанка як аўтар інтымнай лірыкі? Адказ абгрунтуйце.
3.10 Ці дае творчасць паэта падставы для таго, каб гаварыць пра “эвалюцыю поглядаў на прыроду: ад эстэтызацыі пейзажу да натурфіласофскага светапазнання” (А. Бельскі)? Адказ абгрунтуйце.
3.11 Якія матывы пераважалі на заключным этапе творчасці паэта? Адказ падмацуйце прыкладамі.
3.12 Паразважайце, ці дасягнуў творчага поспеху П. Панчанка ў паэмным жанры (“Беластоцкія вітрыны”, “Іспанская ноч”, “Маладосць у паходзе”, “Патрыятычная песня”, “Паэма сораму і гневу”).
3.13 Падрыхтуйце паведамленне “Уплыў П. Панчанкі на творчасць сучасных паэтаў”.

4 У школьную праграму **для вывучэння** ўнесены: у 6 кл. “Сармацкае кадзіла”; у 10 кл. “Краіна мая”, “Родная мова”, “Толькі лісцем рабін шалахні...”, “Крык сойкі”, “Той дзень прапаў і страчаны навекі...”, “Спарышы”, “І вера, і вернасць, і вечнасць...”; 10 п.у. дадаюцца “Коні”, “Прыстасаванцы”, “Размова з наследнікамі”, “Беларуская мова”; у 12 п.у. “Зубр”, “Курганы”, “Я ўсё пераблытаў...”, “Белыя яблыні”, “Калі мы губляем час”, “Ля жыта”, “Тапаліны звон”, “Аб самым смачным...”, “Зямля ў мяне адна”. **Для чытання і абмеркавання:** у 6 кл. “Вясёлай маланкаю ластаўка бліскае...”; у 10 п.у. “Маё і тваё маленства”, “Бульба”, “Франтавік”, “Паэма сораму і гневу”, “Беларускім настаўніцам”; у 12 п.у. вершы са зборнікаў “Горкі жолуд”, “Зямля ў мяне адна”.

Вызначце, да якога перыяду творчасці паэта гэтыя творы належаць, і аналізуйце іх пры адказе на вышэй прапанаваныя пытанні.

5 **Для самастойнага чытання** на выбар настаўніка прапануюцца вершы “Жуpавы”, “Герой”, “Сінія касачы”, “Беларусі”, “На Палессі восень...”, “Прырода на дзіва праўдзіва...”, “Рабінавы гай”, “Вячэрні цягнік”, “Лясныя воблакі”.

Якія з іх вы будзеце рэкамендаваць вучням і чаму?

6 Вывучце на памяць адзін з вершаў са школьнай праграмы (верш на выбар, “Краіна мая...”, “Беларуская мова”).

**КРЫНІЦЫ:** Панчанка, П. Збор твораў : у 4 т. / П. Панчанка. – Мінск : Маст. літ., 1981–1983.

Панчанка, П. Выбранае : Вершы, паэмы / П. Панчанка ; прадм. Р. Барадуліна. – Мінск : Маст. літ., 1993. – 542 с.

Панчанка, П. Высокі бераг : Вершы, эсэ / П. Панчанка. – Мінск : Маст. літ., 1993. – 239 с.

Панчанка, П. Горкі жолуд : Вершы / П. Панчанка. – Мінск : Маст. літ., 1988. – 63 с.

Панчанка, П. Думаю, думаю... Дзённікі (1989–1993) / П. Панчанка // Полымя. – 1998. – № 9. – С. 125–156.

Панчанка, П. Жытнёвы звон : Выбранае / П. Панчанка ; уклад. З. Панчанкі. – Мінск : Маст. літ., 2002. – 334 с.

Панчанка, П. Зямля ў мяне адна : Паэзія розных гадоў / П. Панчанка. – Мінск : Маст. літ., 1996. – 158 с.

**ЛІТАРАТУРА:** Беларускія пісьменнікі : Бібліягр. слоўн. : у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы; рэдкал.: І. Багдановіч [і інш.]. – Мінск : “Беларус. энцыкл.”, 1992– 1995. – Т. 4. : Лазарук – Перкін. – 1994. – С. 455–473.

Гніламёдаў, У. Пімен Панчанка / У. Гніламёдаў // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2-е выд. Мінск : Беларус. навука, 2001–2002. – Т. 3. – 2002. – С. 521–573.

Шпакоўскі, І. Самаўдасканаленне. Ідэйна-стылявая эвалюцыя паэзіі П. Панчанкі / І. Шпакоўскі // Беларуская літаратура ХХ стагоддзя : Вучэб. дап. для студ. філалаг. спец. ВНУ / М. Мішчанчук, І. Шпакоўскі. – Мінск, 2001. – С. 315–323.

**ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА:** Алейнік, Л. “Пакуль сонца не згасне, пакуль свецяцца зоры...” / Л. Алейнік // Полымя. – 2007. – № 8. – С. 171–176.

Бечык, В. Хвалявацца за ўсіх і ўсё... / В. Бечык // Прад высокаю красою...: Літ.-крыт. артыкулы / В. Бечык. – Мінск, 1984. – С. 39–66.

Бугаёў, Д. З няпраўдай бой... / Д. Бугаёў // Арганічнасць таленту : Літ.-крыт. артыкулы / Д. Бугаёў. – Мінск, 1989. – С. 235–255.

Быкаў, В. Паэзія дабрыні і мужнасці / В. Быкаў // Праўдай адзінай : Літ. крытыка, публіцыстыка, інтэрв’ю / В. Быкаў. – Мінск, 1984. – С. 199–203.

Бярозкін, Р. Пімен Панчанка : Крытыка-біяграфічны нарыс / Р. Бярозкін. – Мінск : Беларусь, 1968. – 231 с.

Ламека, Л. Паэзія М. Танка, П. Панчанкі, А. Разанава ў кантэксце эстэтычных і духоўных набыткаў сусветнай літаратуры / Л. Ламека, Н. Ламека // Сучасная беларуская літаратура : аналіз твораў : Матэрыялы да экзаменаў / Л. Ламека, Н. Ламека. – Мінск, 2003. – С. 13–41.

Пімен Панчанка = Пимен Панченко / Аўт. тэксту М. Стральцоў. – Мінск : Беларусь, 1987. – 72 с.

## **ЛАРЫСА ГЕНІЮШ (1910–1983)** – 2 г. практ.

Эміграцкі і савецкі перыяды жыцця паэткі. Трагізм лёсу. Пачатак творчай дзейнасці (1935, у друку з 1939 г. у эміграцкіх выданнях). Актыўны ўдзел у жыцці беларускай эміграцыі ў Празе. Туга па родным краі, інтымная і пейзажная лірыка ў першым зборніку “Ад родных ніў” (1942, Прага).

Выхад кніг паэзіі на Радзіме “Невадам з Нёмана” (1967) і “На чабары настоена” (1982). Страсны патрыятызм, захапленне айчыннай гісторыяй, клопат пра духоўную спадчыну свайго народа, пераемнасць традыцый, еднасць чалавека з прыродай – асноўныя матывы творчасці. Фальклорна-песенныя матывы. Паэма “Куфар” (1965) – гімн чалавеку-працаўніку. Ідэя духоўна-эстэтычнай пераемнасці пакаленняў. Працяг тэмы ў паэме “Маёй бабусі” (1989). Паэма “Даўніна” (1990). Нізкі лагерных вершаў (вершы-набаты, крык душы).

Пасмяротныя выданні. Аднатомнік выбранай паэзіі “Белы сон” (1990). Аўтабіяграфічная кніга ўспамінаў “Споведзь” (1990, асобнае выданне – 1993) як сведчанне пра сябе, перажытае і эпоху. Грамадзянскі патрыятызм і бескампраміснасць аўтаркі.

Творы Л. Геніюш для дзяцей (“Казкі для Міхаські”, 1972; “Добрай раніцы, Алесь”, 1976). Кніга “Каб вы ведалі: З эпісталярнай спадчыны (1945–1983)” (2005) як своеасаблівы працяг “Споведзі”.

### ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ
### **Непаўторны талент Ларысы Геніюш**

1. Штрыхі да партрэта пісьменніцы.
2. Вершаваны калейдаскоп.
3. Абмеркаванне пытанняў:

3.1 Чаму Л. Геніюш лічыцца паэткай трагічнага лёсу? Якія з яе твораў з’яўляюцца найбольш аўтабіяграфічнымі?

3.2 Вызначце асноўныя этапы творчасці Л. Геніюш.

3.3 Раскажыце пра “шчаслівы на творчы плён” (М. Арочка) зельвенскі перыяд (1934–1937) Л. Геніюш. Вызначце адзнакі сталення таленту і адметнасць стылю паэткі ў вершах “Тры дарогі”, “За прасніцай”, “Дываны”, “Дзявочае сэрца”, “Вячэрняя містэрыя”, інш.

3.4 Дзе і калі быў надрукаваны першы зборнік Л. Геніюш? Каму ён прысвячаецца? З якіх раздзелаў складаецца? Паразважайце, ці толькі ў назве зборніка чуецца Багдановічава “Ад родных ніў”. Як называе паэтка Радзіму, чаму не ўжывае назву Беларусь? У якіх вершах плённа

выкарыстаны фальклорныя традыцыі, чым яны ўзбагацілі паэтычны свет Л. Геніюш?

3.5 Які першы зборнік паэткі ўбачыў свет на Беларусі? Як разумееце яго назву? Зборнік "Невадам з Нёмана" ў многім дубляваў зборнік "Ад родных ніў". Якімі творамі было папоўнена беларускае выданне?

3.6 Вызначце ідэйны змест і мастацкія асаблівасці паэмы "Куфар".

3.7 Якая тэма з "Куфара" знайшла працяг ў паэме "Маёй бабусі"?

3.8 З якіх раздзелаў складаецца зборнік "На чабары настоена"? Паразважайце, чаму не ўвайшлі у зборнік вершы лагернай тэматыкі. Якую галоўную вартасць вершаў Л. Геніюш вылучыла аўтарка прадмовы да зборніка "На чабары настоена" Д. Бічэль–Загнетава? Што дало ёй падставы назваць паэтку "ткалляй наватарскіх метафар і перыфраз"? Адказ падмацуйце прыкладамі.

3.9 У чым бачыла сваё прызначэнне паэтка ў лагерных умовах? Ахарактарызуйце вершы адпаведнай тэматыкі.

3.10 Прааналізуйце вершы Л. Геніюш, у якіх праглядваецца ідэя беларускага шляху. Для чаго паэтка звяртаецца да паказу вобразаў гістарычных асоб? Чым паказальна ў гэтым плане паэма "Даўніна"? Як разумееце сэнс яе заключных радкоў?

3.11 Раскрыйце духоўнае аблічча скразной гераіні Л. Геніюш.

3.12 Вызначце месца ў беларускай літаратуры "Споведзі" Л. Геніюш. Параўнайце гэты твор з аповесцю Ф. Аляхновіча "У кіпцюрах ГПУ", А. Салжаніцына "Архіпелаг Гулаг", інш.

3.13 Выкажыце свае ўражанні пра кнігу Л. Геніюш "Каб вы ведалі: З эпісталярнай спадчыны (1945–1983)".

3.14 Чым вызначаюцца творы для дзяцей са зборнікаў "Казкі для Міхаські" і "Добрай раніцы, Алесь"? Як яны характарызуюць паэтку?

3.15 Што ведаеце пра сына паэткі Юрку і мужа Янку Геніюшаў?

4 Паразважайце, чаму мэтазгодна вывучаць творы Л. Геніюш у школе.

5 Вызначце месца пісьменніцы ў беларускай літаратуры.

**КРЫНІЦЫ:** Геніюш, Л. Белы сон : Вершы і паэмы / Л. Геніюш. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 351 с.

Геніюш, Л. Выбраныя творы / Л. Геніюш ; уклад., прадм. і камент. М. Скоблы. – Мінск : Бел. кнігазбор, 2000. – 602 с.

Геніюш, Л. Гасціна : Выбранае / Л. Геніюш ; уклад. З. Пазняк. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 382 с.

Геніюш, Л. Каб вы ведалі : З эпісталярнай спадчыны (1945–1983) / Л. Геніюш ; уклад., прадм. М. Скоблы. – Мінск : Лімарыус, 2005. – 447 с.

Геніюш, Л. Споведзь / Л. Геніюш ; падрыхт. тэксту, прадм., камент. М. Чарняўскага. – Мінск : Маст. літ., 1993. – 271 с.

**ЛІТАРАТУРА:** Арочка, М. Ларыса Геніюш / М. Арочка // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2-е выд. Мінск : Беларус. навука, 2001–2002. – Т. 4. Кн. 2. – 2002. – С. 521–573.

Беларускія пісьменнікі : Бібліягр. слоўн. : у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы ; рэдкал.: І. Багдановіч [і інш.]. – Мінск : "Беларус. энцыкл.", 1992–1995. – Т. 2. : Верабей – Іваноў. – 1993. – С. 173–175.

Мішчанчук, М. "Як жыць – дык жыць для Беларусі..." Штрыхі да партрэта Ларысы Геніюш / М. Мішчанчук // Як жыць – дык жыць для Беларусі / М. Мішчанчук. – Мінск, 1995. – С. 27–47.

Сачанка, Б. Мудрасць продкаў у гарачай крыві... / Б. Сачанка // Сняцца сны аб Беларусі. Літ.-крыт. артыкулы, інтэрв'ю / Б. Сачанка. – Мінск, 1990. – С. 291–294.

**ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА:** Гучок, Я. "Хто сэрцам і думкай жыве ўгары" / Я. Гучок // Роднае слова. – 2000. – № 11. – С. 98.

Жук, А. Одна в белой хате / А. Жук // Нёман. – 2000. – № 12. – С. 7–12.

Лабовіч, А. Дзядзька Янка з мястэчка Крынкі / А. Лабовіч // Наша слова. – 2006. – 22 лют. – С. 8 (пра мужа Л. Геніюш).

Маркушевский, Д. Дело Ларисы Гениюш / Д. Маркушевский // Беларус. час. – 2002. – 25 студз. – С. 12 (о пересмотре уголовного дела поэтессы).

Пяткевіч, А. "На душах нашых – сьлед ланцуга" / А. Пяткевіч // Дзеяслоў. – 2005. – № 1. – С. 186–201.

Рогач, Л. Край курганоў / Л. Рогач // Наша слова. – 2004. – № 28. – С. 8.

Чыгрын, С. Эпісталярны раман Л. Геніюш / С. Чыгрын // Наша слова. – 2005. – 3 жн. – С. 1, 3. – Рэц. на кн. : Геніюш, Л. Каб вы ведалі : З эпісталярнай спадчыны (1945–1983) / Л. Геніюш ; уклад., прадм. М. Скоблы. – Мінск : Лімарыус, 2005. – 447 с.

Юрка Геніюш // Беларускія пісьменнікі Польшчы. Другая палова ХХ ст. / Уклад. Я. Чыквіна. – Мінск : Бел. кнігазбор, 2000. – С. 361.

## ЯНКА БРЫЛЬ (1917–2006) – 6 г. лекц., 4 г. практ.

Значэнне творчасці Я. Брыля для гісторыі беларускай літаратуры, для развіцця лірычнай плыні ў шматнацыянальнай савецкай прозе. Шырокая вядомасць пісьменніка, высокая ацэнка яго таленту і творчай дзейнасці: уганараванне званнем народнага пісьменніка Беларусі (1981), Дзяржаўнай прэміяй СССР (1952), Літаратурнай прэміяй імя Я. Коласа (1963), Дзяржаўнай прэміяй БССР імя Я. Коласа (1982).

Звесткі з біяграфіі. Роля беларускай, рускай, польскай літаратур у выпрацоўцы эстэтычных крытэрыяў асобы, у авалоданні культурай творчасці. Станаўленне творчай індывідуальнасці.

Тыповасць, псіхалагічная грунтоўнасць і агульная мастацкая выразнасць нацыянальных характараў у ранняй прозе Я. Брыля, асаблівасці яе лірызму (“Сёння “дзяды”!”, 1935–1937; “Проста і ясна”, 1936–1937; “Як маленькі”, 1937; інш.).

Заходнебеларуская тэма як адна з вядучых у творчасці пісьменніка. Даследаванне празаікам сацыяльнай глебы, маралі і псіхалогіі ўласніцтва, паказ здаровых народных сіл, якія супрацьстаяць чэрстваму эгаізму (“Марыля”, 1937–1943; “Праведнікі і зладзеі”, 1938–1956; інш.). Складанасць становішча беларусаў пад уладай Польшчы ў аповесцях “Сірочы хлеб” (1942–1956), “У сям’і” (1943–1955). Паказ калектывізацыі ў аповесці “У Забалоцці днее” (1949–1952). Шырокая і пераканальная карціна жыцця і барацьбы заходнебеларускага народа ў рамане “Граніца” (1947–1949). Асаблівасці партызанскага руху ў заходніх раёнах Беларусі (“Мой зямляк”, 1945; “Адзін дзень”, 1946; “Зялёная школа”).

Германія на мяжы 30–40-х гадоў вачыма ваеннапалоннага беларуса ў аповесцях “Сонца праз хмары” (1942–1943) і “Жывое і гніль” (1941–1944).

Другі перыяд творчасці Я. Брыля (1945–1961). Выпрабаванне пісьменніка новымі ўмовамі грамадскага і літаратурнага жыцця. Выхад першага зборніка “Апавяданні” (1946). Наватарскі ўклад Я. Брыля ў развіццё беларускага апавядання і аповесці. Праблема свабоднага выяўлення і самасцвярджэння чалавечай асобы.

Партызанская барацьба супраць фашызму ў кнізе “Нёманскія казакі” (1947). Тэма народнага подзвігу ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў апавяданнях Я. Брыля (“Казачок”, 1946; “Сцежка-дарожка”, 1961; “Глядзіце на траву”, “Апоўначы”, абодва – 1966; інш.). Абвостранасць гуманістычнай думкі, шырокае разуменне народнага гераізму, уменне бачыць гераічнае ў звычайным, тонкая псіхалагічная вывераназсць і шматпланавасць дзеянняў герояў, насычанасць апавяданняў аб вайне грамадска-сацыяльным і маральна-этычным зместам. Выкрыццё антычалавечай філасофіі фашызму (“Memento mori”, 1958; “Ты мой найлепшы друг”, 1941–1951; “Дваццаць”, 1958; “Маці”, 1957; інш.).

Лірызм і псіхалагізм як важнейшыя рысы твораў Я. Брыля (“Галя”, 1953). Сатырычныя апавяданні “Прывал” і “Субардынацыя” (1955). Нарысы Я. Брыля.

Устойлівая тэндэнцыя да цыклізацыі твораў у 50-я гады (“Ты мой найлепшы друг”, інш.) як новы мастацкі эксперымент і як яшчэ адзін шлях да асваення буйной празаічнай формы. Плённая праца ў жанры аповесці. Шліфоўка тэкстаў “У сям’і”, “Сірочы хлеб”, завяршэнне “У Забалоцці

днее”, напісанне “На Быстранцы” (1953–1955), “Апошняя сустрэча” (1958–1959). Аповесці 50-х – водгук аўтара на падзеі бягучага дня. З’яўленне ў іх новага тыпу героя – інтэлектуальнай, інтэлегентнай асобы.

Мяжа 50–60-х гадоў – час пераацэнкі пісьменнікам пройдзенага шляху. Задума твора вялікай эпічнай формы. Раман “Птушкі і гнёзды” (1963) як альтэрнатыва канонам сацрэалізму. Ацэнка твора і яго жанравае вызначэнне ў тагачаснай і сучаснай крытыцы.

Першая падборка лірычных мініяцюр “Рамонкавы россып” (1964). Кніга “Жменя сонечных промняў. Лірычныя нататкі” (1965). Брылёўскія мініяцюры – новая старонка як у творчасці самога мастака, так і ва ўсёй беларускай літаратуры. Аб’яднанне лірычных нататкаў па праблемна-тэматычным прынцыпе: “Пра галоўнае” (вечныя пытанні, філасофскі роздум), “Адкуль паэзія” (свет дзяцінства), “Нібыта432 рознае” (драбніцы жыцця, над якімі варта задумацца), “Служэнне” (літаратурныя клопаты). Рубрыка “Свае старонкі” з падзагалоўкам “да творчай аўтабіяграфіі”. Жанрава мадэфікаваныя творы на мяжы апавядання і мініяцюры (“Полымя”, “Калыска”, “Іваны” , 1975), творы ў зборніках “Сёння і памяць” (1985), “На сцежцы – дзеці” (1988), “Пішу, як жыву” (1994). Шматтэмнасць лірычных запісаў і мініяцюр з кніг “Вячэрняе” (1994), ”Дзе скарб ваш” (1997), “Сцежкі, дарогі, прастор” (2001), “З людзьмі і сам-насам” (2003), “Блакітны зніч” (2004), інш.

Стварэнне ў сааўтарстве з А. Адамовічам і У. Калеснікам дакументальнай кнігі “Я з вогненай вёскі...” (1970–1973).

Стыхія народнага жыцця ў аповесці “Ніжнія Байдуны” (1975). “Золак, убачаны здалёк” (1978) – лірыка-філасофская аповесць пра дзяцінства і лёс пакалення, якое гадавалася і сталела паміж дзвюма сусветнымі войнамі.

Аўтабіяграфічная аповесць “Муштук і папка” (1990).

Шматграннасць творчай індывідуальнасці Я. Брыля. Асаблівасці мастацкага мыслення ў дзённікавых запісах, іх месца ў творчай біяграфіі аўтара і ў гісторыі беларускай літаратуры. Нарысавыя творы Я. Брыля (“Партрэт старэйшага таварыша”, інш.). Творы для дзяцей. Праца Брыля як перакладчыка польскай, рускай, украінскай і іншых літаратур. Пераклады твораў на замежныя мовы.

Творчасць Я. Брыля ў славянскім і сусветным літаратурным кантэксце (А. Чэхаў, Л. Талстой, І. Тургенеў, М. Прышвін, Э. Хемінгуэй, Т. Ман, інш.). Уплыў творчасці пісьменніка і яго асобы на сучасны літаратурны працэс.

## ПЕРШЫЯ ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ
## **Станаўленне творчай індывідуальнасці Янкі Брыля**

1. Штрыхі да партрэта пісьменніка.
2. Абмеркаванне пытанняў:
2.1 Вызначце асноўныя этапы творчасці пісьменніка.
2.2 Паразважайце, на якой падставе заходнебеларуская тэма лічыцца адной з вядучых у творчасці Я. Брыля.
2.3 Вызначце цэнтральную праблему аповесці “Сірочы хлеб”. Які сэнс уклаў пісьменнік у назву? Да якіх развагаў аб прызначэнні настаўніка, яго ролі ў выхаванні дзіцяці кліча твор?
2.4 Які новы аспект у праблему фарміравання асобы ўносіць Я. Брыль у аповесці “У сям’і”?
2.5 Акрэсліце майстэрства Брыля-апавядальніка ў творах для дзяцей (“Ветэрынар”, “Цюцік”, інш.). Як яны характарызуюць пісьменніка?
2.6 Пастаўце брылёўскія творы пра Вялікую Айчынную вайну ў кантэкст беларускай ваеннай прозы (М. Лынькоў, К. Чорны, інш.). Раскрыйце гуманістычны пафас твораў ваеннай тэматыкі. У якім з іх пісьменнік упершыню ўвёў вобраз птушак і гнёздаў?
2.7 Якім чынам на творы Я. Брыля паўплывалі савецкая ідэалогія і “тэорыя бесканфліктнасці”? Адказ аргументуйце.
2.8 Акрэсліце ўклад Я. Брыля ў развіцці жанра аповесці. Якія з іх цікавыя і сённешняму чытачу? Чаму?
2.9 Вызначце ідэйную накіраванасць, праблематыку аповесці “У Забалоцці днее”. Раскрыйце духоўны воблік Васіля Сурмака. Паразважайце, што магло даць аўтару падставы гаварыць: “Пра Забалоцце ўжо думаю з болем і агідай”.
2.10 Акрэсліце грамадзянскую пазіцыю пісьменніка пры аналізе негатыўных з’яў жыцця ў аповесці “На Быстранцы”. Якую ролю ў пазітыўнай перабудове грамадства ўскладваў аўтар на інтэлігенцыю? Звярніце ўвагу на спалучэнне ў аповесці публіцыстычнага і лірычнага стылёвых пачаткаў.
2.11 Які новы (адносна часу напісання) ваенны матэрыял Я. Брыль уводзіць у аповесць “Апошняя сустрэча”? Якія маральна-этычныя праблемы закранаюцца ў творы? Раскрыйце пазіцыю пісьменніка па праблеме кахання, сям’і. Асэнсуйце вобраз “раскіданага гнязда” ў аповесці.
2.12 Чым сярод іншых брылёўскіх аповесцяў вылучаюцца “Ніжнія Байдуны”? Вызначце ролю лірычных адступленняў і аўтарскага каментару, назавіце сродкі стварэння камізму ў творы.

3 У школе **вывучаюцца:** у 5 кл. “Над зямлёй – красавіцкае неба”; у 7 кл. “Сірочы хлеб”; у 10 п.у. “Memento mori”, “Надпіс на зрубе”; у 12 кл. “Memento mori”; у 12 п.у. аповесць “Ніжнія Байдуны”. **Для чытання і абмеркавання** рэкамендуецца ў 6 кл. апавяданне “Ветэрынар”.

Вызначце, да якога перыяду творчасці пісьменніка гэтыя творы належаць, і аналізуйце іх пры адказе на вышэй прапанаваныя пытанні.

4 У прыкладных спісах **для пазакласнага чытання** пазначаны: “Цюцік”, “Маці”, “Жук”, кніга “Я з вогненай вёскі” (у сааўтарстве з А. Адамовічам і У. Калеснікам).

Чым будуць цікавымі школьнікам гэтыя творы? Адказ абгрунтуйце.

## ДРУГІЯ ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ
## **Янка Брыль – майстар лірычнай прозы**

1. Абмеркаванне пытанняў:

1.1 Згадайце, чым вызначаецца лірычная проза сярод іншых празаічных жанраў. Размяжуйце паняцці “адкрыты” і “схаваны” лірызм.

1.2 Паводле напрацовак сучаснага літаратуразнаўства (У. Калеснік, Г. Кісліцына, інш.) дайце азначэнне абразка, лірычнай мініяцюры як жанраў малой прозы.

1.3 Акрэсліце элементы лірычнай прозы ў ранніх творах Я.Брыля (“Сёння “дзяды”!”, “Проста і ясна”, “Як маленькі”, “Цюцік”, “Праведнікі і зладзеі”, “Сірочы хлеб”, “У сям’і”, інш.). Якія з іх утрымліваюць прыкметы “адкрытага” лірызму, а якія “схаванага”?

1.4 Вызначце мастацкія асаблівасці апавядання “Галя”. Якімі сродкамі стварае аўтар лірычную танальнасць у творы? Якая роля ў раскрыцці пачуццяў гераіні належыць пейзажным малюнкам? Паразважайце, ці сапраўды няшчасная брылёўская Галя. Што ў паняцце шчасця ўкладвае пісьменнік?

1.5 Як і чаму аднеслася тагачасная крытыка да рамана “Птушкі і гнёзды”? Што дало падставы даследчыкам назваць гэты твор альтэрнатывай канонам сацрэалізму? Згадайце разнастайныя жанравыя вызначэнні рамана ў крытыцы. Да меркаванняў каго з даследчыкаў схіляецеся вы і чаму? Раскажыце пра творчую гісторыю рамана, яго аўтабіяграфічныя элементы, сюжэтна-кампазіцыйную структуру. Паразважайце пра мастацкае асэнсаванне тэмы Радзімы ў творы. Ахарактарызуйце вобраз Алеся Руневіча і ягоны шлях да святла. У чым праявілася наватарскае даследаванне Я. Брылём чалавеканенавісніцкай ідэалогіі фашызму? Якія прыёмы і сродкі тыпізацыі нацыянальных характараў выкарыстаў пісьменнік?

1.6 У якой з аповесцяў найбольш выявіўся лірычны талент Я. Брыля? У чым заключаецца філасофскі змест твора? Згадайце развагі лірычнага героя пра адвечную барацьбу Дабра і Зла ў Сусвеце.
1.7 Дзеля чаго Я. Брыль напісаў аповесць “Мштук і папка”? Дакажыце, што яна з’яўляецца “самым адкрыта аўтабіяграфічным сярод буйных твораў” (В. Нікіфарава) пісьменніка.
1.8 Што можна сказаць пра Я. Брыля як аўтара шматлікіх зборнікаў лірычных запісаў і мініяцюр? Занатуйце сабе самыя цікавыя з іх.
1.9 Як вы разумееце паняцце “стыль пісьменніка”? У чым адметнасць стылю Я. Брыля?
2. Падрыхтуйце паведамленне “Дзённікавыя запісы Я. Брыля, іх месца ў творчай біяграфіі аўтара і ў гісторыі беларускай літаратуры”.
3. У школе **вывучаюцца:** у 10 п.у. “Галя”, мініяцюра “Трохі пра вечнае”, аповесць “Муштук і папка”; у 12 кл. “Галя”, мініяцюра “Трохі пра вечнае”. **Для чытання і абмеркавання** рэкамендуюцца: у 10 п.у. мініяцюры з раздзелаў “Адкуль паэзія” і “Абы на здароўе” з кнігі “Трохі пра вечнае”, мініяцюра “Загадка”; у 12 кл. “Муштук і папка”; у 12 п.у. раман “Птушкі і гнёзды”, лірычныя мініяцюры са зборнікаў “Жменя сонечных промняў”, “Вітраж”, “Вячэрняе”.

   Вызначце, да якога перыяду творчасці пісьменніка гэтыя творы належаць, і аналізуйце іх пры адказе на вышэй прапанаваныя пытанні.
4. **Для пазакласнага чытання** пазначаны зборнікі “З людзьмі і сам-насам”, “Пішу як жыву”, “Сцежкі, дарогі, прастор”.

   На ўроках пазакласнага чытання сярод твораў іншых пісьменнікаў ці аддасце вы перавагу гэтым кнігам Я. Брыля? Чаму?

**КРЫНІЦЫ:** Брыль, Я. Выбраныя творы : у 3 т. / Я. Брыль. – Мінск : Маст. літ., 1992–1993.

Брыль, Я. Збор твораў : у 5 т. / Я. Брыль. – Мінск : Маст. літ., 1979–1981.

Брыль, Я. Блакітны зніч : Лірычнае / Я. Брыль. – Мінск : Про Хрысто, 2004. – 89 с.

Брыль, Я. Вячэрняе : Лірычныя запісы і мініяцюры / Я. Брыль. – Мінск : Маст. літ., 1994. – 350 с.

Брыль, Я. Дзе скарб ваш : Лірычная проза / Я. Брыль ; афармл. М. Казлова. – Мінск : Маст. літ., 1997. – 333 с.

Брыль, Я. Запаветнае : Выбраныя творы / Я. Брыль ; прадм. С. Андраюка, камент. Н. Семашкевіч. – Мінск : Беллітфонд, 1999. – 442 с.

Брыль, Я. З людзьмі і сам-насам : Запісы, мініяцюры, эсэ / Я. Брыль. – Мінск : Маст. літ., 2003. – 334 с.

Брыль, Я. На сцежцы – дзеці : Апавяданні, мініяцюры, эсэ / Я. Брыль. – Мінск : Маст. літ., 1988. – 205 с.

Брыль, Я. Парастак : Запісы і эсэ / Я.Брыль. – Мінск : Про Хрысто, 2006. – 103 с.

Брыль, Я. Пішу як жыву : Аповесць, апавяданні, мініяцюры, эсэ / Я. Брыль. – Мінск : Маст. літ., 1994. – 363 с.

Брыль, Я. Птушкі і гнёзды : Выбранае / Я. Брыль. – Мінск : Маст. літ., 2006. – 461 с.

Брыль, Я. Сцежкі, дарогі, прастор : Лірычныя замалёўкі / Я. Брыль. – Мінск : Юнацтва, 2001. – 238 с.

Брыль, Я. Трохі пра вечнае : Артыкулы, лірычныя нататкі, эсэ / Я. Брыль. – Мінск : Маст. літ., 1978. – 358 с.

**ЛІТАРАТУРА:** Беларускія пісьменнікі : Бібліягр. слоўн. : у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы ; рэдкал.: І. Багдановіч [і інш.]. – Мінск : “Беларус. энцыкл.”, 1992– 1995. – Т. 1. : Абуховіч – Ватацы. – 1992. – С. 351–368.

Калеснік, У. Янка Брыль : Нарыс жыцця і творчасці / У. Калеснік. – Мінск : Нар. асвета, 1990. – 254 с.

Канэ, Ю. Як паветра і хлеб : Жыццёвы і творчы шлях Янкі Брыля / Ю. Канэ. – Мінск : Маст. літ., 1988. – 320 с.

Нікіфарава, В. Янка Брыль / В. Нікіфарава // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2-е выд. Мінск : Беларус. навука, 2001–2002. – Т. 3. – 2002. – С. 479–520.

**ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА:** Андраюк, С. Трагічныя старонкі сямейнай сагі / С. Андраюк // Роднае слова. – 2005. – № 1. – С. 41.

Бугаёў, Д. Выпушчаныя на свабоду : Пра публікацыю брылёўскіх мініяцюр / Д. Бугаёў // Роднае слова. – 1995. – № 8. – С. 21–24.

Бугаёў, Д. Служэнне Беларусі / Д. Бугаёў // Спавядальнае слова : Літар. крытыка, успаміны / Д. Бугаёў. – Мінск, 2001. С. 28–57.

Кісліцына, Г. Лірычная мініяцюра як жанр беларускай літаратуры / Г. Кісліцына. – Мінск : Бел. навука, 2000. – 118 с.

Колесник, В. Интервью, длиною в сорок лет (Несколько секретов мастерства Я. Брыля) / В. Колесник // Нёман. – 1997. – № 7. – С. 218.

Ляшук, В. Вывучэнне творчасці Янкі Брыля ў школе / В. Ляшук. – Мінск : Аверсэв, 2004. – 220 с.

Навумовіч, У. Нацыянальны характар беларуса ў аповесцях Янкі Брыля / У. Навумовіч // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 4. Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – 2006. – № 2. – С. 68–72.

Стрельцов, М. И школа, и традиция. / М. Стрельцов // Нёман. – 1987. – № 7. – С. 145–146.

Трафімчык, А. Жыццё. Літаратура. Боль. / А. Трафімчык // Полымя. – 2004. – № 7. – С. 212. – Рэц. на кн. : Брыль, Я. З людзьмі і сам-насам : Запісы, мініяцюры, эсэ / Я. Брыль. – Мінск : Маст. літ., 2003. – 334 с.

Тычка, Г. Дарагі падарунак / Г. Тычка // Наша вера. – 2006. – № 3. – С. 46. – Рэц. на кн. : Брыль, Я. Парастак : Запісы і эсэ / Я.Брыль. – Мінск : Про Хрысто, 2006. – 103 с.

У вянок памяці Янку Брылю / Н. Гілевіч і інш. // Наша вера. – 2006. – № 3. – С. 33–46.

Шаўлякова, І. Дасканаласць маўчання : калі і чаму не варта пісаць рэцэнзіі / І. Шаўлякова // Літаратура і мастацтва. – 2005. – 28 кастр. – С. 7. – Рэц. на кн. : Брыль, Я. Блакітны зніч : Лірычнае / Я. Брыль. – Мінск : Про Хрысто, 2004. – 89 с. ; Брыль, Я. Птушкі і гнёзды : Выбранае / Я. Брыль. – Мінск : Маст. літ., 2006. – 461 с.

Янка Брыль. Фотаальбом / Аўт. тэксту А. Вялюгін. – Мінск : Беларусь, 1987. – 80 с.

## **ІВАН МЕЛЕЖ (1921–1976)** – 4 г. лекц., 2 г. практ.

Значнасць постаці І. Мележа як народнага пісьменніка Беларусі (1972), класіка нацыянальнай літаратуры. Лаўрэат Ленінскай прэміі (1972), Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа (1976), Літаратурнай прэміі імя Я. Коласа (1962).

Звесткі з біяграфіі. Ваенны лёс І. Мележа, яго ваенныя дзённікі і запісныя кніжкі. Майстэрства псіхалагічнага аналізу ў ранніх апавяданнях (“Сустрэча”, 1942; “У завіруху”, 1944; “Ноччу”, інш.). Асаблівасці паказу жыцця вёскі ў першыя пасляваенныя гады (аповесць “Гарачы жнівень” (1946), апавяданні “Перад навальніцай”, “Павел прыехаў”, інш.). Вартасці і недахопы ранніх твораў І. Мележа. Асаблівасці творчай манеры пісьменніка (уменне ў звычайнай будзённай з’яве знайсці праяўленне чалавечага характару, заглянуць у душэўны свет чалавека) ў першых зборніках апавяданняў “У завіруху” (1946) і “Гарачы жнівень” (1948).

Раман “Мінскі напрамак” (1947–1953, 1967–1973). Яго роля ў станаўленні творчай індывідуальнасці пісьменніка, асваенні ім буйной эпічнай формы. Месца рамана сярод іншых твораў пра вайну. Уплыў на мастацкую вартасць рамана грамадска-палітычнай атмасферы другой паловы 40-х– пачатку 50-х гадоў. Новая рэдакцыя як спроба мастацкага ўдасканалення твора.

Адчуванне інерцыі “Мінскага напрамку” ў аповесцях “Блізкае і няблізкае” (“Зямля, якую любіш”; “Край, які любіш”), “Дом пад сонцам”, (абедзве – 1954), п’есах “Пакуль мы маладыя” (1955), “Дні нараджэння”

(1957), апавяданнях “На рацэ” (1953), “Блізкае і далёкае”, “На скрыжаванні” (абодва – 1954), “Што ён за чалавек” (1955).

Нарысы “Паездка ў Прагу” (1955) і “Ліпень у дарозе” (1956).

Драматургія І. Мележа, яе маральна-этычная праблематыка, жанравыя асаблівасці і месца ў творчасці пісьменніка. П’есы “Пакуль мы маладыя” (1955), “Дні нараджэння” (1957), “У новым доме” (1957, 1960) у кантэксце тагачаснай літаратуры.

Апавяданні “У гарах дажджы” (1954), “Спатканне за горадам” (1955) як пачатак новага этапу ў творчасці І. Мележа. Пошукі і творчыя набыткі празаіка ў сярэдзіне 50-х гадоў. Мастацкая дасканаласць, заглыблены псіхалагізм, эпічная танальнасць і лірызм гэтых твораў. Іх значэнне для буйных адкрыццяў празаіка.

“Палеская хроніка” як галоўная, дарагая і запаветная кніга І. Мележа. Задума твора пра роднае Палессе. Цыкл раманаў: “Людзі на балоце” (1961), “Подых навальніцы” (1964–1965), “Завеі, снежань” (1976). Сімвалічнасць назвы кожнага з іх. Прататыпы, аўтабіяграфічнасць твора.

Палеская вёска 20–30-х гадоў у хроніцы. Паказ натуральнай плыні жыцця народа ў працы і гвалтоўнага руйнавання адвечнага ладу жыцця. Абазначэнне гэтых падзей як драматычных, трагедыйных для лёсу кожнага беларуса. Вобраз народа ў пераломны час гісторыі. Вылучэнне з сялянскай масы каларытных характарах-тыпаў (Нібыто-Ігнат, Чарнушка, Руды, інш.). Паказ сям’і Глушакоў – наватарскае асэнсаванне лёсу заможнага сялянства, драматызму яго становішча падчас калектывізацыі і раскулачвання. Прароцтвы Мележа адносна лёсу сялянства і камуністычнай сістэмы.

Тыповасць вобраза Васіля Дзятла. Настойлівае імкненне да самасцвярджэння і незалежнасці. Яго разгубленнасць у складаных жыццёвых абставінах. Вобраз Ганны Чарнушкі. Яе душэўныя пакуты. Майстэрства І. Мележа ў раскрыцці ўнутранага свету герояў.

Асэнсаванне пісьменнікам грамадска-палітычнай атмасферы 20–30-х гадоў у краіне. Дакументальныя матэрыялы. Паказ прадстаўнікоў партыйнага кіраўніцтва розных узроўняў ( Апейка, Башлыкоў, Харчаў, Гайліс, Дубадзел, Міканор) як выяўленне аўтарскай канцэпцыі. Палеміка Апейкі з прыхільнікамі адміністрацыйна-камандных метадаў кіраўніцтва.

Сюжэтнае завяршэнне лёсаў герояў “Палескай хронікі” ў накідах да раманаў “За асакою бераг” і “Праўда вясны”.

Этнаграфічна-фальклорны вобраз Палесся і палешукоў у хроніцы. Пісьменніцкая канцэпцыя прыроды-быцця як богастворанага Сусвету. Выяўленне ў вобразе Хадоські высокага аспекту прыродаадчування як сферы экзістэнцыявання спакутаванага духу.

Кампазіцыйныя асаблівасці “Палескай хронікі”. Жанравая адметнасць. Яе месца сярод твораў пра калектывізацыю. “Палеская хроніка” ў кантэксце мастацкага вопыту беларускай і сусветнай літаратур (Я. Колас, К. Чорны, Л. Талстой, А. дэ Бальзак, У. Рэймант, М. Шолахаў, А. Фадзееў).

Літаратурна-крытычныя выступленні. Кніга “Жыццёвыя клопаты” (1975).

Пераклады твораў Мележа на іншыя мовы. Мележазнаўства.

## ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ

## **Самабытны талент Івана Мележа**

1. Штрыхі да партрэта пісьменніка.
2. Абмеркаванне пытанняў:

2.1 Вызначце асноўныя этапы творчасці пісьменніка, абгрунтуйце іх абумоўленасць.

2.2 Дакажыце, што ўжо ў ранніх творах І. Мележа праявілася яго майстэрства псіхалагічнага аналізу. Папярэдне згадайце, што такое псіхалагічны аналіз, псіхалагізм у мастацкім творы.

2.3 Вызначце месца рамана “Мінскі напрамак” у тагачаснай беларускай літаратуры і ў творчай эвалюцыі аўтара. Раскажыце пра сюжэтна-кампазіцыйную структуру твора. Вызначце адметнасць эпічнай манеры пісьма І. Мележа пры паказе фронту, акупіраванай Беларусі і савецкага тылу, пры ўзнаўленні духу часу і адлюстраванні канкрэтных гістарычных асоб. Акрэсліце мастацкую каштоўнасць эмацыянальна-псіхалагічнай манеры аповеду ў рамане. Паразважайце пра майстэрства пісьменніка ў адлюстраванні жыцця вёскі, побыту і працы, у стварэнні народных характараў (Шабуніха, Шашура, інш.), у раскрыцці чалавечых узаемаадносінаў. Чаму І. Мележ неаднаразова дапрацоўваў “Мінскі напрамак”?

2.4 Што дае падставы гаварыць пра апавяданні “У гарах дажджы” і “Спатканне за горадам” як пра пачатак другога перыяду творчасці І. Мележа?

2.5 Паразважайце пра “Палескую хроніку” як галоўную, дарагую і запаветную кнігу І. Мележа. Вызначце яе месца сярод твораў пра Палессе. Якім паказаў палескі край І. Мележ у параўнанні са сваімі папярэднікамі? Акрэсліце месца “Палескай хронікі” сярод твораў пра калектывізацыю (М. Зарэцкага “Вязьмо”, К. Чорнага “Зямля”, “Лявон Бушмар”, З. Бядулі “Язэп Крушынскі”, Я. Коласа “Адшчапенец”, В. Быкава “Знак бяды”, “Аблава”, інш.). У чым наватарства Мележа-раманіста? Раскажыце, як пісьменнік перадае грамадска-палітычную

атмасферу 20–30-х гадоў (вобразы Зубрыча, Міканора, паэта Алеся Маёвага, інш. Палеміка Апейкі і Башлыкова).

2.6 Аргументуйце думку даследчыкаў, што ў "Палескай хроніцы" кожны вобраз можа павесці дзеянне за сабой. Хто ж яна, любімая гераіня І. Мележа? Адказ абгрунтуйце.

2.7 Сам пісьменнік сцвярджаў, што прырода – адзін з галоўных герояў "Палескай хронікі". Выкажыце свае меркаванні на гэты конт.

2.8 Як ў "Палескай хроніцы" выяўляецца майстэрства Мележа-раманіста? Прывядзіце прыклады ўдалага выкарыстання мастаком сродкаў псіхалагічнага аналізу, мастацкай дэталі, пейзажнага жывапісу, інш.

2.9 Школьная праграма для вывучэння ў 6 кл. прапануе "Першы іней" (урывак з рамана "Подых навальніцы"). Падрыхтуйце яго выразнае чытанне.

2.10 Паразважайце, за што мележаўскія "Жыццёвыя клопаты" былі адзначаны Дзяржаўнай прэміяй БССР (1976).

3 Падрыхтуйце паведамленне "Іван Мележ – драматург".

4 Падрыхтуйце паведамленне "Творчасць Мележа ў крытыцы і літаратуразнаўстве".

5 У школьную праграму ўключаны **для вывучэння**: у 12 кл. "Людзі на балоце", "Подых навальніцы"; у 12 п.у. "Палеская хроніка". **Для чытання і абмеркавання:** у 6 кл. "Здарэнне"; у 12 кл. "Завеі, снежань"; у 12 п.у. "Першая кніга".

6 **Для завучвання на памяць**: урывак з рамана "Людзі на балоце" (на выбар настаўніка). Які ўрывак варта прапанаваць вучням? Чаму?

**КРЫНІЦЫ:** Мележ, І. Збор твораў : у 10 т. / І. Мележ. – Мінск : Маст. літ., 1979–1985.

Мележ, І. Завеі, снежань... Дом пад сонцам : Раман, аповесць, апавяданні / І. Мележ ; маст. Л. І. Мележ. – Мінск : Юнацтва, 2001. – 270 с.

**ЛІТАРАТУРА:** Адамовіч, А. Хараство прастаты : Урокі творчасці Івана Мележа / А. Адамовіч // Зб. тв. : у 10 т. / І. Мележ. – Мінск, 1979. – Т. 1 : Апавяданні, аповесці. – С. 7–21.

Андраюк, С. Талент глыбока беларускі / С. Андраюк // Полымя. – 2001. – № 2. – С. 253–271.

Беларускія пісьменнікі : Бібліягр. слоўн. : у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы ; рэдкал.: І. Багдановіч [і інш.]. – Мінск : "Беларус. энцыкл.", 1992–1995. – Т. 4. : Лазарук – Перкін. – 1994. – С. 281–293.

Гніламёдаў, У. Іван Мележ : Нарыс жыцця і творчасці / У. Гніламёдаў – Мінск : Нар. асвета, 1984. – 128 с.

Драздова, З. Майстэрства слова : Моўна-стылявыя асаблівасці “Палескай хронікі” Івана Мележа / З. Драздова. – Мінск : Нав. і тэхніка, 1993. – 136 с.

Кавалюк, А. Свет сялянства ў “Палескай хроніцы” І. Мележа : дыс. ... канд. філалаг. навук : 10.01.09. – / А. Кавалюк. – Брэст, 2001. – 115 с.

Ляшук, В. Вывучэнне творчасці пісьменніка. Іван Мележ у школе : дапам. для наст. / В. Ляшук. – Мінск : Аверсэв, 2005. – 191 с.

Навуменка, І. Іван Мележ / І. Навуменка // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2-е выд. Мінск : Беларус. навука, 2001–2002. – Т. 3. – 2002. – С. 574–596.

**ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА:** Адамовіч, А. Вяртанне наперад / А. Адамовіч // Здалёк і зблізку / А. Адамовіч. – Мінск, 1976. – С. 358–437.

Адамович, А. “Полесская хроника” И. Мележа в контексте времени : По записным книжкам писателя / А. Адамович // Вопросы литературы. – 1982. – № 1. – С. 152–185.

Андраюк, С. Іван Мележ / С. Андраюк // Стыль пісьменніка. – Мінск, 1974. – С. 231–302.

Бугаёв, Д. Шолохов и Мележ / Д. Бугаёв // Нёман. – 1990. – № 3. – С. 161–170.

Бугаёў, Д. Вернасць прызванню : Творчая індывідуальнасць Івана Мележа / Д. Бугаёў. – Мінск : Маст. літ., 1977. – 240 с.

Бугаёў, Д. Радасць і боль мастака / Д. Бугаёў // Спавядальнае слова : Літар. крытыка, успаміны / Д. Бугаёў – Мінск, 2001. – С. 3–27.

Дасаева, Т. “Жыць для літаратуры” / Т. Дасаева // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 4. Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – 2006. – № 1. – С. 3–8.

Драздова, З. Тропы і характар аўтарскага мыслення ў “Палескай хроніцы” І. Мележа / З. Драздова // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1987. – № 1. – С. 84–91.

Зборнік навуковых матэрыялаў, прысвечаных 75-годдзю і 130-годдзю з дня нараджэння Івана Мележа і Марыі Радзевіч / Брэсц. дзярж. ун-т; рэдкал.: В. Я. Ляшук [і інш.]. – Брэст, 1999. – 124 с.

Кавалюк, А. Нацыянальны фальклор і абрады ў мастацкай канве “Палескай хронікі” І. Мележа / А. Кавалюк // Весн. Брэсцк. ун-та. – 1999. – № 1. – С. 35–43.

Кавалюк, А. Пісьменніцкая канцэпцыя прыроды ў “Палескай хроніцы” І. Мележа / А. Кавалюк // Весн. Брэсцк. ун-та. – 2001. – № 5. – С. 24–33.

Кавалюк, А. Святло душы мележаўскай Канапляначкі (Вобраз Хадоські ў “Палескай хроніцы” І. Мележа) / А. Кавалюк // Роднае слова. – 1999. – № 11. – С. 34–39.

Локун, В. Вялікі свет маленькіх Куранёў / Да праблемы зямлі, чалавека і ўлады ў “Палескай хроніцы” І. Мележа / В. Локун // Полымя. – 1994. – № 3. – С. 225–237.

Смыкоўская, В. Творчая канцэпцыя пісьменніка : Задума і мастацкае ўвасабленне ў “Палескай хроніцы” І. Мележа / В. Смыкоўская. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1976. – 111 с.

Успаміны пра Івана Мележа / Склад. Л. Я. Пятрова-Мележ. – Мінск : Маст. літ., 1982. – 415 с.

**ІВАН ШАМЯКІН (1921–2004)** – 6 г. лекц., 4 г. практ.

Шырокая вядомасць І. Шамякіна ў Беларусі і за яе межамі (творы перакладзены больш чым на 30 моваў свету). Высокае грамадскае прызнанне мастакоўскага таленту І. Шамякіна: прысуджэнне Дзяржаўнай прэміі СССР (1951), Дзяржаўнай прэміі БССР (1967 і 1982), наданне звання народнага пісьменніка Беларусі (1972), Героя Сацыялістычнай Працы (1981), абранне акадэмікам Акадэміі навук Беларусі (1994) і інш.

Біяграфічныя звесткі пра пісьменніка. Палессе ў жыцці і творчасці І. Шамякіна. Першыя творчыя спробы. Удзел у Вялікай Айчыннай вайне, яе ўплыў на станаўленне творчай асобы пісьменніка. Публікацыя вершаў і допісаў у армейскім друку. Пачатак творчасці на беларускай мове. Першае апавяданне “У снежнай пустыні” (1944). Адметнасць аўтарскай канцэпцыі чалавека на вайне ў аповесці “Пастка” (1945).

Раман “Глыбокая плынь” (1946–1949) – першы твор на партызанскую тэму ў беларускай літаратуры. Адлюстраванне цяжару і суровых выпрабаванняў ваеннага часу. Героі твора як людзі свайго часу. Аўтарская засяроджанасць на ўнутраным свеце чалавека.

Праблема аднаўлення мірнага жыцця ў рамане “У добры час” (1952). Наватарства твора: аб’ёмнасць погляду на жыццё, шматбаковасць адлюстравання характараў герояў. Змены ў ацэнцы рамана крытыкай на працягу дзесяцігоддзяў.

Творчасць І. Шамякіна другой паловы 50-х–60-х гадоў. Мастацкая адметнасць рамана “Крыніцы” (1956). Актуальнасць пастаўленых праблем. Выкрыццё бародкаўшчыны як вялікае мастацкае дасягненне таго часу.

Пенталогія “Трывожнае шчасце” ў творчай біяграфіі І. Шамякіна. Творчая задума. Аўтабіяграфічныя моманты ў творы. Сюжэтна-кампазіцыйная пабудова пенталогіі (цыкл аповесцей “Непаўторная вясна”, 1957; “Начныя зарніцы”, 1958; “Агонь і снег”, 1959; “Пошукі сустрэчы”, 1959; “Мост”, 1965). Наватарства І. Шамякіна ў паказе чалавека на вайне. Паглыбленне рэалістычнай асновы ідэйна-мастацкага мыслення пісьменніка. Духоўная эвалюцыя герояў, іх вернасць каханню. Лірычная

плынь аповеду ў “Трывожным шчасці”. Майстэрства псіхалагічнага аналізу. Роля мастацкіх прыёмаў і сродкаў індывідуалізацыі характараў. Ацэнка пенталогіі ў беларускай крытыцы (В. Каваленка, В. Быкаў, Д. Бугаёў, Р. Шкраба, інш.).

Значэнне зборнікаў “На знаёмых шляхах” (1949), “Дзве сілы” (1951), “Першае спатканне” (1956), “Матчыны рукі” (1961), “Вячэрні сеанс” (1968) у развіцці беларускага апавядання. Эстэтычная змястоўнасць апавяданняў, своеасаблівасць мастацкіх структур, прыёмы стварэння характараў (“Дзівак чалавек”, “Матчыны рукі”, “Бацькаў гонар”, “Дзеці настаўніцы”, “Непрыгожая”, інш.).

І. Шамякін як майстар паказу жаночых характараў у беларускай літаратуры. Рэабілітацыя права чалавека на свабоду пачуццяў у аповесці “Ах, Міхаліна, Міхаліна” (1966). Жанчына і вайна ў аповесцях “Шлюбная ноч” (1974), “Гандлярка і паэт” (1975), рамане “Зеніт” (1987), інш.

Мнагапланавы раман у творчасці І. Шамякіна 60–70-х гадоў. Асэнсаванне аўтарам вострых маральна-этычных праблем і агульнафіласофскіх пытанняў чалавечага быцця. Сацыяльна-этычная сутнасць канфлікту ў рамане “Сэрца на далоні” (1963). Паказ гуканаўшчыны як сацыяльна небяспечнай з’явы. Праблема бацькоў і дзяцей, духоўнага станаўлення асобы. Своеасаблівасць структуры рамана, значэнне рэтраспекцыі. Сэнс назвы твора, сімвалізацыя як сродак мастацкага асэнсавання чалавека і свету.

Раман “Снежныя зімы” (1968). Канфлікт Антанюка з бюракратычным асяроддзем як канфлікт чалавечнасці з чыноўніцкай безасабовасцю. Асаблівасці паэтыкі рамана: рэтраспектыўная кампазіцыя (спалучэнне сучаснага і мінулага), сюжэтная інтрыга, літаратурная ўмоўнасць, прыгодніцкія і дэтэктыўныя элементы.

Тэматычна-праблемная навізна рамана “Атланты і карыятыды” (1974). Заглыбленасць пісьменніка ў сферу жыцця гарадской інтылігенцыі. Узмацненне інтэлектуальнага пачатку, мастацкага аналітызму. Філасафічнасць зместу твора. Вобраз Максіма Карнача і сцвярджэнне духоўных асноў чалавечага быцця, спрадвечнай народнай маралі і этыкі. Вобраз маці як глыбокае сімволіка-філасофскае абагульненне.

Катэгорыя памяці, праблема злачынства і даравання ў рамане “Вазьму твой боль” (1979). Маральна-псіхалагічная сутнасць канфлікту твора. Плынь свядомасці ў выяўленні ўнутранага стану Івана Батрака. Адлюстраванне жыцця і праблем беларускай вёскі. Сэнс назвы твора.

Рамантызацыя ў паказе рэвалюцыйных падзей, вобраза Леніна (“Хлеб”, “Матрос з “Алега”, “Першы генерал”, інш.). Раман “Петраград – Брэст” (1983) у кантэксце беларускай лененіяны.

І. Шамякін як летапісец сучаснасці. Творчая актыўнасць пісьменніка ў другой палове 80-х–90-х гадоў. Выхад кніг “Сатанінскі тур” (1995), “Палеская мадона” (1998), “Пошукі прытулку” (2001). Аповесць “Драма” (1988) як мастацкі дакумент часу перабудовы. Мастацкае пераасэнсаванне савецкай гісторыі ў аповесці “Ахвяры” (1990).

“Злая зорка” (1991) – першы раман у беларускай літаратуры пра Чарнобыль. Публіцыстычнасць твора. Праўда пра аварыю і яе наступствы. Пратэст пісьменніка супраць антычалавечых эксперыментаў над народам. Афганская тэматыка. Сімвалічнасць назвы твора. Працяг асэнсавання трагічных падзей Афганістана і Чарнобыля ў аповесці “Зона павышанай радыяцыі” (1997).

Гістарычны раман “Вялікая княгіня” (1996). Зварот пісьменніка да гістарычнага жанру як заканамерны этап у развіцці ім эпічнай традыцыі і гістарызму беларускай літаратуры. Сцвярджэнне аўтарытэту ідэалаў хрысціянства.

Адлюстраванне разнастайных бакоў сучаснага жыцця і маральная праблематыка ў аповесцях “Сатанінскі тур” (1993), “Падзенне” (1994), “Без пакаяння” (1995), “Палеская мадона” (1996), “Крывінка” (1995), “Завіхрэнне” (1998), “У засені палаца” (2000), інш. Набліжэнне аўтарскай трактоўкі свету да антыутопіі і літаратуры абсурду. Лёс людзей мастацтва, культуры і навукі ў часы “перабудовы” ў аповесцях “Вернісаж” (1992), “Адна на падмостках” (1993), “Пошукі прытулку” (1999), інш. Хваласпеў жонцы, жанчыне-маці ў аповесці “Слаўся, Марыя!” (1998). Рэалізм як вызначальны творчы метад І. Шамякіна. Лаканізм стылю аповесцей.

Сюжэтная дынаміка і драматызм канфлікту як адна з прычын звароту кінарэжысёраў да твораў І. Шамякіна. Экранізацыя аповесці “Гандлярка і паэт”, раманаў “Глыбокая плынь”, “Вазьму твой боль”, “Атланты і карыятыды” і інш.

Шамякін-драматург. Праблематыка найбольш значных п’ес “Выгнанне блудніцы” (1961), “Дзеці аднаго дома” (1967), “Экзамен на восень” (1973), “І змоўклі птушкі” (1977), “Залаты медаль” (1979).

Публіцыстыка, літаратурная крытыка і дзённікавыя запісы: кнігі “Размова з чытачом” (1973), “Карэнні і галіны” (1986), “Роздум на апошнім перагоне” (1998), “Начныя ўспаміны” (2002–2004), іх каштоўнасць для разумення светапогляду пісьменніка, яго творчай лабараторыі, усяго літаратурнага працэсу Беларусі савецкіх дзесяцігоддзяў.

Уплыў І. Шамякіна на сучасны літаратурны працэс. Уклад у развіццё нацыянальнага пісьменства і культуры.

## ПЕРШЫЯ ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ
## **Станаўленне творчай індывідуальнасці Івана Шамякіна**

1. Штрыхі да партрэта пісьменніка.
2. Абмеркаванне пытанняў:

2.1 Вызначце асноўныя этапы творчасці І. Шамякіна. У які з іх, на вашу думку, пісьменнік дасягнуў мастацкай вышыні? Чаму?

2.2 Паразважайце пра гуманістычную накіраванасць першай шамякінскай аповесці “Помста”, пра новы падыход пісьменніка ў асэнсаванні праблем вайны праз вобраз маёра Раманенкі.

2.3 Раскажыце, якой паўстае “вайна народная” ў рамане “Глыбокая плынь”. Ахарактарызуйце герояў твора, вызначце сярод іх месца вобраза Таццяны Маеўскай. Растлумачце сімвалічны сэнс заключнага эпізода рамана.

2.4 Якой паказаў І. Шамякін пасляваенную вёску ў рамане “У добры час”? Вобраз каго з герояў успрымаецца найбольш праўдзівым і пераканаўчым? Паразважайце, якое сэнсавае значэнне ў змесце рамана набываюць узаемаадносіны Лескаўца і Машы. Як вы адносіцеся да Машыных поглядаў на каханне і сям’ю? Чаму?

2.5 Што дало падставы В. Локун гаварыць пра раман “Крыніцы” як адметную з’яву ў развіцці беларускай савецкай літаратуры і як пэўны этап у мастацкай эвалюцыі пісьменніка? У параўнанні з раманам “У добры час” які новы аспект вясковага жыцця аказаўся ў цэнтры ўвагі пісьменніка ў “Крыніцах”? Выкажыце свае адносіны да Лемяшэвіча. Ці хацелі б вы працаваць пад кіраўніцтвам такога дырэктара школы? Чаму? Прааналізуйце вобраз Бародкі як складаны, псіхалагічна глыбокі, сацыяльна тыповы. Хто з герояў і чаму выклікае вашы сімпатыі і спагаду? Як вы думаеце, ці зжыў сябе за паўстагоддзя з часу напісання тып Арэшкіна? Вызначце ролю пейзажных замалёвак ў творы.

2.6 Пакажыце, якім чынам на вышэй аналізаваныя творы ўплываў час напісання і рамантычны погляд іх аўтара на жыццё.

2.7 Раскажыце пра сюжэтна-кампазіцыйную будову “Трывожнага шчасця”. Які матэрыял са сваёй біяграфіі ўвёў І. Шамякін у пенталогію? Якая з аповесцяў найбольш аўтабіяграфічная? Дакажыце, што Пятро Шапятовіч і Саша Траянава – тыповыя прадстаўнікі даваеннага пакалення моладзі. Раскажыце пра багацце ўнутранага свету герояў, паэтызацыю іх чалавечых пачуццяў у “Непаўторнай вясне”.

2.8 Прааналізуйце праблемна-тэматычную блізкасць аповесці “Начныя зарніцы” і рамана “Глыбокая плынь”. Што змянілася ў аўтарскім поглядзе на ваенныя падзеі? Як у аповесці паказаны партызанскі рух?

Чаму? З якой мэтай у “Начных зарніцах” І. Шамякін яшчэ больш ускладніў сюжэтную лінію ўзаемаадносінаў Сашы і Лялькевіча?

2.9 На якой падставе крытыка лічыць аповесць “Агонь і снег” самым глыбокім і праўдзівым творам І. Шамякіна пра вайну? Выкажыце свае меркаванні на гэты конт. Якую форму абраў мастак для аповесці і як яна спрыяла раскрыццю аўтарскай задумы? Паразважайце, які са стылёвых пачаткаў пераважае ў творы пры абмалёўцы Шапятовіча на вайне.

2.10 Раскажыце, як мяняецца аўтарская манера пісьма ў аповесці “Пошукі сустрэчы” і як гэта спрыяе здзяйсненню творчай задумы. У кнізе “Іван Шамякіна: Нарыс жыцця і творчасці” (С. 105) В. Каваленка пераконвае, што “здрада” Сашы мужу “хоць і міжвольная адбылася”. Выкажыце свае меркаванні па праблеме.

2.11 Параўнайце паказ пасляваеннага жыцця ў аповесці “Мост” і ў раманах аналагічнай тэматыкі “У добры час” і “Крыніцы”. Дакажыце, што аповесць “Мост” звязана з тэмай вайны. Паразважайце пра сэнсавую змястоўнасць вобраза старшыні калгаса Грамыкі. Дайце характарыстыку вобраза сельскага партыйнага кіраўніка настаўніка Шапятовіча.

2.12 Якая праблема з’яўляецца вызначальнай ў “Трывожным шчасці”? Растлумачце сэнс назваў аповесцяў і ўсёй пенталогіі.

Пры аналізе твора ўлічыце майстэрства псіхалагічнага аналізу, мастацкія прыёмы і сродкі індывідуалізацыі характараў (рамантызацыя, рэфлексія, псіхалагічная дэталь, інш.).

2.13 Для самастойнага чытання ў 10 класе на выбар настаўніка прапануюцца аповесці з пенталогіі “Начныя зарніцы”, “Агонь і снег”, “Мост”. Які з твораў будзеце рэкамендаваць вучням і чаму?

2.14 Акрэсліце месца аповесці “Гандлярка і паэт” сярод шамякінскіх твораў пра вайну. Раскрыйце ўяўленні Вольгі Ляновіч аб сэнсе жыцця да з’яўлення ў яе доме Алеся Шпака. Што новага ўнёс у яе жыццё Алесь? Паразважайце, які след у жыцці паэта пакінула гандлярка. Якую ацэнку маюць аповесць і яе героі ў крытыцы? Меркаванні каго з даследчыкаў вам бліжэй і чаму?

2.15 Калі выбіраць паміж аповесцямі “Гандлярка і паэт” і “Непаўторная вясна” для вывучэння ў 10 класе, на якім з твораў вы спыніцеся? Адказ аргументуйце.

2.16 Вызначце праблематыку і жанрава-стылёвыя асаблівасці аповесці “Ах, Міхаліна, Міхаліна”. Які з жаночых вобразаў вас найбольш уразіў і чым? Выкажыце свае адносіны да герояў твора. Над якімі жыццёвымі праблемамі прымушае задумацца аповесць?

3. Падрыхтуйце паведамленне “Іван Шамякін – драматург”.

4. У школьную праграму **для вывучэння** ўключаны: у 10 кл. “Гандлярка і паэт” або “Непаўторная вясна”; у 10 п.у. “Гандлярка і паэт”; у 12 п.у. “Непаўторная вясна”, “Агонь і снег”, “Мост”. **Для самастойнага чытання** на выбар настаўніка прапануюцца: у 10 кл. “Ахвяры”, “Начныя зарніцы”, “Агонь і снег”, “Мост”; у 10 п.у. “Ах, Міхаліна, Міхаліна!”, “Аповесць пра сябра”; у 12 п.у. “Начныя зарніцы”, “Пошукі сустрэчы”.

ДРУГІЯ ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ

## Мнагапланавы раман І. Шамякіна 60–70-х гадоў. Творчасць пісьменніка канца XX ст. – пачатку XXI ст.

1 Абмеркаванне пытанняў:

1.1 У чым асаблівасці сюжэта і кампазіцыі рамана “Сэрца на далоні”? Якое месца ў творы займаюць падзеі ваеннага часу? Паразважайце, што аб’ядноўвае і што адрознівае Антона Яраша і Кірылу Шыковіча. Як характарызуе Шыковіча занепакоенасць праблемай выхавання моладзі? Раскрыйце сэнс паняцця “гуканаўшчына” і прычыны яе жывучасці. Чаму яна ўвасабляецца ў вобразе Гукана? Асэнсуйце ролю вобраза Зосі Савіч у вырашэнні ўзнятых пісьменнікам праблем. Паназірайце за пейзажам і яго роляй у творы. У чым сэнс назвы рамана?

1.2 Як праявілася ў рамане “Снежныя зімы” пісьменніцкае майстэрства сацыяльна-псіхалагічнага раскрыцця асобы чалавека. Чаму канфлікт твора І. Шамякіным перанесены ў душу галоўнага героя? Ахарактарызуйце вобраз Івана Васільевіча Антанюка. Наколькі апраўданы ў рамане прыём самараскрыцця героя? Якія маральна-этычныя праблемы закранае твор? Акрэсліце ролю эпілога ў раскрыцці ідэі рамана.

1.3 Вызначце канфлікт рамана “Атланты і карыятыды” і ролю вобраза Максіма Карнача ў яго вырашэнні. Пакажыце, што ў вобразе галоўнага героя аўтар сцвярджае духоўныя асновы чалавечага быцця, спрадвечнай народнай маралі і этыкі. Якім намаляваў жыццё гарадской інтэлігенцыі І. Шамякін? Якія мастацкія сродкі дапамагаюць выявіць аўтарскія адносіны да падзей і герояў? Паразважайце, чаму не атрымалася моцнай сям’і ў Максіма і Дашы. Раскрыйце філасофскі змест твора, патлумачце сэнс яго назвы.

1.4 Асэнсуйце праблему злачынства і даравання ў рамане “Вазьму твой боль”. Вызначце мастацкую функцыю плыні свядомасці ў выяўленні ўнутранага стану Івана Батрака.

1.5 Што дае падставы даследчыкам гаварыць пра творчую актыўнасць І. Шамякіна ў другой палове 80-х–90-я гады? Якія тэмы і праблемы

хвалююць пісьменніка ў гэты час? Вызначце вобразна-стылёвыя асаблівасці шамякінскіх твораў гэтага перыяду. Якія евангельска-хрысціянскія матывы заўважаюцца ў іх? Як яны ўплываюць на сэнс твораў?

1.6 У спісы для пазакласнага чытання вынесены зборнікі “Палеская мадонна”, “Сатанінскі тур”, “Пошукі прытулку”. Якія з аповесцяў, у іх уключаныя, вы хацелі б абмеркаваць з вучнямі і чаму?

1.7 Акрэсліце сутнасць сацыяльна-маральнага канфлікту ў аповесці “Драма”. Выкажыце свае адносіны да Алы Наліцкай. Як да сваёй гераіні ставіцца аўтар? Пакажыце, як і для чаго пісьменнік выкарыстоўвае ў творы гумарыстычнае слова.

1.8 Вызначце адметнасць аповесці “Ахвяры” ў даследаванні тэмы “асобых” атрадаў і іх ролі ў партызанскім руху. Ахарактарызуйце герояў твора. Прыгадайце вобразы, блізкія па духу вобразу Золатава, створаныя іншымі беларускімі пісьменнікамі. Параўнайце іх.

1.9 Чым вызначаецца сярод іншых твораў на чарнобыльскую тэму раман “Злая зорка”? Якія праблемы, агаленыя фізічным і маральным Чарнобылем, знайшлі асэнсаванне ў творы? Для чаго аўтар заглыбляецца ў паказ паводзінаў партыйных і савецкіх кіраўнікоў у крытычных абставінах? Якім на іх фоне паўстае вобраз Уладзіміра Пыльчанкі? Ахарактарызуйце іншых герояў. Якім чынам пісьменнік выражае пратэст супраць антычалавечых эксперыментаў над народам? Для чаго ў твор уводзіцца афганская тэматыка? Чаго дасягае пісьменнік сінтэзам лірычнага і рамантычнага, рэалістычнага і драматычнага стылёвых пачаткаў? Паразважайце пра сімвалічнасць развітання з роднай хатай Лізы Пустаход, іншых вобразаў і эпізодаў, сімвалічнасць назвы рамана. Пакажыце хрысціянскія матывы і іх ролю ў вырашэнні аўтарскай задумы.

1.10 Раскажыце, якія аспекты чарнобыльскай тэматыкі трапляюць у поле зроку І. Шамякіна ў аповесці “Зона павышанай радыяцыі”.

1.11 Якую эстэтычную мадэль духоўнасці прапануе І. Шамякін ў рамане “Вялікая княгіня”? Якія маральна-этычныя праблемы закранае твор? Выкажыце свае адносіны да герояў рамана. Чаму можна павучыцца ў княгіні Алены, якія якасці характару пераняць у яе? Якую ролю ў ідэйна-эстэтычным змесце твора выконваюць эпізоды “ўлады” Алены над звярамі: аленямі і ваўкамі?

1.12 Вызначце месца жаночых вобразаў у творчасці І. Шамякіна (“Трывожнае шчасце”, “Вазьму твой боль”, “Слаўся, Марыя”, “Палеская мадонна”, інш)? Хто з шамякінскіх гераінь і чаму найбольш прэтэндуе на вашы сімпатыі? У параўнанні з ранейшымі жаночымі вобразамі чаму “неглыбокім” (В. Локун) атрымаўся вобраз Надзеі Русак

з аповесці “Палеская мадонна”? Наколькі адпавядае гэты характар назве твора?

1.13 Паразважайце пра каштоўнасць дзённікавых запісаў (“Роздум на апошнім перагоне”, “Начныя ўспаміны”) для разумення светапогляду пісьменніка, яго творчай лабараторыі, усяго літаратурнага працэсу Беларусі савецкіх дзесяцігоддзяў.

2 Падрыхтуйце паведамленне “Публіцыстыка і літаратурная крытыка І. Шамякіна”.

3 Акрэсліце месца і ролю І. Шамякіна ў развіцці літаратуры.

**КРЫНІЦЫ:** Шамякін, І. Выбраныя творы : у 3 т. / І. Шамякін. – Мінск : Маст. літ., 1992.

Шамякін, І. Збор твораў / І. Шамякін ; прадм. А. Марціновіча. – Мінск : Маст. літ., 2003–2007 (8-ы том).

Шамякін, І. Начныя ўспаміны / І. Шамякін // Полымя. – 2003. – № 1. – С. 9–40.

Шамякін, І. Роздум на апошнім перагоне : Дзённікі 1980–1995 гадоў / І. Шамякін. – Мінск : Маст. літ., 1998. – 527 с.

**ЛІТАРАТУРА:** Беларускія пісьменнікі : Бібліягр. слоўн. : у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы ; рэдкал.: І. Багдановіч [і інш.]. – Мінск : “Беларус. энцыкл.”, 1992–1995. – Т. 6. : Талалай – Яфімаў. Дадатак. – 1995. – С. 315–332.

Каваленка, В. Іван Шамякін : Нарыс жыцця і творчасці / В. Каваленка. – Мінск : Нар. асвета, 1980. – 207 с.

Локун, В. Іван Шамякін / В. Локун // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2-е выд. Мінск : Беларус. навука, 2001–2002. – Т. 3. – 2002. – С. 597–639.

**ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА:** Бельскі, А. Чалавек – час – мараль у прозе І. Шамякіна пра сучаснасць / А. Бельскі // У дапамогу педагогу : Беларуская мова і літаратура. – 2005. – № 1. – С. 3–8.

Давыдава, Г. “Любоў маці мацней за смерць” : вобраз жанчыны-маці ў творчасці І. Шамякіна / Г. Давыдава // Роднае слова. – 2006. – № 10. – С. 45–46.

Загорскі, А. Паміж былым і наступным: літаратуразнаўчы прагноз паводле новага рамана І. Шамякіна “Вялікая княгіня” / А. Загорскі // Літаратура і мастацтва. – 1996. – № 25 (чэрв.). – С. 6–7.

Іван Шамякін. Жыццё і творчасць / Аўт. прадм. В. Каваленка ; склад. Т. Шамякіна. – Мінск : Нар. асвета, 1982. – 95 с.

Кісліцына, Г. Іван Шамякін – апостал мадэрнізму / Г. Кісліцына // Крыніца. – 1998. – № 1. – С. 31–33.

Марціновіч, А. “Для ўсіх, хто кахае...” [пра аповесць “Слаўся, Марыя!”] / А. Марціновіч // Літаратура і мастацтва. – 2000. – 21 студз. – С. 6–7.

Матусевіч, А. Не быць манкуртамі [пра гістарычны раман “Вялікая княгіня”] / А. Матусевіч // Першацвет. – 1997. – № 9. – С. 82.

Мішчанчук, М. Аповесць “Гандлярка і паэт” Івана Шамякіна / М. Мішчанчук // Роднае слова. – 2005. – № 11. – С.41–45.

Рублевская, Л. Галатея с “Комаровки” : античный миф в повести И. Шамякина “Гандлярка и поэт” / Л. Рублевская // Советская Белоруссия. – 2006. – 17 июня. – С. 14.

Тычына, М. Метафізіка кахання. Аповесць І. Шамякіна “Непаўторная вясна” / М. Тычына // Роднае слова. – 2004. – № 11. – С. 21–24.

Шамякіна, Т. Сімволіка загалоўкаў у творах Івана Шамякіна / Т. Шамякіна // Маладосць. – 2006. – № 6. – С. 139–146.

## **АНДРЭЙ МАКАЁНАК (1920–1982)** – 4 г. лекц., 2 практ.

Андрэй Макаёнак як класік беларускай драматургіі, адзін з вядучых камедыёграфаў у сусветнай драматургіі ХХ ст. Вядомасць і ўсенароднае прызнанне: народны пісьменнік Беларусі (1977), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Коласа (1974), Літаратурнай прэміі імя Я. Купалы (1962), дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1971–1982), дзяржаўныя ўзнагароды.

Звесткі з біяграфіі. Ваенныя выпрабаванні. Умовы фарміравання таленту. Шлях у літаратуру і на сцэну. Высокія патрабаванні пісьменніка да сябе ў мастацкай творчасці. Першыя спробы ў драматургічным жанры, вострая надзённасць, камедыйна-сатырычная характарыстыка персанажаў у п’есах “Перад сустрэчай” (1950), “Жыццё патрабуе” (1950), “Крымінальная справа” (1951), “Першае пытанне” (1952). Драма “На досвітку” (1951) – першы сцэнічны твор.

Мастацкае дасягненне А. Макаёнка ў жанры сатырычнай камедыі – “Выбачайце, калі ласка!” (1954). Канфлікт твора, абумоўлены жыццёвымі калізіямі. Вобраз Каліберава – прынцыповая ўдача аўтара. Каліберaўшчына як сацыяльная з’ява. Надзённасць камедыі. Сусветная вядомасць твора (ставілі каля 200 тэатраў СССР).

Сцэнічны лёс адной з лепшых сатырычных камедый “Каб людзі не журыліся” (1957). Імкненне прыцягнуць увагу грамадскасці да незайздроснага жыцця сельскага працаўніка. Мастацкая выразнасць, вялікі грамадзянскі накал, гуманістычны пафас.

“Шчаслівае” сцэнічнае жыццё камедыі “Лявоніха на арбіце” (1961) – аднаго з самых папулярных твораў А. Макаёнка. Асэнсаванне вострых,

надзённых праблем савецкай рэчаіснасці пачатку 60-х гадоў. Ацэнка твора ў тагачаснай і сучаснай крытыцы. Сённяшняе разуменне канфлікту твора. Камедыйнае майстэрства драматурга.

Творчыя пошукі А. Макаёнка ў канцы 60-х–70-я гады. Жанравыя эксперыменты драматурга. Драма творцы з-за сцэнічнай адстаўкі сатырычнай камедыі “З кірмашу” (1967). “Зацюканы апостал” (1969) і “Трыбунал” (1970) – пачатак мэтанакіраванай працы драматурга па “прышчэпцы” беларускай камедыі разнастайных жанравых адгалінаванняў (С. Лаўшук).

“Зацюканы апостал” – “п’еса-загадка” (С. Лаўшук). Сінтэтычны жанр твора: трагікамедыя – сатыра – памфлет. Вобраз Сына – унікальная з’ява ў беларускай драматургіі. Расчытванне яго крытыкай. Праблематыка твора. Выключная сіла прадбачання ў п’есе.

Наватарства трагікамедыі “Трыбунал” у плане жанру, у вырашэнні праблем гераічнага, у паліфаніі эмацыянальных фарбаў. Гумар у творы. Вобраз Цярэшкі Калабка – творчая ўдача А. Макаёнка і ўсёй беларускай драматургіі.

Сацыяльна-філасофскі і этычны пошук А. Макаёнка ў камедыях апошняга дзесяцігоддзя яго жыцця. Грамадзянская смеласць аўтара ў камедыіі-рэпартажы “Таблетку пад язык” (1972). Пастаноўка шматлікіх праблем тагачаснага вясковага жыцця: адносіны чалавека да зямлі і прыроды, міграцыя сельскага насельніцтва, інш. Наватарскі драматургічны ход – рэпартаж; сінтэз розных мастацкіх прыёмаў.

А. Макаёнак як прарок-прадказальнік у сатырычнай камедыі “Кашмар” (1974, часопісная і сцэнічная назва “Святая прастата”). Парадоксы ў творы.

Трагікамедыя “Пагарэльцы” (1980) – адзін з самых “шматпакутных” твораў А. Макаёнка. Своеасаблівасць сюжэтна-кампазіцыйнай будовы п’есы. Арыгінальная распрацоўка вобразаў-тыпаў. Майстэрства перадачы праяў бюракратызму (Ухватаў, Кудасаў, Клёпкін, Бусько).

Сентыментальны фельетон “Верачка” (1979) – зварот аўтара да галоўных маральных каштоўнасцей народа.

Філасофскі роздум драматурга пра шляхі развіцця цывілізацыі і чалавека на Зямлі ў трагікамедыі “Дыхайце эканомна” (1982). Інтэлектуальная змястоўнасць, гуманістычны пафас твора.

А. Макаёнак і тэатр. Поспех яго п’ес на сцэнах СССР і замежжа. А. Макаёнак як аўтар кінасцэнарыяў. Перакладчыцкая дзейнасць. Месца пісьменніка ў развіцці беларускай культуры.

# ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ
## **Майстэрства Андрэя Макаёнка-драматурга**

1 Штрыхі да партрэта пісьменніка.

2 Абмеркаванне пытанняў:

2.1 Вызначце этапы творчасці А. Макаёнка. Чым яны абумоўлены?

2.2 Як сам аўтар ацэньваў першую пастаўленую на сцэне п’есу “На досвітку”?

2.3 Раскажыце, як уплывалі на станаўленне Макаёнка-драматурга п’есы К. Крапівы?

2.4 У каго і за што іранічна просіць прабачэння А. Макаёнак п’есай “Выбачайце, калі ласка”? Якія грамадскія і чалавечыя заганы асуджае аўтар у творы? Параўнайце макаёнкаўскі вобраз Каліберава і вобраз Гарлахвацкага з камедыі “Хто смяецца апошнім” К. Крапівы? Чым тлумачыцца іх падабенства? Які сэнс набывае прыгаворка “Хоць круць-верць, хоць верць-круць” у вуснах Гарошкі? У мове іншых персанажаў? Паразважайце пра гаваркія прозвішчы. Звярніце ўвагу на гульню слоў у дыялогах герояў камедыі. З якой мэтаю Макаёнак карыстаўся гэтым выяўленчым прыёмам?

2.5 Раскажыце, як склаўся сцэнічны лёс камедыі “Каб людзі не журыліся”? У пастаноўцы якіх сацыяльных праблем выявілася грамадзянская заклапочанасць А. Макаёнка? Для чаго аўтар дакладна называе дату дзеяння – 1 красавіка 1955 г. і робіць удакладненне – “падманны дзень”? Якімі выяўленчымі сродкамі драматургу ўдалося стварыць каларытныя фігуры эпізадычнага плана? Дакажыце, што рэмаркі – важны сродак аўтарскай пазіцыі ў камедыі.

2.6 Чым тлумачыцца сцэнічны поспех камедыі “Лявоніха на арбіце”? Хто яны, Лявон і Лявоніха? Хто быў прататыпам галоўнага героя? Аргументуйце адносіны драматурга да Лявона Чмыха. Ці зразумела аўтарскую канцэпцыю тагачасная крытыка? Якую ролю ў творы выконвае сюжэтная лінія Глуздакоў – Цесакоў – Мікалай Сяргеевіч? Чым актуальная праблематыка твора і сёння?

2.7 Зрабіце праблемна-вобразны аналіз камедыі “Таблетку пад язык”. Каго з персанажаў п’есы вы аднеслі б да каларытных вобразаў і чаму? Паразважайце, як суадносіцца з беларускай літаратурнай традыцыяй маналог дзеда Цыбулькі пра “ўладу зямлі”. Якую мастацкую функцыю ў раскрыцці аўтарскай задумы выконвае ўверцюра на пачатку твора? Акрэсліце жанравыя асаблівасці камедыі.

2.8 Падумайце, чаму А. Макаёнка-драматурга так вабіла “вясковая” тэма? Якія вобразы з яго твораў раскрываюць асаблівасці беларускага народнага характару?

2.9 У чым праяўляецца наватарства драматурга ў распрацоўцы тэмы Вялікай Айчыннай вайны ў трагікамедыі “Трыбунал”? Як крытыка ўспрыняла аўтарскае вызначэнне жанру твора? Для чаго А. Макаёнак выкарыстаў у творы стылістыку казкі, народнага лубка? Вызначце канфлікт твора і асаблівасці яго развіцця. Прасачыце, як пры дапамозе выяўленчага прынцыпу ўзаемаадлюстравання перадаюцца духоўна-псіхалагічныя асаблівасці характару Цярэшкі Калабка. Паразважайце, ці мелі права сямейнікі на такі суровы суд над мужам і бацькам. Якія мастацкія дэталі і для чаго выкарыстаў аўтар?

2.10 На якой падставе трагікамедыя “Зацюканы апостал” С. Лаўшуком названа п’есай-загадкай? Што мае на ўвазе даследчык, калі гаворыць пра сінтэтычны жанр твора? Якая з пастаўленых у “Зацюканым апостале” праблем з’яўляецца дамінантнай і чаму? Якую вострую праблему сучаснага жыцця прадказаў А. Макаёнак напрыканцы 60-х у п’есе “Зацюканы апостал”? Ахарактарызуйце вобраз Сына і вызначце яго ролю ў развіцці канфлікту. Якія інтэрпрытацыі мае гэты вобраз у крытыцы? Меркаванне каго з даследчыкаў і чаму вам імпануе больш? Як вы разумееце сэнс назвы твора? Якія камедыяграфічныя прыёмы стварэння персанажаў выкарыстаны аўтарам?

2.11 Для самастойнага чытання ў школе на выбар настаўніка прапануюцца трагікамедыі “Зацюканы апостал” і “Трыбунал”. Якую з п’ес і чаму вы хацелі б абмеркаваць з дзесяцікласнікамі?

2.12 Па якой прычыне п’еса “З кірмашу” не трапіла ў свой час у друк і на сцэну? Як склаўся шлях да гледача трагікамедыі “Пагарэльцы”? Раскажыце пра асаблівасці кампазіцыі твора. Што трэба разумець пад ухватаўшчынай? Якія камедыяграфічныя прыёмы выкарыста А. Макаёнак для стварэння сатырычных вобразаў у “Пагарэльцах”? Паразважайце, што сімвалізуе ў п’есе землятрус і яго ахвяры.

2.13 Калі ў школе трэба будзе выбіраць для вывучэння “Пагарэльцы” ці “Зацюканы апостал”, якой з п’ес аддасце перавагу і чаму?

2.14 Якія глыбокія філасофскія высновы гучаць у трагікамедыі “Дыхайце эканомна”? Паразважайце, што хацеў сказаць А. Макаёнак шчаслівым фіналам у апошняй сваёй п’есе.

3 Падрыхтуйце паведамленне “А. Макаёнак як перакладчык і аўтар кінасцэнарыяў”.

4 Акрэсліце месца і ролю А. Макаёнка ў развіцці беларускай культуры.

**КРЫНІЦЫ:** Макаёнак, А. Выбраныя творы : у 2 т. / А. Макаёнак ; прадм. С. Лаўшука. – Мінск : Маст. літ., 1980.

Макаёнак, А. Збор твораў : у 5 т. / А. Макаёнак ; прадм. С. Лаўшука. – Мінск : Маст. літ., 1987–1990.

Макаёнак, А. Зацюканы апостал : П’есы / А. Макаёнак. – Мінск : Маст. літ., 2006. – 270 с.

**ЛІТАРАТУРА:** Беларускія пісьменнікі : Бібліягр. слоўн. : у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы ; рэдкал.: І. Багдановіч [і інш.]. – Мінск : “Беларус. энцыкл.”, 1992–1995. – Т. 4. : Лазарук – Перкін. – 1994. – С. 167–175.

Бугаёў, Д. Лёс драматурга // Д. Бугаёў. Спавядальнае слова : Літар. крытыка, успаміны. – Мінск, 2001. – С. 281–322.

Лаўшук, С. Андрэй Макаёнак / С. Лаўшук // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2-е выд. Мінск : Беларус. навука, 2001–2002. – Т. 4. Кн. 1. – 2002 – С. 237–269.

Усікаў, Я. Андрэй Макаёнак : Нарыс жыцця і творчасці / Я. Усікаў. – Мінск : Нар. асвета, 1984. – 136 с.

**ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА:** Вишневская, И. Комедия на орбите : Очерк творчества / И. Вишневская. – Москва : Сов. писатель, 1979. – 238 с.

Ерохин, Р. В страхе комедии не пишутся / Р. Ерохин // Советская Белоруссия. – 2000. – 16. дек. – С. 23.

Колас, Г. Аўтографы Андрэя Макаёнка / Г. Колас. – Мінск : Маст. літ., 1992. – 285 с.

Лавшук, С. Потому что родился в четверг / С. Лавшук // Нёман. – 2003. – № 12. – С. 172–183.

Лявоненка, С. Месца і роля Андрэя Макаёнка ў драматургіі. X кл. / С. Лявоненка // Роднае слова. – 2006. – № 10. – С. 52–53.

Макаёнак, Л. Працавала ад ранку і да позняй ночы : Нататкі пра маці Андрэя Макаёнка, яго сваякоў і родзічаў / Л. Макаёнак // Роднае слова. – 2006. – № 10. – С. 89–90.

Нячай, Б. Андрэй Макаёнак : Кантакты з экранам / Б. Нячай // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1990. – № 11. – С. 62–65.

Смольскі, Р. Патрыятызм – каштоўнасць вечная / Р. Смольскі // Тэатр у прасторы часу / Р. Смольскі. – Мінск, 1998. – С. 134–142. (З гісторыі творчай садружнасці А. Макаёнка з купалаўскім тэатрам).

Смыкоўская, В. Вывучэнне п’есы “Зацюканы апостал” А. Макаёнка. X кл. / В. Смыкоўская // Роднае слова. – 2006. – № 10. – С.47–52.

Сохар, Ю. На пульсе жыцця : Андрэй Макаёнак і беларускі тэатр / Ю. Сохар. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 160 с.

Шамякін, І. Аповесць пра сябра / І. Шамякін // Карэнні і галіны : Партрэты настаўнікаў, сяброў, бацькоў, сваякоў, штрыхі аўтапартрэта / І. Шамякін. – Мінск, 1986. – С. 183–268.

# САМАСТОЙНАЯ ПРАЦА СТУДЭНТАЎ – 2 г.

Для самастойнай працы студэнтам IV курса прапануецца напісанне рэцэнзіі на адзін з апошніх твораў або на зборнік твораў пісьменнікаў, чыя творчасць вывучаецца на працягу года.

Выпрацоўка ўмення выканання такога віду творчай працы з’яўляецца задачай школьнага курсу, таму нагадаем некаторыя аспекты, якія неабходна ўлічыць, каб паспяхова выканаць заданне.

Рэцэнзія – ад лац. Recensio – разгляд, даследаванне; адзін з вядучых жанраў літаратурнай, мастацкай і навуковай крытыкі. Літаратурная рэцэнзія пішацца на новы буйны твор, на новы зборнік твораў, радзей – на невялікі твор (верш, апавяданне). Мэта рэцэнзіі – зрабіць змястоўны аналіз твора, даць яму аб’ектыўную ацэнку. Разважанні,назіранні і вывады рэцэнзента па праблемах твора павінны быць слушнымі, пераканальнымі і доказнымі. Яны павінны абапірацца на літаратуразнаўчы аналіз твора ці твораў, якія складаюць зборнік. У рэцэнзіі можна спасылацца на выказванні іншых літаратурных крытыкаў, пісьменнікаў, параўноўваючы, развіваючы ці аспрэчваючы іх. Сваім аб’ектыўным аналізам мастацкага твора рэцэнзія адрозніваецца ад водзыву, у якім выказваюцца самастойныя, але больш суб’ектыўныя ацэнкі.

Рэцэнзія звычайна складаецца з уступу, дзе акрэсліваецца мэта даследавання; галоўнай часткі, у якой выказваюцца думкі і меркаванні па важнейшых праблемах твора, даецца ацэнка тых ці іншых яго кампанентаў (ідэйнага зместу, характараў дзеючых асоб, своеасаблівасці кампазіцыйнай пабудовы, адметнасці мовы і інш.); заключэння, дзе падсумоўваюцца важнейшыя высновы, якія вынікаюць з разважанняў рэцэнзента. Вядома, не кожная рэцэнзія пачынаецца з уступу. Яна можа пачынацца з галоўнай часткі, з аналізу мастацкага твора ці зборніка твораў.

Нарэшце, вы чыталі рэцэніі на творы пісьменнікаў пры падрыхтоўцы да практычных заняткаў, пераглядзіце іх.

## ПЫТАННІ ДА ЭКЗАМЕНА

1. Літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны (паэзія, проза, драматургія, публіцыстыка).
2. Літаратура першага пасляваеннага дзесяцігоддзя: набыткі і страты.
3. Літаратура перыяду дэмакратычнага абнаўлення грамадства (1956–1965 гады).
4. Станаўленне творчай індывідуальнасці П. Броўкі ў 30-я гады. Даваенныя паэмы “Прамова фактамі”, “Праз горы і стэп”, “1914”, “Кацярына”, іх тэматыка, рытміка-стылёвыя асаблівасці.

5. Узмужненне таленту П. Броўкі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Жанравая разнастайнасць паэмаў ваеннага часу “Паэма пра Смалячкова”, “Беларусь”, “Ясны кут”, “Паланянка”.
6. Паглыбленне гуманістычнага пафасу паэзіі П. Броўкі ў другой палове 50–60-я гады (кнігі “Пахне чабор”, “Далёка да дому”, “Між чырвоных рабін”, “Калі ласка” і інш.). Паэма-рэквіем “Голас сэрца”.
7. Духоўны свет лірычнага героя ранняй творчасці А. Куляшова (цыкл “Юнацкі свет”, паэмы “Баранаў Васіль”, “У зялёнай дуброве”, “Хлопцы апошняй вайны” і інш.).
8. Новы ўзровень пошукаў А. Куляшова ў творчасці перыяду Вялікай Айчыннай вайны (вершы, балады, паэмы і інш.).
9. Мастацкія пошукі А. Куляшова ў жанры паэмы. Праблематыка і жанравая адметнасць паэм “Цунамі”, “Далёка да акіяна”, “Варшаўскі шлях”, “Хамуціус”. Нізка вершаў “Маналог”.
10. Ідэйна-эстэтычны свет заходнебеларускай паэзіі М. Танка (зб. “На этапах”, “Журавінавы цвет”, “Пад мачтай”).
11. Пошукі і эстэтычныя адкрыцці М. Танка ў паэмах заходнебеларускага перыяду (“Нарач”, “Журавінавы цвет”, “Сказ пра Вяля”, “Кастусь Каліноўскі” і інш.).
12. Паэзія М. Танка перыяду Вялікай Айчыннай вайны (зб. “Праз вогнены небасхіл”, “Вастрыце зброю”, паэма “Янук Сяліба”).
13. Неадназначнасць творчых набыткаў М. Танка ў канцы 40–50-я гады (зб. “Каб ведалі”, “На камні, жалезе і золаце” і інш.). Сацыяльна-філасофская праблематыка паэмы “Люцыян Таполя”.
14. Паглыбленне гуманізму і філасафізму ў творчасці М. Танка другой паловы 50-х–80-я гады (зб. “След бліскавіцы”, “Мой хлеб надзённы”, “Дарога, закалыханая жытам”, “Прайсці праз вернасць”, “За маім сталом” і інш.). Паэма “Мікалай Дворнікаў”.
15. Нястомнасць эстэтычных пошукаў М. Танка ў творчасці другой паловы 80–90-я гады (зб. “Збор калосся”, “Мой каўчэг”, “Errata”). Танкаўскі верлібр.
16. Ранняя лірыка П. Панчанкі (зб. “Упэўненасць”, “Вераснёвыя сцягі”).
17. Удзел П. Панчанкі ў Вялікай Айчыннай вайне (зб. “Дарога вайны”, “Далёкія станцыі”). Адметнасць вершаванага цыклу “Іранскі дзённік”.
18. Гуманістычны змест паэзіі П. Панчанкі ў другой палове 50-х–80-я гады (“Кніга вандраванняў і любові”, “Крык сойкі”, “Вячэрні цягнік”).

19. Заключны этап творчасці П. Панчанкі (з сярэдзіны 80-х–90-я гады). Тэматычна-праблемная навізна кніг “І вера, і вернасць, і вечнасць”, “Горкі жолуд”, “Высокі бераг”. Пасмяротна выдадзены зборнік паэзіі “Зямля ў мяне адна”.
20. Літаратурная спадчына Л. Геніюш. Кнігі паэзіі. “Споведзь” як сведчанне аб перажытым і аб часе.
21. Заходнебеларуская тэма як адна з вядучых у творчасці Я. Брыля (“Марыля”, “Праведнікі і зладзеі”, “Сірочы хлеб”, “У сям’і”, інш.).
22. Унёсак Я. Брыля ў распрацоўку ваеннай тэматыкі (“Memento mori”, “Адзін дзень”, “Маці”, “Птушкі і гнёзды” і інш.).
23. Праблемна-тэматычная разнастайнасць аповесцяў Я. Брыля (“Апошняя сустрэча”, “Ніжнія Байдуны”, “Золак, убачаны здалёк”, “Муштук і папка”).
24. Раман “Птушкі і гнёзды” Я. Брыля як альтэрнатыва канонам сацрэалізму. Ацэнка твора і яго жанравае вызначэнне ў крытыцы (У. Калеснік, Ю. Канэ, В. Нікіфарава, інш.).
25. Я. Брыль як майстар лірычнай мініяцюры (зб. “Жменя сонечных промняў”, “Вітраж”, “Свае старонкі”, “Пішу як жыву”, “З людзьмі і сам-насам”, інш.).
26. “Малая” проза І.Мележа (“Сустрэча”, “Ноччу”, “У завіруху”, “Спатканне за горадам”, “У гарах дажджы”, інш.).
27. Раман “Мінскі напрамак” у творчай біяграфіі І. Мележа і ў тагачаснай беларускай прозе.
28. “Палеская хроніка” – вяршыня творчага майстэрства І. Мележа. Праблемна-мастацкі аналіз твора. Сістэма вобразаў.
29. Пенталогія “Трывожнае шчасце” ў творчым лёсе І. Шамякіна.
30. Мнагапланавы раман ў творчасці І. Шамякіна 60–70 гадоў (“Сэрца на далоні”, “Атланты і карыятыды”, “Вазьму твой боль” і інш.).
31. Творчая актыўнасць І. Шамякіна ў другой палове 80–90-я гады (кнігі “Пошукі прытулку”, “Сатанінскі тур”, “Палеская мадонна”, інш.).
32. Трагедыі Чарнобыля і Афганістана ў асэнсаванні І. Шамякіна (“Злая зорка”, “Зона павышанай радыяцыі”).
33. Уклад А. Макаёнка ў жанравае ўзбагачэнне беларускай драматургіі (“Выбачайце, калі ласка”, “Лявоніха на арбіце”, “Каб людзі не журыліся”). Трагікамедыі “Зацюканы апостал”, “Трыбунал”, інш. Майстэрства драматурга.
34. Творчасць М. Матукоўскага (“Апошняя інстанцыя”, “Амністыя”, “Бездань” і інш.).